

МЫ З ІМАНАМ ЖЫВЁМ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСІ

МЫ З ІМАНАМ ЖЫВЁМ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСІ

МЫ З ІМАНАМ ЖЫВЁМ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСІ

Беларускі татарын Якуб Якубоўскі

Шаноўнаму Васілю Аляксеевічу
са шчырай удзячнасцю за
прыгажосць кветкі і верш
у вянок памяці Якуба
Якубоўскага.

18.08.2015 Ад укладальнікаў –
Таццяна
Якубоўская.

Менск.

Мінск
«Тэхналогія»
2015

УДК 929.52Якубоўскі(476)
ББК 63.3(4Бел)6–8
М 94

Укладальнікі:
Іван Драўніцкі, Таццяна Якубоўская

У афармленні вокладкі выкарыстаная
частка трытвора «Адвечнае святло Беларусі»
мастака *Алеся Цыркунова*, прысвечаная
беларускім татарам.

Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі : беларускі татарын Якуб
М94 Якубоўскі / уклад. : І. П. Драўніцкі, Т. В. Якубоўская. – Мінск : Тэхналогія, 2015. – 139 с. : іл.

ISBN 978-985-458-260-3.

Кніга прысвечана жыццёваму шляху і творчасці беларускага татарына Якуба Якубоўскага – географа, гісторыка, філолага, энцыклапедыста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, актыўнага ўдзельніка адраджэнскага руху беларускіх татараў у 1990-х гадах. У кнізе змешчаны нарысы і ўспаміны родных, сяброў і паплечнікаў, працы навукоўцаў, а таксама допісы самога Я. А. Якубоўскага.

Мае каштоўнасць для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй татарскай супольнасці на зямлі Беларусі, лёсам дзеячоў татарскай інтэлігенцыі і здабыткамі Адраджэння пры канцы XX стагоддзя.

УДК 929(476)
ББК 63.2(2)6–8

ISBN 978-985-458-260-3

© Драўніцкі, І. П., Якубоўская, Т. В., укладанне, 2015
© Афармленне. НВК "Тэхналогія", 2015

ЗМЕСТ

Падзяка 7

Прадмова 8

Мы з Паволжа і Крыма 11

Беларускія татары. Гістарычны лёс народа і культуры *(Ібрагім Канапацкі)* 11

Вёў лёс местачковымі сцежкамі *(Іван Драўніцкі)* 17

Дарога пачыналася ў Камаях 17

Лёсам звязаныя з Камаямі 20

Вытокі 21

На арэлях памяці 22

Школьныя гады 23

У савецкай школе 25

У Відзах 29

Праз шмат гадоў 31

Жыццяпіс 33

Радавод Якубоўскіх герба «Тапор» («Старжа») *(Аляксандр Лашкевіч, Іван Драўніцкі)* 33

Сям'я Якубоўскіх на раздарожжы XX стагоддзя *(Адам Якубоўскі)* 34

Браты *(Таццяна Якубоўская)* 38

Хто жадае, таму лёс спрыяе *(Таццяна Якубоўская)* 43

Нататкі Якуба Якубоўскага 55

Відзаўскай школе – 500 гадоў 55

Цюркізмы ў беларускай мове 58

Запавет старога татарына 61

Слова Вялікага князя Вітаўта перад татарамі ў 1397 годзе 62

Я так думаю 64

Дзень жальбы. Пра дэпартацыю крымскіх татараў *(Ісмаіл Мемеtаў, Якуб Якубоўскі)* 66

Гутаркі з Якубам Якубоўскім 69

Думкі інтэлігента *(Якуб Якубоўскі, Яўген Гучок)* 69

«Лічаць нас братамі сваімі» *(Ірына Крэнь, Якуб Якубоўскі)* 72

«Пакінуць след у памяці нашчадкаў...» *(Разалія Александровіч, Таццяна Якубоўская)* 78

Успаміны сяброў і паплечнікаў 85
Першапраходзец *(Ісмаіл Александровіч)* 85
Душа татарскай супольнасці *(Ібрагім Канапацкі)* 85
Ён працаваў самааддана *(Мустафа Канапацкі)* 86
Стваральнік гімна беларускіх татараў *(Іван Драўніцкі)* 87
Як святло і як сусвет *(Разалія Александровіч)* 88
Дарагі чалавек *(Юрась Качкоў)* 92
Я сябраваў з ім сорак гадоў *(Ігар Афнагель)* 94
Беларускі татарын Якуб Якубоўскі *(Яўген Гучок)* 96
Служыць ісціне дзеля ісціны *(Вячаслаў Вайткевіч)* 97
«Праца – гэта ёсць задавальненне» *(Міхась Маліноўскі)* 102
Вечарына з нагоды 80-годдзя Якуба Якубоўскага *(Таццяна Якубоўская)* 104
Два знакавыя творы *(Алесь Цыркуноў)* 105
Даследнік возера Нарач (*Іван Драўніцкі, Таццяна Якубоўская)* . . . 108
Прысвячэнні 111
Рыгор Барадулін 111
Васіль Жуковіч 114
Замест заканчэння 115
Дзейнасць Якуба Якубоўскага ў люстэрку нацыянальна-культурнага адраджэння татараў Беларусі *(Леанід Лыч)* 115
Дадатак 125
У вянок памяці Якуба Якубоўскага (*Іван Драўніцкі)* 125
Эпілог 131
Звесткі пра аўтараў 133
Выкарыстаныя крыніцы 138

ПАДЗЯКА

Мы вельмі ўдзячныя зычлівым і самаахвярным людзям, якія дапамаглі ў выданні кнігі сваёй працай і добрай парадай – спадарам Леаніду Лычу, Алесю Цыркунову, Яўгену Гучку. За тэхнічную дапамогу ў падрыхтоўцы рукапісу да друку шчыра ўдзячны Галіне Драўніцкай і Разаліі Александровіч, а таксама Яўгену Лецку, які зрабіў папярэдняе рэдагаванне рукапісу. Вялікую падзяку за фінансавую падтрымку выдання выказваем сябрам і паплечнікам Якуба Якубоўскага – Ігару Афнагелю, Софіі Курач, Анатолю Лепешаву, Разаліі Александровіч, Юрыю Качкову, а таксама вучням Таццяны Якубоўскай з г. Капейска (на Урале), ад якіх яна з'ехала ў 1965 годзе, каб выйсці замуж за Якуба Адамавіча, і якія да гэтага часу наведваюць і падтрымліваюць яе.

Сардэчна ўдзячны сынам Яніны Пашкоўскай Багдану і Генрыку за звесткі аб лёсе іх сям'і і фотаздымкі з сямейнага архіва.

Без дапамогі гэтых шчырых людзей кніга не пабачыла б свет, не была б годна ўшанавана памяць аднаго з генератараў татарскага і беларускага адраджэнскага руху, Якуба Якубоўскага. Хай Усемагутны Вялікі Аллаг аддзячыць усім за гэтую дабрачыннасць!

Іван Драўніцкі, Таццяна Якубоўская

ПРАДМОВА

Жыццё чалавека – адно з шматлікіх звёнаў у доўгім ланцужку пакаленняў, імгненне ў развіцці народа. Але прагрэс якраз і вынікае з дзейнасці і досведу асобных людзей, творчасць якіх рухае цывілізацыйны працэс. Паводле трапнага выказвання беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча, «гістарычны вопыт – гэта адна з тых неабходных для народа ношаў, з якой ён бярэ патрэбныя для поступу наперад жыццёвыя рэсурсы». Без апісання дзейнасці канкрэтных людзей гісторыя чалавецтва стала б фармальнай, безаблічнай.

Было б неабачліва і несправядліва не пакінуць пра Якуба Якубоўскага ўспамінаў, не ўзяць яго навуковы досвед. Ягоны жыццяпіс павінны застацца ў гісторыі як прыклад сумленнасці, працавітасці, сціпласці. Ён ніколі не выхваляўся зробленым, не вылузваўся з скуры, каб давесці, што ўсё, што ён робіць, пра што піша, вельмі важнае для беларусаў і татараў, хоць яно было сапраўды вельмі важным. Не быў кар'ерыстам, не імкнуўся хуценька ўзбегчы на грэбень славы. Тым не менш усе яго ведалі як таленавітага, глыбока дасведчанага энцыклапедыста. У ім арганічна спалучалася душа навукоўца і практыцызм местачкоўца – энергічнага прафесійнага арганізатара ў абраным абсягу дзейнасці.

Якуб Якубоўскі ніколі не хаваў, што належыць да татарскага этнасу, які з'явіўся на зямлі Беларусі ў канцы XIV стагоддзя. Наадварот, ганарыўся гэтым. Ягоныя продкі не толькі неслі вайсковую службу, але займаліся рамёствамі, гародніцтвам, рамізніцтвам. Ужо на пачатку XVI стагоддзя яны перайшлі на беларускую мову, толькі малітвы засталіся на арабскай. Вельмі цікавыя рукапісныя кнігі «Аль-Кітабы» («Ай-Кітабы»), напісаныя арабскім пісьмом на чысцюткай беларускай гутарковай мове. Гэтыя кнігі надзвычай каштоў-

ныя для навукі, яны – унікальныя помнікі старадаўняй беларускай мовы, бо арабскае пісьмо выдатна перадае асаблівасці гучання беларускіх слоў.

За шэсць стагоддзяў, якія татары жывуць на гэтай зямлі, яны вельмі шмат перанялі ад беларусаў і самі зрабілі на іх пэўны ўплыў: перадалі свае навыкі ў конегадоўлі, гародніцтве, гарбарстве. Нямала слоў татарскага паходжання ўжываецца ў беларускай мове. Беларускіх татараў у сваіх радаводах мелі знакамітыя пісьменнікі – Генрык Сянкевіч, Францішак Багушэвіч, Адам Гурыновіч ды некаторыя іншыя.

Аднаго разу, пасля перапісу насельніцтва Беларусі 1989 года хтосьці з знаёмых спадара Якуба паблажліва заўважыў: «Ну колькі вас, татараў, – нейкая жменька». А ў адказ пачуў: «Нас з беларусамі дзесяць мільёнаў!» Быццам жарт, але яго часта паўтараюць беларускія татары, ён стаў папулярным на форумах у сусветным павуцінні. Бо ў гэтым афарызме глыбокі сэнс – у ім наша еднасць, наша сіла, наша вера ў тое, што мы не прападзём, бо мы разам. Нам здаецца, што гэтае выказванне Якуба Якубоўскага адлюстроўвае 600-гадовую повязь беларускага і татарскага народаў на землях нашай Бацькаўшчыны, узаемаўзбагачэнне нашых культур, супольную гісторыю. Татары ў Беларусі да гэтага часу жывуць на землях, дзе пасяліў іх продкаў-ваяроў Вітаўт Вялікі. Месцы найбольш кампактнага рассялення татараў і іх адноўленыя мячэці акрэсліваюць асяродкавыя землі летапіснай Літвы – гэта Наваградскі, Івейскі, Лідскі, Клецкі, Нясвіжскі і суседнія раёны. Пакліканыя Вітаўтам, яны быццам да гэтага часу ахоўваюць сэрца Вялікага Княства Літоўскага. Сярод беларускіх татараў шмат выдатных асобаў, што праславілі нашу зямлю. Да іх ліку належыць і Якуб Адамавіч Якубоўскі, географ, гісторык, філолаг, энцыклапедыст нашага часу, стваральнік першага беларускамоўнага часопіса татараў-мусульманаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Яго імя занесена ў кнігу гонару клуба «Спадчына» «Рупліўцы твае, Беларусь».

Загалоўкам кнігі мы абралі першы радок гімна татараў Беларусі «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі», словы якога напісаў Якуб Якубоўскі, а варыянты музыкі стварылі татарскія кампазітары – Алег Гембіцкі разам з Якавам Канапацкім

і 12-гадовая Дзінара Мазітава. Менавіта Іман – святая вера татараў-мусульманаў – дапамагла ім захаваць сваю адметнасць і не рашчыніцца ў тытульнай нацыі. І яшчэ – упэўненасць у тым, што татары, хоць іх няшмат, разам з 10-мільённым народам Беларусі нечага вартыя ў свеце. Гэтыя словы прыводзіць знакаміты беларускі літаратуразнавец з Масквы Аляксей Каўка ў нататцы «Высь мінарэта», прысвечанай памяці Якуба Якубоўскага, дзе зазначыў, што гэтае «нечага вартыя» бліскуча рэалізавана ў лёсе і творчасці многіх знакамітых татараў з Беларусі.

Кніга ўтрымлівае нарысы пра родныя мясціны, дзяцінства, сям'ю Якуба Якубоўскага, яго асабістыя артыкулы, нататкі і інтэрв'ю. У кнізе змешчаны таксама ўспаміны людзей, з кім спадар Якуб разам працаваў, змагаўся за беларускую і татарскую справы, што дазваляе больш глыбока зразумець Асобу гэтага чалавека.

Укладальнікі

МЫ З ПАВОЛЖА І КРЫМА

БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ. ГІСТАРЫЧНЫ ЛЁС НАРОДА І КУЛЬТУРЫ

Ібрагім Канапацкі

Шэсць стагоддзяў жывуць на беларускай зямлі татары, якія рознымі шляхамі прыйшлі сюды з стэпаў Паволжа і Крыма. Тут іхняя радзіма, гэтую зямлю іхнія продкі разам з беларусамі, палякамі і летувісамі баранілі ад ворагаў. Нашчадкі ардынцаў носяць імёны татараў-мусульманаў, хаця чатырыста гадоў таму перайшлі на беларускую і польскую мовы. Сёння іх адрознівае ад астатніх мясцовых жыхароў перадусім рэлігія. Іслам, зберажоны татарамі ў хрысціянскім асяроддзі, захоўваў іх у супольнасці і вылучаў сярод іншых народаў гэтай зямлі.

Літоўскія (або беларускія) татары склаліся як народнасць у XIV–XVI стагоддзях у перыяд існавання Залатой Арды і пасля яе распаду, калі адбывалася фармаванне асобных цюрцкамоўных народнасцяў пад агульнай назвай – татары. Асаблівасць фармавання літоўскіх (беларускіх) татараў у тым, што тэрыторыю, дзе гістарычна сканцэнтравалася гэта народнасць, займае не толькі сучасная Беларусь, але і Летува (Жамойць). Гісторыкі і этнографы называюць гэту народнасць літоўскія, або заходнія, татары. Яны мовай і побытам вельмі блізкія да славян, але пры гэтым разумеюць сваю адметнасць. Нават тыя спаміж іх, што прынялі хрысціянскую веру і ўжо даўно перажаніліся з хрысціянкамі, памятаюць пра сваё татарскае паходжанне, прыязна ставяцца да сваіх суродзічаў, бяруць удзел у іхніх культурна-асветных справах.

З'яўленне татараў на беларускай зямлі стала вынікам разнастайных зносін Вялікага Княства Літоўскага з Залатой Ардой. У 1321 годзе Гедзімін з дапамогаю татарскага войска здабыў вялікую перамогу над крыжакамі. Магутная дзяржава Гедзімінавічаў не скарылася Залатой Ардзе і не плаціла даніну татарам. Задоўга да Кулікоўскай бітвы (1380), калі князі Уладзіміра-Суздальскай Русі былі вернымі васаламі

і слугамі Чынгізідаў, Вялікае Княства Літоўскае кінула смелы выклік Ардзе. Менавіта Вільня на доўгія дзесяцігоддзі стала асноўным цэнтрам аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў. Разгром Альгердам трох ордаў, што панавалі ў Паўночным Прычарнамор'і, у бітве на Сініх Водах (восень 1362 г.) дазволіў пашырыць уладанні княства на поўдні да вусця Дняпра і Дністра, усталяваць уладу Гедзімінавічаў над Кіеўскім і Валынскім княствамі, Падоліяй, Чарнігаўшчынай і Севершчынай. Альгерд за два дзесяцігоддзі да Кулікоўскай бітвы ўчыніў пераломную паразу Залатой Ардзе. Арда страціла кантроль над значнымі тэрыторыямі. Але няправільна было б уяўляць стасункі Вялікага Княства Літоўскага з Ардою як толькі бясконцы перыяд супрацьстаяння. Не, ім здаралася нават ствараць альянсы супроць агульных супернікаў. Апошняму спрыяў і той факт, што ў самой Ардзе змагаліся за ўладу розныя групоўкі, і звычайна князі маглі разлічваць на хаўрус з тым або іншым прэтэндэнтам на трон у Сараі. На мяжы XIV і XV стагоддзяў Залатую Арду саслаблялі шматлікія дынастычныя сваркі. Гэта сталася адной з прычын з'яўлення значнай колькасці татарскіх перасяленцаў у Беларусі.

Татары з Крыму перасяліліся ў Вялікае Княства Літоўскае таму, што Тахтамыша, які прыйшоў да Вітаўта ў 1398 годзе, яны ўсё яшчэ лічылі ханам Залатой Арды, Чынгізідам. Вось за ім – за сваім законным уладаром – і пайшлі татары з сем'ямі і маёмасцю ў новыя месцы, дзе ім абяцалі зямлю і свабоднае вызнанне мусульманскай веры. Паводле татарскай традыцыі, літоўскія (беларускія) татары самі сябе ніколі не лічылі палоннымі Вітаўта, таму і ахвотна служылі свайму беламу хану, якога называлі Ваттадам – сваім апірышчам. Такім чынам, пачатак татарскай супольнасці на Беларусі паклалі добраахвотныя пасяленцы. Пасля, да пачатку XVI стагоддзя, татарская «дыяспара» папаўнялася пераважна за кошт эмігрантаў з Арды.

Палітыку Вітаўта, мэтай якога было ўмацаванне межаў Вялікага Княства Літоўскага шляхам набыцця хаўруснікаў, у тым ліку і з Залатой Арды (перш за ўсё дзеля барацьбы з маскоўскімі князямі), працягвалі ягоныя наступнікі. Нягледзячы на шэраг замірэнняў з княствам, крымскія татары ўчыняюць напады на яго землі. Найбольш разбуральнымі былі татарскія набегі ў 1508, 1510, 1521 і 1527 гадах. Крымскім ханам захоўваць мір з Літвой і Польшчай было няпроста. Па-першае, асобныя орды не падпарадкоўваліся цэнтральнай уладзе і з уласнай ініцыятывы нападалі на Вялікае Княства Літоўскае і Польшчу. Па-другое, часта гэтыя паходы былі адказам на падоб-

ныя набегі запарожцаў, што лічыліся пад уладай польскага караля. Запарожцы, як вядома, часам даходзілі да сталіцы Атаманскай імперыі – Стамбула, што давала падставы для бязупынных канфліктаў Польшчы і Літвы, з аднаго боку, Турцыі і Крыму – з другога. Татараў, якія траплялі ў палон, сялілі, згодна з звычаем, ў гарадах і мястэчках Беларусі.

Рассяленню татараў на землях Беларусі і Летувы спрыялі Казімір Ягелончык, Аляксандр і Жыгімонт Стары. Узаемадачыненні беларускіх татараў і беларусаў амаль заўсёды былі мірнымі. Татары нагэтулькі зжыліся з мясцовым насельніцтвам, што часта нават выступалі супраць сваіх аднаверцаў – крымскіх татараў і нагайцаў, якія ў час рабаўнічых нападаў дасягалі беларускіх вёсак і гарадоў. У пазнейшыя часы разам з беларускімі, польскімі і летувіскімі патрыётамі татары змагаліся за вызваленне Рэчы Паспалітай ад захопнікаў.

Татарскія пасяленцы ў Беларусі доўгі час захоўвалі свае традыцыі, сацыяльна-плямённавую арганізацыю, абрады і мусульманскую веру, якой трымаюцца і цяпер. Паводле сацыяльна-прававога становішча большую частку беларускіх татараў адносілі да служылага люду – шляхты, якая не плаціла пагалоўнага падатку, а з дзяржавай разлічвалася крывёю – неадкладна станавілася пад баявыя штандары вялікага князя і караля. Гэта было пацверджана дзвюма «прывілеямі» Сцяпана Батуры (1576) і прывілеямі Жыгімонта Вазы (1608), Уладзіслава Вазы (1634) ды іншымі.

Гербы і геральдычныя знакі XVI–XIX стагоддзяў сведчаць, што ў Беларусі было больш за 50 вядомых татарскіх родаў. Аселая татарская арыстакратыя ператварылася ў магнатаў – уладальнікаў маёнткаў, фальваркаў і невялікіх вёсак. Большасць пасяленцаў, аднак, былі звычайнымі земляробамі. Местачковыя і гарадскія татары займаліся вазніцтвам, гародніцтвам, кушнерствам, гарбарствам, кравецкай справай, выраблялі посуд. Яны засялялі звычайна ўскраіны і прадмесці.

Перад Першай сусветнай вайной (1914–1918) на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю Расіі жыло каля 14 тысяч татараў-мусульманаў. У Польшчы ў міжваенны перыяд (1918–1939) вялася вялікая праца па адраджэнні культуры татарскага народу. Было створана Мусульманскае рэлігійнае задзіночанне (1925), Культурна-асветнае задзіночанне татараў Польшчы (1926). Выдаваліся «Татарскі штогоднік», часопісы «Татарскае жыццё», «Ісламскі агляд», мусульманскія календары, падручнікі для татарскіх дзяцей, асобныя суры (раздзе-

лы) з Кур'ана на арабскай і польскай мовах. Вялікай падзеяй у жыцці татараў стаў выхад у свет «Гербоўніка татарскіх сем'яў у Польшчы», складзенага ў 1929 годзе Станіславам Дзедулевічам. У месцах кампактнага пражывання татараў-мусульманаў татарскія дзеці вывучалі іслам у агульнаадукацыйных школах. Нацыянальна-культурнае адраджэнне татараў у Польшчы падтрымлівалі дзяржаўныя і навуковыя ўстановы гэтай краіны. Штогод на патрэбы татараў-мусульманаў польская дзяржава выдаткоўвала каля 57 тыс. злотых. Адраджэнне мусульманскай веры і татарскай культуры ў Польшчы было перапынена Другой сусветнай вайной. Шмат татараў загінула на франтах, а пасля заканчэння вайны ў 1945 годзе многія з іх трапілі ў савецкія канцлагеры.

Татарам, якія жылі ў міжваенны час у БССР, забаранялі перапісвацца з сваякамі ў Польшчы ці Летуве. Пераследаваліся імамы (мулы), настаўнікі мусульманскай рэлігіі (годжыя), усе, хто збярог свяшчэнныя кнігі – Кур'аны, «Хамаілы», «Аль-Кітабы». Дзеці вернікаў, асабліва імамаў, не маглі займаць хоць якую значную пасаду, нават калі выдатна вучыліся і мелі добрую адукацыю. Расейскамоўнае насельніцтва падазрона глядзела на татараў, якія на людзях размаўлялі па-беларуску. Многія татары-мусульмане, каб не трапіць у Сібір, самі пакінулі родныя мясціны – як былыя грамадзяне Польшчы яны атрымалі магчымасць выехаць на захад. Мусульманская культура татараў Беларусі, Летувы і Польшчы, збераганая цягам стагоддзяў, за гады савецкай улады прыйшла ў заняпад. Закрываліся, руйнаваліся мячэці, забываліся традыцыі. З дзевятнаццаці мячэцяў, якія былі на тэрыторыі Беларусі перад Другой сусветнай вайной, дзейнай засталася толькі адна – у Іўі Гарадзенскай вобласці. Апошняй, ужо ў 1960-х гадах, была зруйнавана менская мячэць – адзіная мураваная мячэць на Беларусі, што стаяла на Татарскім канцы горада на месцы колішняй драўлянай (XVI ст.). Прыкладна гэтым жа часам быў знішчаны мізар (татарскі могільнік). Зніклі і вуліцы Малая татарская і Вялікая татарская – іх перайменавалі ў Дзмітрава і Паркавую магістраль.

Панаванне таталітарнага рэжыму ў СССР прывяло да заняпаду татарскай меншасці Беларусі, паставіла яе на мяжу знікнення. За пасляваенныя гады рэзка скараціласа татарскае насельніцтва ў месцах ранейшага кампактнага пражывання. Калі, напрыклад, у Відзах Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці ў 1938 годзе жыло 760 татараў, то сёння іх налічваецца менш за 50 чалавек. У вёсцы

Даўбучкі Смаргонскага раёна жыло 408 чалавек. Цяпер там застаўся толькі адзін татарын. Даўбуцкая мячэць, збудаваная яшчэ ў 1558 годзе (адна з самых старажытных драўляных мячэцяў ва Усходняй Еўропе), разбурылася. У 1991 годзе рэшткі мячэці былі перавезены пад Менск у Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (Строчыцы). Урбанізацыя насельніцтва ў Беларусі прывяла да рэзкага скарачэння татарскай сям'і. Назіраецца агульная тэндэнцыя зніжэння натуральнага прыросту, выкліканая, з аднаго боку, паніжэннем нараджальнасці, з другога – высокай смяротнасцю сярод беларускіх татараў. Усё гэта вынік палітыкі кіраўнікоў савецкай дзяржавы, якая мусіла прывесці да ўтварэння адзінай супольнасці – «савецкага народа».

Але час мяняецца. Беларусь сцвярджае сваю дзяржаўнасць. Прыняты шэраг законаў, у тым ліку і аб нацыянальных меншасцях, аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях, якія ўтварылі прававую аснову нацыянальна-культурнага адраджэння беларускіх татар. У 1989 годзе ў Менску і Горадні ўзніклі першыя гарадскія татарскія грамадска-культурныя суполкі, якія ўлетку 1991-га ўтварылі Беларускае згуртаванне татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб». У 1994 годзе было створана Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне. Менавіта гэтыя арганізацыі пачалі каардынаваць і накіроўваць дзейнасць наноўстворaных татарска-мусульманскіх супольняў Беларусі (Менск, Горадня, Наваградак, Іўе, Ліда, Смілавічы, Мір, Відзы, Ашмяны, Глыбокае, Мядзел).

У 1991 годзе высілкамі актывістаў згуртавання «Аль-Кітаб» і дзякуючы дапамозе студэнтаў з мусульманскіх краін, што навучаюцца ў беларускіх ВНУ, створаны і дзейнічаюць нядзельныя школы ў некаторых гарадах і пасёлках рэспублікі. Упершыню на беларускай мове пачало выходзіць перыядычнае выданне беларускіх татараў – часопіс-квартальнік «Байрам» (выйшла 28 нумароў). Ад 1994 да 1996 года выходзіў штомесячны мусульманскі часопіс пад рознымі назвамі – «Аль-Джихад», «Аль-Ислам», «Рамазан», «Жизнь».

З 1997 года пачалося выданне штомесячнай газеты «Жизнь». Пад кіраўніцтвам былога галоўнага рэдактара квартальніка «Байрам» Якуба Якубоўскага была распачата праца над унікальным выданнем – энцыклапедычным даведнікам «Татары Беларусі, Летувы і Польшчы». Рукапіс (каля трох тысяч артыкулаў) плануецца падрыхтаваць на сямі мовах народаў свету. На сённяшні дзень падрыхтавана больш за 500 артыкулаў. У 1993–1998 гадах у Менску адбыліся

чатыры міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя праблемам вывучэння і захавання багатай спадчыны татарскага народу ў Беларусі. У іх узялі ўдзел больш за 150 навукоўцаў з розных краін свету. Адной з найважнейшых задач у дзейнасці мусульманскіх аб'яднанняў у рэспубліцы застаецца велізарная праца па аднаўленні і будаўніцтве мусульманскіх мячэцяў, культурных цэнтраў, школ, музеяў, бібліятэк і іншых устаноў. Дзякуючы дапамозе мусульманаў з арабскіх краін пабудавана новая мячэць у Смілавічах. У ліпені 1994 года была рэканструявана мячэць у Слоніме Гродзенскай вобласці коштам фундатараў з арабскіх краін і Турцыі. 29 траўня 1999 года адчыніліся дзверы мячэці ў Відзах Віцебскай вобласці. Застаецца неразвязанай праблема – будаўніцтва новай мячэці і культурнага цэнтра ў Менску, фундатарам якіх выступіла вядомая ў свеце дабрачынная арганізацыя з Саудаўскай Аравіі – «Rabbita».

Беларускія татары жывуць у міры і згодзе з усімі грамадзянамі краіны. У сваіх малітвах яны просяць ва Усявышняга Аллага літасці і міласэрнасці да зямлі, якая стала ім Радзімай, да людзей, якіх татары лічаць братамі сваімі.

ВЁЎ ЛЁС МЕСТАЧКОВЫМІ СЦЕЖКАМІ

Іван Драўніцкі

ДАРОГА ПАЧЫНАЛАСЯ Ў КАМАЯХ

У Камаях ў 1932 годзе нарадзіўся гісторык, географ, філолаг, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, складальнік энцыклапедый, ініцыятар стварэння і галоўны рэдактар часопіса татараў-мусульманаў «Байрам. Татары на зямлі Беларусі», аўтар гімна беларускіх татараў Якуб Адамавіч Якубоўскі, пра якога пойдзе размова ў гэтай кнізе.

З гісторыі мястэчка Камаі. Мястэчка Камаі ўзнікла на высокім узгорку на беразе Малога Камайскага возера ў першым тысячагоддзі нашай эры. Першымі насельнікамі паселішча былі прадстаўнікі фіна-вугорскіх плямёнаў, якія і пакінулі пасля сябе назву вёскі. Магчыма, назва Камаі выводзіцца з фінскага слова kamai – «хлуд, бураломе». Версія мае матэрыяльнае падцвярджэнне: у даваенны час на дне рэчышча Камайкі знаходзілі 12-мятровыя ствалы моранага дуба-тапельца, якія маглі быць зваленыя пад час нейкага стыхійнага бедства. Найбольш верагоднай падаецца другая версія, якая гаворыць, што назва мае повязь з засяленнем гэтай мясцовасці, якое ішло па рэках з нізоўяў у вярхоўі, то назва з коранем «кам» першапачаткова адносілася да ракі. Фіна-вугорскія мовы даюць зразумелае тлумачэнне: «кам» – «рака», «плынь».

Упершыню Камаі згадваюцца ў пачатку XVI стагоддзя як маёнтак князя Глеба Юр'евіча Пронскага, потым яго жонкі, а ў 1533-м сыноў Андрэя і Фрыдрыха Пронскіх. У 1550 годзе Камаі згадваюцца як мястэчка. Сын Фрыдрыха Аляксандр прадаў Камаі ў 1572 годзе Томашу Рудаміну-Дусяцкаму. Рудаміны-Дусяцкія валодалі мястэчкам да 1721 года. З 1722 года Камаі належалі Суліствоўскім. З 1795 года ўвайшлі ў склад Расейскай імперыі, у Віленскі павет.

Цікавае ў Камаях. Кожнаму, хто будзе ў Камаях, трэба ўбачыць касцёл з ядрамі шведскіх гармат, карціну «Збаўца з хлопчыкам» Альфрэда Ромера і каменны крыж.

Камайскі касцёл-крэпасць Яна Хрысціцеля быў пабудаваны ў 1603–1606 гадах з фундацыі Яна Рудаміны-Дусяцкага, які ахвяраваў на будоўлю шмат сваіх багацця. Храм з'яўляецца цікавым турыстычным аб'ектам, які размяшчаецца ў цэнтры вёскі на колішняй гандлёвай плошчы на высокім узгорку. Ён налічвае чатыры стагоддзі і не мае аналагаў, у яго архітэктуры сумяшчаюцца рысы готыкі, рэнесанса і барока. Сцены касцёла, таўшчыня якіх дасягае 2–2,5 метра, захоўваюць у сабе шведскія ядры часоў Паўночнай вайны. Расказваюць, што ад касцёла падземны ход вёў да азярца, праз яго ў выпадку асады можна было звязацца з наваколлем.

Будынак рэстаўравалі ў XVII стагоддзі, а таксама ў 1726–1736 гадах. У 1778 годзе да касцёла прыбудавалі шасціваконную капліцу з крыптай.

У храме чатыры разныя драўляныя алтары. У цэнтры аднаго з іх – алтарны абраз «Маці Божая з дзіцем» у сярэбраным чаканным абкладзе. Абраз быў напісаны прыкладна ў 1610 годзе ў Кракаве. Яго яшчэ называюць «Мадона смутку» або «Смутная мадона», «Маці Божая Чанстахоўская». Па інвентары XVIII стагоддзя абраз пазначаны як цудадзейны.

У касцёле меўся арнат, у цэнтральную частку якога быў ушыты фрагмент слуцкага пояса. Арнат у 1972 годзе забралі ў адзін з музеяў горада Менска. На хорах устаноўлены арган канца XVIII стагоддзя. У сутарэннях касцёла знаходзяцца шматлікія пахаванні з надпісамі на каменных плітах.

У касцёле злева ад алтара змешчаны абраз «Збаўца з хлопчыкам». Сенсацыя адбылася ў 2002 годзе, калі мастак Алесь Цыркуноў і святар Яцак Гутман высветлілі, што абраз намаляваў мастак Альфрэд Ромер з суседняга Каралінова.

Свой лёс бывае не толькі ў карцін, але і ў іхніх аўтараў. Пра мастака Альфрэда Ізыдора Ромера забыліся, ва ўсякім выпадку, на Пастаўшчыне. Забыліся надоўга і ўспомнілі толькі больш як праз стагоддзе. Згаданы вышэй твор – апошняя работа мастака, якую вернікі лічаць абразом.

Мастак-філосаф уклаў у гэты вобраз глыбокі сэнс, сцвердзіў свой светапогляд, сваё бачанне і разуменне гісторыі беларусаў. У постаці моцна пакрыўджанага хлопчыка паднявольнага краю мы бачым не рабскую пакорлівасць лёсу, а смутак, не разгубленасць, а годную шляхетнасць і веру ў будучыню. Гэта вобраз нашага беларускага народа, прасякнуты духам няскоранасці, трываласці і веры ў перамогу, у шчаслівую будучыню.

Недалёка ад касцёла стаіць каменны крыж вышынёй каля 2,5 метраў, шырынёй па гарызантальнай папярэчыне амаль 2 метра, вертыкальная частка крыжа мае чатырохгранную форму. Крыж з'яўляецца своеасаблівым сімвалам Камаяў. Высечаны ён у XV–XVI стагоддзях з вялікага валуна ружовага граніту, які быў прынесены сюды з Скандынавіі ў час апошняга зледзянення 20–17 тысяч гадоў таму.

Паходжанне і ўзрост крыжа не выяўлены. Мяркуецца, што тут стаяў паганскі каменны ідал – баба. Пасля 980 года сюды стала пранікаць хрысціянства, але людзі не забывалі і сваіх адвечных багоў. Быў час, калі на Камайшчыне лютавала хвароба, смерць касіла людзей. Малітвы і ахвяры не дапамагалі. Тады здарыўся цуд: хвораму старцу ў сне анёл сказаў, што хвароба адступіць у тым выпадку, калі гэту каменную бабу пераробяць на крыж і выб'юць на ім знакі – абярэгі ад хваробы. Калі параду анёла выканалі, хвароба адступілася. Сакральныя знакі захаваліся, але іх прачытаць не дадзена нікому. На крыжы высечана трохкутная ніша – сімвал еднасці Бога Бацькі, Сына і Святога Духа.

Існуе яшчэ адно паданне. Кажуць, што калісьці на месцы каменнага крыжа стаяў касцёл. У час аднаго з чарговых нашэсцяў ворагаў на гэту зямлю мясцовыя людзі схаваліся ў храме. Заваёўнікі ўзялі касцёл у аблогу і пачалі штурм. Мужна бараніліся жыхары, але сілы былі няроўныя. І калі ворагі ўжо былі гатовыя ўварвацца пад сутарэнні храма, абаронцы палі на калені і пачалі разам маліцца – прасіць у Бога паратунку. Раптам нетры разышліся і касцёл праваліўся пад зямлю. На паверхні застаўся толькі купальны крыж, які акамянеў і захаваўся да цяперашняга часу.

У апошнія гады ў касцёле ўстаноўлены памятныя пліты ў гонар паэта-святара Казіміра Сваяка, арганіста Браніслава Руткоўскага і мастака Альфрэда Ромера.

Па ініцыятыве ксяндза Яцака Гутмана і Юрася Гарбінскага ў Камаях адноўлены таксама даваенныя габрэйскія могілкі. На камяні-помніку выбіты словы з Талмуда: «Ведай, адкуль ты пайшоў і куды йдзеш...» Гэтыя словы – не толькі памяць аб памерлых, але і наказ для ўсіх нас.

ЛЁСАМ ЗВЯЗАНЫЯ З КАМАЯМІ

У мястэчку Камаі здаўна дружна супольна жылі і жывуць людзі розных нацыянальнасцей: беларусы, палякі, татары, расейцы, летувісы, габрэі, людзі розных канфесій: каталікі, праваслаўныя, мусульмане, юдэі, анабаптысты і інш.

З Камаямі звязана жыццё і дзейнасць паўстанцкага грамадскага начальніка Свянцянскага павета Апалінарыя Таньскага, які забяспечваў паўстанцаў 1863–1864 гадоў грашыма, нарыхтоўваў для іх у маёнтку амуніцыю і харчаванне, вербаваў людзей. Уладальнік маёнтка Сурвілішкі Густаў Чаховіч быў ваенным начальнікам гэтага ж павета. Тут меў прытулак кіраўнік паўстання Кастусь Каліноўскі.

Тут нарадзіўся і жыў разьбяр па дрэве Туйя Іцхак, які афармляў габрэйскія малітоўныя школы ў Камаях і Свіры, іншыя будынкі. Захаваліся аздобленыя ім дзверы свірскай асторыі.

У Камаях сваім коштам утрымлівала школу і бібліятэку-гарбацярню пісьменніца і журналістка графіня Гэлена Ромер-Ахэнкоўская, рабіў роспісы касцёла знакаміты мастак Альфрэд Ромер, гасцяваў духоўны бацька Я. Купалы Зыгмант Чаховіч, наведваў касцёл паўстанец Фларыян Даноўскі.

У 1915 годзе ў мясцовым касцёле пачынаў як вікарый сваю душпастырскую дзейнасць Казімір Сваяк (Канстанцін Стэповіч) – рэлігійны і культурна-асветніцкі дзяяч, адзін з ідэолагаў і пачынальнікаў беларускага хрысціянскага руху, паэт і публіцыст, які падрыхтаваў і выдаў зборнік вершаў «Мая ліра» і малітоўнік для беларусаў-каталікоў.

У 1898 годзе ў Камаях нарадзіўся і жыў да 14 гадоў вядомы музыкант і прапагандыст музыкі, арганіст-віртуоз, педагог, пачынальнік і арганізатар сусветных фестываляў арганнай музыкі Браніслаў Руткоўскі.

Камайская зямля з'яўляецца радзімай Юрася Гарбінскага, доктара філалогіі, даследчыка творчасці Алеся Гаруна, беларускага літаратуразнаўца і гісторыка.

У Камайскай школе вучыўся Анатоль Быхавец, доктар біялагічных навук, аўтар навуковых прац па ахове раслін ад шкоднікаў і хвароб; Рамуальд Грыгянец, кандыдат тэхнічных навук, аўтар шматлікіх навуковых публікацый і шэрагу навукова-тэхнічных праграм. Працавалі ў школе беларускі пісьменнік Алесь Рылько і беларускі краязнавец, педагог Іосіф Быхавец, які склаў і выдаў летапіс Лынтупаў і кнігу «Сеяць душы ў людзях», дзе аналізуе свой педагагічны вопыт; заслу-

жаная настаўніца Ніна Капіч і ўзнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга настаўніца Ганна Бароўка. У Камаях жыў і памёр 14 сакавіка 2015 года вядомы беларускі пісьменнік, аўтар тэкстаў шэрагу папулярных песень і выдатны настаўнік Аркадзь Нафрановіч. Скончыў сямігодку ў Камаях і аўтар гэтага нарысу Іван Пятровіч Драўніцкі – краязнавец, які піша пра мінулае тутэйшых мясцін.

ВЫТОКІ

Пасля Першай сусветнай вайны польскія ўлады, каб даць магчымасць падняцца спустошанаму вайной краю прыфрантавой зоны, прадавалі і нават проста раздавалі кінутыя гаспадарамі землі Камайшчыны, бясплатна выдзялялі лес на забудовы, адмянілі падаткі ў казну, давалі субсідыі на набыццё насення і жывёлы, выгадныя крэдыты для набыцця інвентару. У выніку гаспадарка ў мястэчку і вёсках стала інтэнсіўна развівацца. Вельмі рэнтабельнай была авечкагадоўля: з воўны выраблялі сукно, валёнкі, лямец, рукавіцы, шкарпэткі, швэдры, з скуры – кажухі і абутак. А мяса (бараніна) ішло сабе на ежу і карысталася попытам на рынку, асабліва ў габрэяў і татараў. У вёсцы Гвоздавічы кожны гаспадар меў не менеў як дзесяць авечак. Сталі вельмі запатрабаванымі скураных спраў майстры. У Камаях гэта былі патомныя гарбары татары Гембіцкія і Якубоўскія.

Хата Якубоўскіх была даволі новая, збудаваная пасля Першай сусветнай вайны. Стаяла яна на Лынтупскай вуліцы вокнамі да дарогі на самым беразе безыменнай рачулкі, што ўпадала ў Малое Камайскае возера. Будынак быў трохкамерны: пакой, сені і гарбарня, у якой стаялі высокія чаны, ляжалі пучкі лазовай, дубовай і яловай кары, пахла квасам. Перад хатай рассцілаўся ладны лужок, на якім стаяла студня з асверам.

Вось у гэтай хаце 20 красавіка 1932 года нарадзіўся Якуб Якубоўскі. Маці Раіса Хасенеўна была хатняй гаспадыняй, а бацька Адам Мустафавіч – дасведчаным у сваёй справе гарбаром, працавітым, паважаным і вельмі сумленным чалавекам.

Дом Якубоўскіх мне асабліва запомніўся, бо ён быў зручным прыпынкам, каб пераабуцца. Справа ў тым, што ўсе вясковыя людзі ўлетку хадзілі басанож, а калі ішлі ў мястэчка ці касцёл, то абуваліся. Не раз і я з бабуляй Луцэяй даходзілі басанож да хаты Якубоўскіх, заходзілі да гэтых зычлівых і гасцінных людзей, а потым тут у рэчцы апалосквалі ад пяску ногі, абуваліся і па брукаванцы ішлі ў мястэчка.

Мой бацька, калі намерваўся купіць на мясцовым кірмашы тавар на боты, то заязджаў да Адама Мустафавіча і прасіў дапамогі выбраць скуру, каб не папаўся брак. Таксама бацька кожную восень аддаваў яму выраблять аўчыны. Адам Мустафавіч, прымаючы на выраб скуры, браў палачкі (называў іх біркамі), наразаў на іх нейкія значкі, шчапаў папалам: адну палавінку прывязваў да аўчыны, другую аддаваў заказчыку – майму бацьку. Калі вяртаў выраблены футра, то хутка і беспамылкова з вялікага стоса аўчын выцягваў патрэбныя, што вельмі здзіўляла бацьку. Мой бацька быў пісьменны, але сакрэт маркіроўкі зразумець не мог. Верагодна, А. М. Якубоўскі ведаў і выкарыстоўваў арабскае пісьмо, невядомае тутэйшым людзям.

НА АРЭЛЯХ ПАМЯЦІ

У час імшы 24 снежня 1938 года святар Камайскага касцёла Андрэй Булька аб'явіў, што на Каляды (25 снежня) ў касцёле для дзяцей парафіі будзе праводзіцца «гвяздка» (зорачка), дзе Святы Мікалай пачастуе ўсіх дзяцей цукеркамі. Прапусціць такую салодкую нагоду было немагчыма. З усіх вёсак прывезлі бацькі дзяцей у мястэчка. Прывёз бацька і мяне. Каня паставілі ў Якубоўскіх. Са мной пайшоў да касцёла і Якуб. Хаця ён не быў каталіком, але ўмеў жагнацца, мовіць пацеры, калі трэба, кленчыць. Гэтыя веды ён набыў у польскай школе, дзе выкладалася рэлігія. Святы Мікалай яму таксама даў падарунак. Праз шмат гадоў, успамінаючы дзяцінства, Якуб Адамавіч прызнаўся:

– Моцна хваляваўся, калі ўбачыў Святога Мікалая: а раптам ён распазнае, што я не каталік? Во будзе!

Але жаданне атрымаць цукеркі, якімі яго бацькі не песцілі, узяло верх. Святы Мікалай быў памяркоўны: як і ўсім, даў і Якубу пакуначак цукерак.

Як потым выявілася, гэта быў не Святы Мікалай, а пераапрануты прафесар музыкі Браніслаў Руткоўскі, які прыехаў на Каляды з Кракава. Ён быў родам з Камаяў і адпусціў на мерапрыемства «гвяздкі» 250 злотых. Гэта на той час былі немалыя грошы, за іх можна было купіць дзве каровы ці паўгектара зямлі.

Жнівень 1939 года быў вельмі трывожны. Хаўрус Германіі і Савета ў – двух ворагаў Польшчы – нічога добрага не абяцаў. Пагаворвалі аб вайне. Тым не менш, жыццё цякло. Запомнілася яшчэ адна падзея: усім дашкольнікам трэба было зрабіць прышчэпку ад воспы.

Бацька адправіў мяне з бабуляй у Камаі. Па дарозе я забегся да Якуба распытаць пра воспу, як яе шчэпяць, бо ён быў ужо прышчэплены. Я спытаў:

– Ці страшна?

– Кот балючэй дзярэ, – адказаў Якуб, – але, гавораць, потым прыйдзецца паяёдаць.

Воспу шчапілі перад касцёлам на рынкавай плошчы. Там стаяла палатка з чырвоным крыжам і завіхаліся людзі ў белых халатах. Было шмат дзяцей, некаторыя баяліся, плакалі. Я, «праінструктаваны» сябрам, перанёс працэдуру мужна.

У гэтым жа месяцы адбылася яшчэ адна падзея: на клеці солтыса Віктара Юркайця з'явілася абвестка, што ў Камаях будуць паказваць дармавое кіно. Што гэта, ніхто не ведаў, але шмат хто зацікавіўся. Пайшлі ўвечары і мы з бацькам у Камаі. На рыначным пляцы было мнагалюдна, усе чакалі, што гэта будзе за кіно... Камайскія хлапчукі былі ўжо даўно тут. Якуб мне патлумачыў, што кіно – гэта малюнкі, якія рухаюцца. Кіно зрабіла на мяне вельмі вялікае ўражанне. Па палатне (экране) маршыравалі салдаты, рухаліся машыны, лісточкі на дрэвах гайдаліся, як насамрэч у лесе. Кіно было нямое, а змест яго пераказваў праз рупар адзін з кінамеханікаў. Рэакцыя людзей на кіно была розная. Казалі нават, што гэта людзям пусцілі чмут у вочы, што гэта звязана з нячыстай сілай і нічога добрага не абяцае.

ШКОЛЬНЫЯ ГАДЫ

У першы клас польскай паўшэхнай (пачатковай) школы Якуб пайшоў у шасцігадовым узросце. Вучыў у 1938 годзе першакласнікаў выпускнік Віленскага ўніверсітэта Пётр Клаўцан. Ён жа быў і дырэктарам.

Да вайны Якуб скончыў першы клас і быў пераведзены ў другі. Атрыманыя ў школе за год веды далі таленавітаму хлопчыку магчымасць бегла чытаць і размаўляць па-польску. На другі год 1 верасня 1939 года мяне таксама падрыхтавалі ісці ў школу. Дарослыя палічылі лішнім праводзіць мяне – я ж ведаў, дзе школа, – і вырашылі, што да настаўніцы давядзе мяне Якуб, якому добра знаёмыя ўсе школьныя парадкі і выкладчыкі.

Калі праходзіў каля камайскага млына, з рупара пачулася маршавая музыка і дыктар аб'явіў, што пачалася вайна. Выявілася, што 1 верасня 1939 года гітлераўская Нямеччына напала на Польшчу.

Дыктар запэўніваў, што польская армія ні на крок не адступіць ад Балтыкі, што ні аднаго гузіка палякі не аддадуць швабам, заклікаў, каб маці пацалавалі сваіх сыноў і благаславілі іх на бой з ворагам.

У школу я не пайшоў, а ад млына пабег дадому паведаміць гэтую вестку. Я, мабыць, першы прынёс у Гвоздавічы сумную навіну, бо радыё ў вёсцы ні ў кога не было. Маці стала плакаць, што бацьку і каня забяруць у войска (бацька быў кавалерыстам, і наш конь стаяў на ваенным уліку). Калі так усё павярнулася, я сказаў, што ў школу хадзіць не буду, а стану памагаць па гаспадарцы, балазе я даволі пісьменны: чытаць-пісаць умею. Бабуля Луцэя мне запярэчыла: «У школу мусіш хадзіць, бо за цябе бацьку дадуць штраф». Што гэта такое, я не ведаў, але адчуваў, што нешта благое, і мусіў падпарадкавацца. Назаўтра на парозе школы мяне сустрэў Якуб, паказаў, дзе вучацца першакласнікі. Мяне, «новенькага», абступілі старэйшыя хлопцы. Аднаго з іх зацікавіла торбачка. Ён зняў яе з майго пляча, рагочучы, паклаў у кафляную печку і моцна закруціў дзверцы, сказаўшы: «Там ёй месца». Павярнуць закрутку ў мяне не ставала сілы. І тут празвінеў званок. Я сеў за парту. У клас зайшла настаўніца. Заўважыла новенькага і дадала мяне ў спіс вучняў, а потым спытала, дзе мае сшыткі. Я паказаў на печку і патлумачыў, што туды маю торбачку з сшыткамі паклалі старэйшыя хлопцы.

Настаўніца дастала торбачку і аддала мне. Я зразумеў, што з мяне пасмяяліся, заплакаў, за торбачку – і наўцёкі. Калі адчыняў дзверы з сенцаў, убачыў, што да школы, якраз мне насустрач, падыходзіць дырэктар. Я павярнуў назад і з разгону ўшчаміўся між падвойных дзвярэй. Дырэктар прайшоў міма і мяне не заўважыў. Вылезці з схованкі не давала дзвярная ручка, якая ўразалася ў грудзі і не пускала. Я пачаў румзаць. Настаўніца выйшла мяне шукаць і заўважыла зацiснутага між дзвярэй:

– Чаго ты тут? Вылазь, – прамовіла яна спакойным зычлівым голасам.

– Не магу, ручка не пускае…

Настаўніца паклікала школьную старожку (вартаўніцу), якая, адсунуўшы шпінгалеты, расчыніла дзверы і вызваліла мяне. Настаўніца не стала на мяне крычаць, прытуліла да сябе, пагладзіла па галоўцы і павяла ў клас. Яе дабрыня, пяшчота моцна кранулі мяне і я супакоіўся. Гэта была Яніна Аніцэтаўна Пашкоўская.

У нядзелю, 17 верасня 1939 года, у адпаведнасці з раней дасягнутай дамоўленасцю з Нямеччынай (пакт Молатава – Рыбентропа) аб супольнай дэмаркацыйнай лініі савецкі ўрад аддаў загад Чыр-

вонай арміі перайсці мяжу і заняць тэрыторыю Заходняй Беларусі. Польскае войска, сціснутае з двух бакоў нямецкай і савецкай арміямі, не мела магчымасці весці вайну на два франты. 18 верасня, у панядзелак, школа не працавала, бо дырэктар школы і польскія настаўнікі з'ехалі. Уцяклі і чыноўнікі польскай адміністрацыі. Надышло безуладдзе. З гміннай управы, пастарунку людзі разбіралі мэблю, дакументацыю. Мы, школьнікі, зазірнулі ў будынак гміны. Мне таксама дастаўся трафей – кавалачак сургуча і кніга, палова якой не была спісана. Сваім трафеем вырашыў пахваліцца Якубу. Калі пачуў пра гэта яго бацька, то параіў мне аднесці ўсё назад, што я і зрабіў, з выняткам кавалачка сургуча, які панёс дахаты. За яго мне перапала ад майго бацькі, які прымусіў і сургуч занесці назад у гміну. Ніхто не ведаў, што за ўлада прыйдзе, як надоўга. Безуладдзе працягвалася, але школу людзі не чапалі, старожка пераконвала ўсіх, што школа спатрэбіцца пры любой уладзе.

Неўзабаве ў Камаі прыйшла Чырвоная армія.

У САВЕЦКАЙ ШКОЛЕ

Па нейкім часе школа зноў адчынілася, але ўжо не польская, а беларускамоўная, савецкая. Прыслалі новых настаўнікаў з Усходняй Беларусі, дырэктарам прызначылі настаўніка па прозвішчы Мікешка. Вучняў «адсадзілі» на адзін клас ніжэй. Дзеці страцілі цэлы год! Навошта гэта зрабілі – незразумела. Беларускія дзеці без асаблівай цяжкасці перайшлі б на кірыліцу за тыдзень-паўтара. Хоць бацькі крыўдзіліся, спрабавалі пратэставаць, але безвынікова.

Для першакласнікаў адкрылі нулявы клас. Якуб, як і ўсе другакласнікі, апынуўся ў першым класе. А мне пашанцавала. Я яшчэ да школы дома навучыўся бегла чытаць не толькі па-польску, але і па-беларуску лацінскім шрыфтам, і па-расейску кірыліцай. За зіму перад школай прачытаў усе кнігі на расейскай мове з бібліятэкі суседа, які да рэвалюцыі вучыўся ў Пецярбургскай семінарыі і кнігі прывёз з сабой.

Сталі ўкамплектоўваць класы. Я хацеў вучыцца разам з Якубам. Мяне бацька падвучыў, каб я з новымі настаўнікамі размаўляў па-расейску і папрасіўся ў першы клас. Гэта я і зрабіў. Сказаў, што не толькі размаўляць, але і чытаць і пісаць умею па-расейску. Каб праверыць, ці так, мне далі прачытаць тэкст з падручніка геаграфіі і расказаць, пра што я прачытаў. З выпрабаваннем я справіўся, і мяне

залічылі ў першы клас. Так я стаў вучыцца ў адным класе з Якубам. Займаліся мы ў пакоі злева ад уваходу. Мэбля ў класе была тая самая, што і пры Польшчы, толькі на сцяне замест распяцця вісеў партрэт вусатага Сталіна, а над школай развяваўся чырвоны сцяг.

Былая настаўніца, Яніна Пашкоўская, не з'ехала з Камаяў, ёй не было куды, бо яна, тутэйшая, камайская, паходзіла з простых людзей і меркавала, што прэтэнзій да яе з боку новай улады не будзе. Добра валодала расейскай і беларускай мовамі, таму новы кіраўнік школы прызначыў яе настаўніцай першага класа. Пані Яніна, як мы па інерцыі называлі яе, была вельмі шчырым педагогам, яе іншы раз так і хацелася назваць мамай. За маю маці яна была старэйшая толькі на чатыры гады. У Яніны Аніцэтаўны быў прыемны голас, і песціла яна нас, малечу, як сваіх родных. Мы ўсе яе любілі і паважалі. А як цудоўна грала на скрыпцы! Пад скрыпку вельмі лёгка спяваліся песні.

Аднойчы мы заўважылі, што наша заўсёды вясёлая настаўніца прыйшла ў школу заклапочанай. Яе сын Багдан падзяліўся з намі сваім горам: арыштавалі ягоную 14-гадовую сястру Людвіку, якая вучылася ў Свянцянскай гімназіі. Пазней ноччу 17 кастрычніка энкавэдысты забралі мужа Пашкоўскай, Уладзіслава. На працу наша настаўніца прыйшла з заплаканымі вачыма, голас яе дрыжаў, але трымалася годна. Я здзіўляюся, як маглі ў такой кволай жанчыне спалучацца пяшчота і мужнасць! Яна засталася адна з двума сынамі-школьнікамі Багданам і Генрыкам і працягнула працаваць у школе.

25 красавіка 1940 года ў клас уварваліся чатыры ўзброеныя энкавэдысты, з урока забралі Яніну Аніцэтаўну і павялі з настаўленымі на яе пісталетамі з школы. Мы здранцвелі ад страху, дзяўчаткі сталі плакаць. Яе сыны, Багдан і Генрык, галосячы, пабеглі дахаты... Дырэктар школы растлумачыў нам, што яна «вораг народа»...

Што яна вораг народа, мы, вучні, не паверылі, не паверылі і людзі. Яна нарадзілася і выросла на вачах местачкоўцаў і нічога нікому дрэннага не зрабіла. Ды і ў палітыку не ўмешвалася. Але для бальшавікоў яна, як і ўсе настаўнікі за польскім часам, была «чуждым элементом». Потым пайшлі ў Сібір леснікі, гандляры, урачы, паштары, пажарнікі, каморнікі, святары, проста заможныя і пісьменныя людзі і нават парабкі.

Пасля арышту Яніны Аніцэтаўны пэўны час не вучыліся, бо не было настаўніцы. На 1 Мая, калі ладзілася ў школе святкаванне, запрасілі і нас, вучняў Яніны Аніцэтаўны, хоць мы ўжо ў школу не хадзілі

і вучнямі сябе не лічылі. Дырэктар загадаў, каб пасля свята прыйшлі ў школу, пазнаёміў нас з новай настаўніцай і сказаў, што яна вельмі добрая. У гонар свята нас пачаставалі цукеркамі-падушачкамі.

Настаўніцу звалі Марыя Рыгораўна Бальшакова (Касценіч). Яна была, можа, на дзясятак гадоў старэйшая за нас, але добра валодала расейскай мовай, бо выхоўвалася ў сям'і стараверскага святара ў вёсцы Гурнікі. Яе дзядуля Патап працаваў бацюшкам у Апідамах, таму ў мястэчку яе называлі «Патапава ўнучка». Сама ж яна жыла ў Камаях, дзе яе свёкар і муж працавалі гандлярамі. Хутка пасябравала з намі, была справядлівай, спагадлівай. Працягвала вучыць нас і ў наступным навучальным годзе. Марыя Рыгораўна вельмі добра спявала і вучыла спяваць нас. На Кастрычніцкія святы мы ставілі канцэрт. Кожны вучань па чарзе выконваў па адным куплеце прыпевак. Памятаю, як Якуб, у лад прытопваючы нагой, адчаканіў:

Бей блох, комаров,
Чтобы не кусали,
Бей по шее всех врагов,
Чтобы не мешали!

Пасля кожнага куплета мы хорам на ўсе грудзі спявалі, ці хутчэй, крычалі:

Косилка, молотилка, сортировка, веялка,
А за трактором идет рядовая сеялка...

На чыстапісанні старанна выведзеныя круглыя Якубавы літары вельмі нагадвалі яго самога – круглагаловага хлапчука з кароткай стрыжкай «пад вожыка».

Пасля трэцяй чвэрці нас адпусцілі на веснавыя канікулы. Урокаў рыхтаваць не трэба. Самы час пазабаўляцца. Якраз каля хаты Якубоўскіх разлілася рэчка: вырашылі запускаць караблікі. Яны, папяровыя, хутка намакалі і танулі. Тады Якуб прапанаваў зрабіць караблікі з кары. Зрабілі. Атрымаліся адмысловыя, спрытна плавалі ля берага. Раптам мой караблік адплыў далей на сярэдзіну, і плынь вады імкліва панесла яго да моста. Я стаў даганяць, ускочыў у ваду, каб злавіць, але паслізнуўся і пляснуўся ўсім целам у рэчку. Хуценька вылез з вады. Ісці дадому ў мокрым адзенні было холадна. Якуб завёў мяне ў хату пасушыцца. Калі ўбачыла мяне, мокрага да нітачкі, цётка Рая, тут жа загадала распрануцца да сподняга і лезці на печ адагравацца, а вопратку выкруціла і павесіла на шасток над грубкай сохнуць.

З добрымі адзнакамі нас перавялі ў трэці клас, але працягваць вучобу не выпала. Летам на Савецкі Саюз напала Нямеччына, Камайшчыну занялі фашысты. У будынку школы размясціўся летувіскі гарнізон. Ужо зімой у хаце Казлоўскага адкрылася летувіская школа, настаўнікамі сталі працаваць муж з жонкай па прозвішчы Кулеш. Нам выдалі на летувіскай мове кніжкі «Спарнеліў». Гэтая мова была для нас непрывычнай, ды і партызаны пагражалі пакараць тых, хто будзе вучыцца ў летувіскай школе. Вучобу, амаль не пачаўшы, давялося пакінуць. Час быў вельмі трывожны, няпэўны. Удзень летувіскія ўлады займаліся рознымі паборамі для нямецкай арміі і ўтрымання гарнізона: ім то муку на хлеб давай, то бульбу, то гародніну, то яйкі, мяса, прывязі дровы, то выстаў варту. А ўначы – партызаны. Ды былі яны трох гатункаў. Польскія, якія забіралі харчы, праўда, добра плацілі маркамі, але гэтая купля была прымусовай. Савецкія партызаны, якіх называлі «кажушнікі». Гэтыя забіралі ўсё, нават жаночае і дзіцячае адзенне, посуд, начынне, калаўроты, вымагалі пярсцёнкі, гарэлку, пагражалі зброяй. Каб завезці нарабаванае, бралі гаспадарскага каня, запрагалі і не вярталі. Дзе дзявалі, невядома. Таму мае бацькі хавалі ўсе больш-менш каштоўныя рэчы, як маглі, а каня я кожны вечар вадзіў нанач у Камаі да Клундука на сховы. Меркавалася, што партызаны ў Камаі ісці пабаяцца. Быў і трэці гатунак партызан, да якіх людзі ставіліся з павагай. Яны нічога не рабавалі, не застрашвалі людзей, толькі прасілі памяняць на сухія і цалейшыя анучы, зменку бялізны, паесці. Маці для іх прыносіла з сховаў хлеб, саланіну, частавала, давала клуначак у дарогу і жагнала, каб куля фашыстаў іх не кранула.

7 лістапада 1943 года падмерзла, выпаў першы сняжок. Партызаны зрабілі спробу разграміць летувіскі гарнізон. Гарнізон налічваў 117 чалавек: 100 летувісаў з вайсковых часцін, якія кватаравалі ў школе, 17 летувіскіх паліцаяў, якія жылі па кватэрах, было яшчэ 2 ці 4 немцаў, якія жылі ў «мураванцы», былой габрэйскай краме насупраць касцёла. Гарнізон меў на ўзбраенні 7 станкавых, 11 ручных кулямётаў, некалькі вінтовак і пісталетаў. Штурм гарнізона не ўдаўся. Некалькі дзясяткаў партызан загінулі, шмат было паранена. Партызаны падпалілі мястэчка. Засталося загадкай, чаму яны наўмысна палілі хаты мірных жыхароў. Можа, толькі таму, што Камаі лічыліся летувіскай тэрыторыяй? Але ж гэты падзел залежаў не ад жыхароў, а ад акупантаў. Згарэлі 24 хаты. Згарэла хата і ўсе забудовы Якубоўскіх, увесь пажытак, кароўка ў хляве, гарбарскі рыштунак. Пасля гэтага Якубоўскія выехалі з Камаяў, і нашы дарогі з Якубам на шмат гадоў разышліся.

У ВІДЗАХ

У 1943 годзе сям'я Якубоўскіх пераехала ў Відзы, пасялілася ў старэнькай хаце радні па лініі маці. У гэтым мястэчку Якуб перажыў апошні год нямецкай акупацыі, тут атрымаў сярэднюю адукацыю.

Відзы – старажытнае паселішча, вядомае з сярэдзіны XV стагоддзя, калі вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч (княжыў у 1432–1440) аддаў землі паміж рэкамі Дзісна і Дрысвята Нарушэвічам, якія заснавалі тут мястэчка. Ёсць меркаванне, што назва Відзы паходзіць ад балцкага этноніма «відзы» – жыхары гістарычнай вобласці Латвіі Відземе, якія маглі перасяліцца ў гэтыя мясціны, а другое паданне тлумачыць паходжанне назвы ад слова «відзець». Відзы былі тыповым беларускім мястэчкам. Некалі яны мелі славу цэнтра конегадоўлі і птушкаводства, асабліва гусей, якіх экспартавалі нават за мяжу.

Жывучы ў Відзах, Якубоўскі глыбока азнаёміўся з мясцовым жыццёвым укладам, звычаямі жыхароў мястэчка і іх стасункамі з насельнікамі вёсак і засценкаў. Гэтае знаёмства дапамагло Якубу Адамавічу пазней напісаць артыкул для БелСЭ «Мястэчка».

Самы значны архітэктурны аб'ект у Відзах – касцёл Нараджэння Дзевы Марыі, узведзены ў 1914 годзе паводле праекта Лявона Вітан-Дубейкаўскага, – выдатны ўзор неагатычнага стылю. Шпілі храма сягаюць у неба на вышыню 59 метраў. Гэта самы высокі касцёл Беларусі. У Першую сусветную вайну побач праходзіў расейска-германскі фронт, і касцёл часта трапляў пад артабстрэл. На ўспамін пра тыя падзеі ў сцены ўмуравалі два снарады. У Відзах захавалася цагляная Успенская царква стараверaў, будынак вадзянога млына, некалькі дамоў канца XIX – пачатку XX стагоддзя. У наваколлі пасёлка засталіся рэшткі жалезабетонных умацаванняў «Лініі кайзера».

Недалёка ад Відзаў, у Відзах-Лаўчынскіх, знаходзіўся сядзібны комплекс Ваўжэцкіх. Гэта мясціна была знакамітая тым, што яе гаспадар Тамаш Ваўжэцкі (1754–1816) у сваім маёнтку ліквідаваў паншчыну і даў сялянам волю. Яшчэ ён быў знакамітым грамадска-палітычным і вайсковым дзеячом Вялікага Княства Літоўскага, адным з кіраўнікоў паўстання 1794 года, знакамітым паплечнікам Тадэвуша Касцюшкі. Памёр у 1816 годзе, пахаваны ў Відзах. На пліце надпіс: «Прыяцель і паплечнік Т. Касцюшкі, удзельнік і кіраўнік паўстання 1794 года».

У час вучобы ў Віленскім універсітэце неаднаразова наведваўся ў Відзы да свайго дзядзькі Маеўскага Адам Міцкевіч. Якуб Адамавіч ведаў пра гэта, не раз ступаў па сцежках славутага суайчынніка. Такая акалічнасць, без сумневу, прычынілася да таго, што для дыпломнай работы ён абраў тэму, прысвечаную менавіта гэтаму паэту.

У шматканфесійным мястэчку Відзы дзейнічалі праваслаўная, каталіцкая, стараверская, юдэйская, пратэстанцкая, магаметанская суполкі. У 1816 годзе ў Відзах утварыўся мусульманскі прыход. У 1867 годзе з ініцыятывы Якуба Мустафавіча Якубоўскага была ўзведзена ў Відзах мячэць, якая ў Першую сусветную вайну згарэла. 1 ліпеня 1923 года на адмысловым першым арганізацыйным сходзе тамтэйшых мусульманаў было прынята рашэнне аб будаўніцтве новай мячэці. Гарадскі камітэт па аднаўленні святыні ўзначаліў мула. Сход абраў мулой Аляксандра Радкевіча, які займаў гэту пасаду і да вайны. Мячэць была ўрачыста адчынена 15 чэрвеня 1934 года. Прысутнічалі вернікі з Відзаў і навакольля, прадстаўнікі польскіх уладаў. Першую службу правёў муфцій Рэчы Паспалітай Якуб Шынкевіч.

Уяўленне аб вонкавым выглядзе храмаў даюць два фотаздымкі, знойдзеныя К. Шыдлоўскім у аддзеле рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве. На здымку мячэці, разбуранай у час Першай сусветнай вайны, бачна, што гэта быў трохнефавы будынак зрубнай канструкцыі. Кожны з нефаў меў асобны дах з бляхі. Над мячэццю ўзвышалася вежа-мінарэт, дапасаваная да асноўнага будынку з правага боку ад пярэдняга фасада.

Мячэць, адкрытая ў 1934 годзе, праіснавала да сярэдзіны XX стагоддзя. Гэта быў просты нешаляваны зруб з двума прыбудовамі, прысценкамі: квадратным у плане прытворам і невялікім прастакутнікам міхраба, нішы ў накірунку Каабы, ісламскай святыні ў Мецы. Галоўным архітэктурным акцэнтам была чатырох'ярусная вежа-мінарэт. Вежа мела ступеневую кампазіцыю. Першы ярус, блізкі да квадрата, знаходзіўся на роўні галоўнага нефа. Астатнія былі, відавочна, каркаснымі, другі і чацвёрты – абшаляваныя вертыкальна, трэці – гарызантальна. Ярусы вылучаліся выразнымі карнізамі. Асноўны аб'ём і першы ярус вежы мелі прастакутныя аконныя праёмы, другі ярус – паўцыркульныя, трэці – двухгранныя, апошні не меў вокнаў. Завяршаў вежу шпіль з паўмесяцам. Уваход у мячэць знаходзіўся на бакавым фасадзе вежы і быў аформлены порцікам з чатырма калонамі. Сцены мінарэта пафарбаваныя ў зялёны колер,

а гзымсы, ліштвы, дзверы ўсёй мячэці – у белы. Над вільчыкам, з супрацьлеглага боку, пастаўлена дэкаратыўная вежачка, таксама завершаная паўмесяцам.

Спадар Якуб меў магчымасць назіраць, як абрыс строгага мінарэта фармуе панараму ўсяго мястэчка, перагукаючыся з вострымі вежамі неагатычнага касцёла. Святыня служыла людзям зусім мала: пасля вайны савецкія ўлады – ваяўнічыя атэісты – яе зачынілі і выкарыстоўвалі да канца 1940-х гадоў пад розныя гаспадарчыя патрэбы, а потым увогуле разабралі.

ПРАЗ ШМАТ ГАДОЎ...

Праз шмат гадоў пасля сумеснай вучобы ў Камайскай школе я сустрэўся з Якубам Якубоўскім у музеі Якуба Коласа, куды прывёз на экскурсію сваіх вучняў. Якуб Адамавіч працаваў недалёка ў рэдакцыі БелСЭ. З гэтага часу аднавіліся сустрэчы, кантакты, ліставанне. Калі я бываў у Менску, то стараўся не абмінуць кватэру Якуба Адамавіча. Хоць ён быў моцна заняты клопатамі па рабоце, але заўсёды знаходзіў час для госця. Нярэдка нашы размовы цягнуліся далёка за поўнач.

Ён быў умелым палемістам з бездакорнай логікай. Яго довады, аргументы, вобразныя параўнанні былі пераканаўчымі, рабілі моцнае ўражанне на суразмоўца. І тым не менш, бывала ў час палемікі, калі я настойваў на сваім, гутарку завяршаў жартаўліва: «Я гавару, як ведаю, а ты думай, як знаеш». Словы «ведаць» і «знаць» – сінонімы, гэтым выслоўем спадар Якуб даваў апаненту права на ўласную думку. Вельмі любіў гумар, жарты, прыказкі і прымаўкі, якімі адорваў сваіх прыяцеляў.

У час адной з гутарак я выказаў распаўсюджанае меркаванне, што ад татараў у беларускую мову трапіла і ненарматыўная лексіка – мат. Мяркуецца, што мацюкі прыйшлі ў Беларусь праз расейскую мову, якую «ўзбагацілі» ў XIII стагоддзі полчышчы татара-манголаў, што захапілі землі Паўночна-Усходняй Русі і амаль 300 гадоў валадарылі там. Якуб гэтую версію назваў выдумкай. Татары не мацюкаюцца. Ён сцвярджаў, што расейская ненарматыўная лексіка паходзіць ад гунаў. Яна з'явілася разам з нашэсцем гунаў і існавала ў старажытнасці толькі ў вуграў і фіна-вугорскіх народаў (вуграфінаў), якія жылі на тэрыторыі сучаснай Цэнтральнай Расеі. Толькі там ёсць старажытныя тапонімы і гідронімы з элементамі мацюкоў. А паколькі фіна-

вугры сталіся асновай расейскага этнасу – адсюль і расейскі мат. Я пагадзіўся з яго меркаваннем, бо ў час сустрэч з татарамі ў войску, побыце ніколі не даводзілася чуць ад іх ненарматыўнай лексікі.

Спадар Якуб быў вельмі далікатным чалавекам, мяне, аднагодку, сівога дзеда, пры сустрэчах і ў лістах называў толькі Янэчак. Калі вялі размову пра кнігу «Памяць» Мядзельскага раёна, ён заўважыў, што яна адна з лепшых кніг сярод выдадзеных дагэтуль, і тут жа цёпла выказаўся пра Соф'ю Самуэль, далікатна назваўшы яе памяншальна-ласкавым імем Софачка. Соф'я Пятроўна Самуэль у Галоўнай рэдакцыі БелСЭ адказвала за падрыхтоўку кніг серыі «Памяць» і шмат зрабіла для ажыццяўлення гэтага выдання.

Свой лёс і творчыя здабыткі Якуб Адамавіч шчасліва звязаў з Таццянай Васільеўнай – аднакурсніцай па геаграфічным факультэце ўніверсітэта, сябрам, жонкай, маці яго дзяцей, адукаваным чалавекам. Якубоўскія – вельмі гасцінныя людзі. Частаваў мяне Якуб і сваёй «фірмовай» стравай, якую жартаўліва называў «бліны-цыганы». Дарэчы, не ўжываў алкаголю, лічыў, што ён робіць людзей неадэкватнымі.

Умеў шанаваць кожнага чалавека. Я ведаю, што татарка з Прыбалтыкі, якая трапіла ў бяду – страціла дакументы – доўгі час жыла ў іх, аж да той пары, пакуль не залагодзіла справу. Не быў вельмі заможным, але ахвяроўваў свае грошы на падтрымку выдання газеты «Наша слова», часопіса «Байрам».

Міхасю Маліноўскаму належаць словы пра Якуба Адамавіча: «Быў героем і мудрым чалавекам, быў дзейсным агітатарам, прапагандыстам і даследчыкам беларускіх і беларуска-татарскіх з'яў. Да скону ён працаваў дбайна і рупліва на нівах культуры двух народаў». А Рыгор Барадулін даводзіў: «У татарына Якава Якубоўскага бальшыні беларусаў трэба было вучыцца беларушчыне».

ЖЫЦЦЯПІС

РАДАВОД ЯКУБОЎСКІХ ГЕРБА «ТАПОР» («СТАРЖА»)

Аляксандр Лашкевіч, Іван Драўніцкі

Шмат шляхоцкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага карысталася гербам «Тапор» («Старжа»). Да гэтага герба належаў і шляхоцкі род Якубоўскіх. Назву «Старжа» герб атрымаў па прозвішчы ваяра, якому ўпершыню быў нададзены. Герб лічыцца адным з старэйшых шляхоцкіх гербаў, ён вядомы з XIII стагоддзя.

Паводле гербоўнікаў, кананічнае апісанне герба наступнае: у чырвоным полі сякера, павернутая лязом улева, ручка залатая, лязо сярэбранае, на ім выява месяца. У навершніку такая самая сякера ў нахіленым становішчы. Якубоўскія карысталіся таксама гербам «Тапор, вар. 2».

Першыя дакументальна зацверджаныя звесткі аб родзе Якубоўскіх адносяцца да другой паловы XVII стагоддзя. Яго прадстаўнік Абу-Бякір Хазбіевіч Якубоўскі, згодна з прывілеем караля і вялікага князя Яна Казіміра Вазы, атрымаў ва ўласнасць 15 валок пусткі ў вёсцы Каранагорцы Троцкага ваяводства і пажыццёва пасаду ротмістра татарскай харугвы гэтага ваяводства за заслугі ў вайне з украінскімі казакамі. На жаль, з прычыны пашкоджання дакумента ў копіі, што знаходзіцца ў радаводнай справе, адсутнічае дата выдачы прывілея.

Абу-Бякір Якубоўскі меў двух сыноў – Адама і Давыда, якія сталі заснавальнікамі дзвюх галін гэтага рода. Паводле радаводных дакументаў, Адам меў чатырох сыноў: Багдана, Міхала, Халіля і Хасеня. Давыд жа – аднаго Усеня. З сыноў Адама нашчадкаў-сыноў пакінулі Багдан (сыны Адам, Мустафа і Шабан) і Халіль (сыны Рафал і Міхал). У чатырох сыноў Усеня – Багдана, Рамана, Давыда і Якуба мужчынскае патомства было ў двух апошніх: ад Давыда – Адам-Ян, Мустафа-Раман і Хасень, ад Якуба – Давыд. Наступныя пакаленні

гэтага роду з'яўляюцца нашчадкамі згаданых асоб. Якубоўскія былі пацверджаны ў шляхоцтве пастановай Менскага дваранскага дэпутацкага сходу ў 1824 годзе і зацверджаны Дэпартаментам герольдыі Сената ў 1849 годзе (па іншых дакументах – у 1841 г.).

Мужчыны розных пакаленняў Якубоўскіх неслі традыцыйную для татарска-беларускай шляхты вайсковую службу ў часы як Рэчы Паспалітай, так і Расейскай імперыі. Так Усень, унук Абу-Бякіра і сын Давыда, быў намеснікам троцкага татарскага харужага. Захаваўся загад тагачаснага харужага Мустафы Юшынскага ад 20 кастрычніка 1665 года, каб усё «таварыства» – асабовы склад харужства – далажыла ягонаму намесніку Усеню Якубоўскаму аб гатоўнасці да паскоранага марша на Горадню.

Паручнік «кавалерыі нарадовай» Адам Якубоўскі паводле прывілею караля і вялікага князя Аўгуста III ад 13 лістапада 1754 года атрымаў пры звальненні ў адстаўку чын ротмістра. Пры такіх жа абставінах атрымаў 13 чэрвеня 1786 года званне паручніка згодна з загадам гетмана Вялікага Княства Літоўскага і віленскага ваяводы Міхала Казіміра Агінскага харужы брыгады «кавалерыі нарадовай пяцігорскай» Самуэль Якубоўскі.

У Літоўска-татарскім конным і Конна-татарскім палках расейскай арміі служылі Абрагам Якубоўскі (таварыш – шараговы шляхоцкага паходжання ў войсках Рэчы Паспалітай), Аляксандр Якубоўскі (таварыш), Якуб Якубоўскі (вахмістр).


У 1910-х гадах на радзіме продкаў, у Крыме, жыў і працаваў у расейска-татарскіх навучальнях (спачатку настаўнікам у Саках, а потым кіраўніком такой самай навучальні ў Керчы) Аляксандр Якубоўскі.

СЯМ'Я ЯКУБОЎСКІХ НА РАЗДАРОЖЖЫ XX СТАГОДДЗЯ

Адам Якубоўскі

Да канца падыходзіць XX стагоддзе. Больш чым шэсць дзясяткаў гадоў я пражыў у гэтым стагоддзі. З'явілася жаданне падзяліцца з людзьмі, як цягам часу даўжынёй у век мяняўся лёс адной татарскай сям'і на зямлі колішняга Вялікага Княства Літоўскага, потым «Северо-Западного края» і «крэсув всходніх». Мянялася ўлада, прыходзілі розныя гаспадары, а ў татарскіх сем'ях трымаліся свайго парадку жыцця, гадавалі працавітых і сумленных дзяцей, выхоўвалі зычлівае і паважлівае стаўленне да тых, хто жыў побач.

Радавод Якубоўскіх герба «Тапор» («Старжа»)



Я з'явіўся на свет у сям'і пятым, але гадаваўся толькі трэцім. А ўсяго нас у бацькоў выросла чацвёра. Самы старэйшы брат Кастусь у студзені 1945 года быў узяты ў войска і доўгія шэсць гадоў заставаўся ў арміі. Старэйшы брат Якуб абставінамі жыцця вымушаны быў рана пайсці з роднае хаты на свой хлеб, а меншы Браніслаў і я заставаліся ў хаце. Маці часта хадзіла на мізар*, бо там былі пахаваны мая сястра і два браты, а таксама мае дзве бабулі і дзядуля. Мне не давялося пабачыць іх жывымі, бо на свет я з'явіўся намнога пазней, чым яны адышлі ад нас назаўсёды. Да мізара ісці было далёка, і ў час гэтых паходаў маці кожны раз узгадвала пра родных, пра розныя падзеі іх жыцця. Мяне заўсёды цікавіла гісторыя нашага роду. Вось якая яна атрымалася з таго, што я пачуў і запомніў у тых вандроўках.

Мой дзядуля па бацьку Сцяпан у 1900 годзе павінен быў пацвердзіць сваё шляхоцтва, а заадно і адведаць свайго дзеда ў Менску. На пасяджэнні камісіі дзеда папікнулі, што не мае ахвоты ісці служыць у войска і не бярэ прыкладу з свайго блізкага родзіча-генерала. Неўзабаве ў 1902 годзе з'явіўся на свет мой бацька. А ў 1903 годзе на другой вуліцы ў тым жа пасёлку нарадзілася і мая матуля.

Прайшло не так шмат гадоў, і грымоты Першай сусветнай вайны дакаціліся да Браслаўшчыны. Старэйшым трэба было вырашыць, як ратавацца ад гэтай бяды. Сям'я бацькі была больш заможнай – мела ў гаспадарцы добрага каня і ўсё іншае, што патрэбна. І калі фронт падышоў зусім блізка да пасёлка, мой дзядуля з сваёй сям'ёй хуценька накіраваўся да Полацка. Там бежанцаў уладкоўвалі на цягнікі і везлі ў той край, які яны самі абіралі для жыцця. Так бацькава сям'я апынулася ў Казані. Дзед па тым часе быў адукаваным чалавекам, ён адразу ўладкаваўся на працу чыноўнікам на пошце, а мой бацька працягваў вучобу ў гімназіі.

А матчына сям'я не мела магчымасці ўцячы ад навалы: была вельмі хворай мая прабабка – ёй тады было ўжо за 90 гадоў. Калі немцы занялі пасёлак, адбылася стабілізацыя фронту, і аж на тры гады пасёлак стаў пярэднім краем – франтавой лініяй. Ад забудоў нічога не засталося, толькі да гэтага часу стаяць нямецкія доты з бетону, ды зямля не змагла загаіць раны ад траншэйных рубцоў, месцамі і цяпер добра відаць іх зігзагі.

---

* Мізар у Відзах – адзін з найбольшых у Беларусі. Закладзены на пачатку XIX стагоддзя на пагорку ля вёскі Мельнікі паміж дарогамі Відзы – Паставы і Відзы – Гадуцішкі. Пад час Першай сусветнай вайны быў моцна пашкоджаны: немцы на тэрыторыі мізара выкапалі абарончыя збудаванні. – *І. Д.*

Нямецкае ваеннае камандаванне пастанавіла выселіць цывільных людзей з франтавой зоны, і небаракаў павезлі на захад. Так мая маці, яе бацькі, бабуля і старэйшая сястра з дзецьмі апынуліся ў Летуве, недалёка ад Шаўляў. У першыя месяцы яны паспыталі ліха, голаду і холаду. Не вытрымала голаду мая прабабка, на 93-м годзе жыцця ціха ноччу адышла ў іншы свет. Гэта была ўжо не першая страта майго роду на доўгім шляху XX стагоддзя.

У тых мясцінах жыло аднароднае насельніцтва, і ніякай іншай мовы, апрача летувіскай, не ўжывалі. Такія абставіны вельмі ўскладнялі жыццё эвакуяваных. Але мая маці вельмі хутка навучылася размаўляць на мове тубыльцаў і была ў хаце перакладчыкам. А дзядуля быў добрым рымарам. З'явіліся нейкія заказы, і жыццё патроху наладзілася, можна было адкласці крыху грошай на чорны дзень.

Скончылася вайна, і пацягнула людзей на радзіму, аднак вельмі цяжкі і доўгі шлях выпаў на долю маіх сваякоў. Толькі ў 1921 годзе вярнуліся яны ў родны кут, але не ўсе. Засталася ў Летуве мая цётка з дзецьмі, бо не ведала лёсу свайго мужа, узятага ў дзейную армію ў 1914 годзе. Пазней стала вядома, што ён у той бойні застаўся жывы, але, атручаны газамі, нядоўга пажыў. Не вытрымала доўгай і цяжкай дарогі бабуля – не даехала ўсяго нейкіх 30 кіламетраў да родных мясцін. І на радзіму дабраліся толькі двое з вялікай сям'і – мая маці і дзядуля. Жыллём ім стаў на некалькі гадоў бетонны дот.

А мае родныя па бацьку ў гэты час рыхтаваліся ў дарогу на радзіму з Казані. Гішпанка, якая лютавала тады, забрала маіх старэнькіх прадзеда і прабабку – навекі засталіся ў зямлі, якая дала прытулак ім на шэсць гадоў.

Так праз шмат гадоў сустрэліся на роднай зямлі мае бацькі. І першай працай у гэтым зруйнаваным вайной краі было збіранне з франтавых палёў калючага дроту. Амаль на год «калючка» стала карміцелькай многіх людзей.

Ішлі гады, наладжвалася жыццё, нараджаліся дзеці. Збудавалі бацькі добрую хату, абладзілі гаспадарку. А ў 1939 годзе ў верасні зноў змянілася ўлада. Прыход Чырвонай арміі вельмі добра адбіўся ў маёй памяці.

Неўзабаве яшчэ адзін дзень стаў такім самым памятным. Мы жылі ў мястэчку Камаі, а недалёка – Паставы, дзе быў ваенны аэрадром. Уранку 22 чэрвеня данесліся да нас выбухі бомбаў, выццё мараў бамбавікоў. А праз некалькі дзён пачалі ісці босыя і галодныя салдаты. Маці кожную ноч пякла хлеб, каб удзень раздаць галодным

чырвонаармейцам. Вельмі добра запомнілася невялікая група іх, што прыпынілася ля нашай хаты. Вялікі зялёны двор і студня з асверам прыцягвалі людзей да адпачынку. І калі маці вынесла з хаты бохан і падала камандзіру, ён папрасіў, каб яна сама падзяліла гэты хлеб на ўсіх. А яшчэ праз некалькі дзён з'явіліся немцы. Па начах на ўсход ішлі савецкія салдаты-акружэнцы, і не адзін раз мой старэйшы брат Якуб праводзіў іх у абыход камендатуры.

Не абышоў цяжкі лёс наш род у Другой сусветнай вайне. 7 ліста-пада 1943 года ў вялікае вогнішча ператварылася наша хата, і не толькі наша, а і многіх іншых. І мы, тры старэйшыя браты, некалькі дзён прыходзілі на папялішча сілкавацца печанай бульбай і тушанай капустай. Невядома дзе і калі загінулі мой дзядзька па бацьку Якуб і стрыечны брат Аляксандр. На другі дзень вайны быў забіты стрыечны брат Мустафа. У баі пры штурме горада Марыенбурга 5 сакавіка 1945 года загінуў стрыечны брат Адам. Там ён і пахаваны.

Пасля вайны жыццё раскідала нас усіх па вялікай краіне. У Вільні на мізары супакоіўся мой дзед Сцяпан. Старэйшы брат Кастусь шмат гадоў пражыў у Варкуце – здабываў вугаль, будаваў дамы. Яго няма ўжо сярод жывых, але там засталася малодшая дачка і ўнук. Старэйшая дачка будавала Ігналінскую атамную станцыю. Цяпер яна там і жыве. У Пецярбурзе жывуць тры сыны забітага стрыечнага брата Мустафы, а ў Котласе – стрыечны брат Андрэй. У Менску жыве і працуе дачка брата Якуба, тут жывуць яго ўнучкі, а сын яшчэ вучыцца ў Маскве. З вялікай калісьці сям'і нас засталося двое: я і малодшы брат Браніслаў, які жыве ў Віцебску.

Сам я ўжо сорак гадоў жыву і працую ў Калінінградзе. Тут выраслі два мае сыны і дачка, гадуюцца ўнукі і ўнучка. Але ўсе мае нашчадкі ведаюць, дзе жылі і пахаваныя іх родныя, кім яны былі. А калі мяне пытаюць, хто я такі і адкуль, то жартам адказваю: «Я самы заходні беларускі татарын».

БРАТЫ

Таццяна Якубоўская

З сямі дзяцей, што нарадзіліся ў Раісы Хасенеўны і Адама Мустафавіча, выгадаваліся чатыры браты. Хасень (Кастусь) нарадзіўся ў 1927 годзе і быў на пяць гадоў старэйшы за Якуба. Другая сусветная вайна не дала хлопцу скончыць сярэднюю школу, а ў канцы вайны, калі яму было толькі 17 гадоў, яго забралі ў войска, дзе тады служылі

аж шэсць гадоў, бо пасля вайны засталося мала мужчын прызыўнога ўзросту. Пасля звальнення Кастусь працаваў у Мёрах фінінспектарам, неўзабаве ажаніўся з відзаўскай татаркай, прыгажуняй Зінай, і з сям'ёй паехаў у Варкуту, куды вербавалі людзей з усяго Саюза для наладжвання вуглездабычы. Доўгі час (15 гадоў) працаваў пад зямлёй, пазней на кіраўнічых пасадах у шахтаўпраўленні, быў і начальнікам шахты. У Варкуце нарадзіліся дзве дачушкі – Томачка і Жана. Сям'я жыла, па савецкіх мерках, у дастатку. Аднак не памятаю, каб яны ездзілі да цёплага мора, звычайна адпачынак праводзілі ў бацькоў у Відзах.

Старэйшы сын увесь час падтрымліваў бацькоў матэрыяльна, адсылаючы кожны месяц грошы. Паведамленні аб прысланых Кастусем ды іншымі сынамі грашах бацькі ашчадна захоўвалі і назбіралі вялізны стос, што прывезлі з сабой, калі пераехалі ў Менск да Якуба. І тут гэты стос папаўняўся таксама.

Канстанцін быў уважлівы і шчодры не толькі ў дачыненні да бацькоў. Ён і яго сямейнікі часта наведвалі і Якуба, спыняліся ў нас, дарылі рэчы, якіх мы не маглі сабе дазволіць. Незабыўнае ўражанне зрабіў яго падарунак – калі нашаму Косціку споўнілася тры гады, дзядзька Кастусь падараваў яму сапраўдны двухколавы ровар.

Але самае цеснае сяброўства ў Якуба і яго дзяцей было з Адамам, малодшым за яго на пяць гадоў. У нашай сям'і яго звалі Адзікам. Калі мы з Якубам завялі сваю сям'ю (гэта было ў 1965 годзе), Адзік вучыўся завочна на біяфаку БДУ і спыняўся ў нас, прыязджаючы на сесію. Часта прывозіў з сабою дачушку Раечку, якую выхоўваў вельмі строга. Мне было шкада яе, бо, калі мы ішлі на працу, а бацька ехаў ва ўніверсітэт, ён загадваў дзяўчынцы сядзець у куточку і гуляць з цацкамі або чытаць. Я імкнулася яе забаўляць праходкамі па горадзе або тым, што брала з сабой на працу на Станцыю юных натуралістаў. У той час Адам быў ваенным фельчарам (раней скончыў медычную навучальню), рыхтаваўся да звальнення з арміі, таму набываў другую спецыяльнасць. Але да гэтага было яшчэ далёка, бо давялося прайсці па дарогах Чэхаславаччыны да Прагі ў 1968 годзе, мяняць месца жыхарства ў залежнасці ад месца службы і апынуцца нарэшце ў Калінінградзе. Тады ў Адама ўжо было двое дзяцей, рос сынок Барыс. Адзік ажаніўся рана, пакахаўшы дзяўчыну, хворую на сухоты. Як дасведчаны лекар, ён дапамог жонцы Галіне перамагчы хваробу, і дзеткі выраслі здаровымі. Толькі малодшы, Васілёк, гадаваўся ўжо без мамы, якая рана

пайшла з гэтага свету з прычыны хваробы крыві. Гадавала яго жончына сяброўка Надзея, якая пазней стала спадарожніцай Адама Адамавіча.

У 1970-х гадах Адам ужо развітаўся з войскам і пасля працы на прадпрыемствах Калінінграда паступіў гідролагам на рыбалоўнае судна. Больш за 15 гадоў ён быў звязаны з морам, на паўгода адпраўляўся ў плаванне, апошнім часам як памочнік капітана. Чалавек адукаваны і цікаўны, з выдатнай памяццю, ён прывозіў з падарожжаў яскравыя назіранні і апавядаў нам пра краіны Афрыкі і Амерыкі, куды заходзілі іх караблі. У той час пасля часопіса «Вокруг света» гэта былі рэдкія для нас, тых, хто жыў за жалезнай заслонай, сведчанні пра жыццё за мяжой.

На долю Адзіка выпала прайсці праз цяжкія моманты ў жыцці бацькоўскай сям'і. На пачатку 1950-х гадоў, калі быў яшчэ старшакласнікам, а Кастусь і Якуб ужо працавалі, Адзік на некаторы час застаўся за старэйшага мужчыну ў хаце і дапамагаў матулі працаваць на зямлі, збываць гародніну на рынку і прыносіць сякія-такія грошы ў хату. Безумоўна, старэйшыя браты дапамагалі, аднак і падлетак Адам стараўся з усяе моцы, бо трэба было вучыцца самому і вучыць меншага брата Бронечку, які ўжо пайшоў у школу.

Другі цяжкі момант, пра які я ведаю, здарыўся ў 1979 годзе. Старэнькія бацькі ўжо не мелі сілы абслугоўваць сваю хату ў Відзах, асабліва цяжка было ў той час нарыхтоўваць дровы, варыць ежу ў вельмі халоднай кухні. З вялікім сумам бацькі згадзіліся на пераезд, і сыны вырашылі перасяліць іх у Менск, бо мы мелі самую прасторную кватэру і бліжэй было да радні і мізараў. Дык вось Адаму, які ў тую восень быў вольны ад паходу ў мора, давялося разбураць бацькоўскае гняздо і перавозіць у Менск нажытае, што змясцілася ў грузавіку ГАЗ-51. Памятаю, як ён увёў бацькоў у кватэру і з палёгкай выдыхнуў: «Давёз!»

Пераезд бацькоў да нас яшчэ больш зблізіў братоў, яны часцей наведвалі Менск, дапамагалі ва ўсякіх нягодах і сябравалі з нашымі дзецьмі. Для Косціка дядзька Адзік быў найбольшым аўтарытэтам і дарадчыкам ва ўсіх справах, што тычыліся авіямадэлізму і ўсялякага майстравання. І Кастусь, і Аўгіння заўсёды былі вельмі радыя прыезду свайго любага дзядзечкі.

Бронечка добра падтрымліваў нашу сям'ю у час праблем з атаварваннем картак у «дэфіцытных» 1980-х. Яму, адзінокаму, не заўсёды патрэбныя былі рэчы, якія дазвалялася набыць, дык ён купляў іх

для нас. Так мяне ён забяспечыў прыгожымі ботамі, Косціку, які ўжо вучыўся ў Ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, купіў куртку, а любімая дзецьмі каша з татарскіх крупаў (мы ведалі, што так фіны называюць грэчку) з'яўлялася на стале толькі дзякуючы клопатам Бронечкі. Малодшы дзядзька валодаў неардынарным пачуццём гумару: з яго падачы ўсе дзядзькі звалі дзяцей «пяльменнік» і «пяльменніца»; калі малы Косцік дакучаў, то атрымліваў параду: «Зрабі так, каб я цябе доўга-доўга шукаў...», калі злаваўся на хлопчыка, то дакараў: «Не нашага балота чорт!»

Усе браты былі кнігалюбамі, мелі дома вялікія бібліятэкі, былі вельмі начытаныя і цікавыя суразмоўцы. Наш Кастусь успамінае, што калі Бронечка гасцяваў у нас, то нашы размовы часта праходзілі ў шчыльным дыялогу без паўз. У параўнанні з намі ў брата Якуба была больш хуткая рэакцыя, ён імгненна адказваў, ягоныя фармулёўкі былі дакладныя і ёмістыя.

На жаль, ужо праз два гады пасля пераезду ў Менск памёр бацька Адам Мустафавіч (ад хваробы судзінаў ног, якая хутка перайшла ў гангрэну), і 26 лютага 1981 года яго не стала. Пахавалі спадара Адама на мізары ў Іўі, бо там была адзіная ў Беларусі мячэць і можна было ажыццявіць поўны абрад пахавання мусульманіна. На Івейскім мізары з'явілася першае, але не апошняе пахаванне самых блізкіх родных Якуба Адамавіча.

Якуб далучыў свайго меншага брата да татарскіх спраў – у Калінінградзе была створана татарская суполка, яе сябры актыўна пісалі ў «Байрам». Калінінградскі татарын, паэт Наіль Камалетдзінаў зрабіў цудоўныя пераклады з польскай мовы на расейскую крымскіх санетаў Адама Міцкевіча, яны друкаваліся ў часопісе і пасля смерці Якуба Адамавіча. Адам Адамавіч вельмі хацеў пераехаць у Беларусь, бо і Надзея Мацвееўна была з Барысава, беларуска. Аднак пад час аднаго з прыездаў у Беларусь па дарозе з Менска да малодшага брата ў Віцебск у Адама Адамавіча здарыўся інсульт і 20 чэрвеня 2008 года, не выходзячы з комы, ён памёр у бальніцы Талачына. Праводзілі яго ў апошні шлях у Смілавіцкай мячэці родныя і татары з Менска і Смілавічаў. Пахаваны Адам на мізары ў Смілавічах каля магілы Якуба, як ён і прасіў.

Малодшы, Бронечка, нарадзіўся летам у страшны 1943 год за некалькі месяцаў да таго, як згарэла бацькоўская хата ў Камаях. Бацька, трое сыноў і маці з немаўлём на руках апынуліся на вуліцы. На нейкі час, да пераезду ў Відзы, сям'ю прытулілі далёкія сваякі ў Ка-

маях. Рос Бронечка ў цяжкіх умовах, у нястачы, таму быў невысокім і заўсёды, нават у сталыя гады, пераймаўся пра гэта. Ён скончыў сярэднюю школу ў Відзах і паступіў у фінансавы тэхнікум у Менску.

У той час Якуб Адамавіч вучыўся на геаграфічным факультэце. Сярод нашых аднакурснікаў хоць і былі хлопцы пасля арміі ды тыя, хто паступіў, маючы двухгадовы працоўны стаж (што віталася і давала льготы пры паступленні), ён быў гадоў на сем старэйшы за бальшыню з нас, і хлопцы-сябры па інтэрнаце жартам звалі яго «Дзед», на што ён ніколі не крыўдзіўся. Аднак малодшыя студэнты, асабліва дзяўчаты, часам ставіліся да Якуба з недаверам і нават недалюблівалі яго. Прычына была ў тым, што ён быў нязменным і строгім старастам групы фізгеографаў. Акрамя таго, захапляючыся фатаграфаваннем, часам на запрашэнне выкладчыкаў наведваў іх сем'і, каб сфатаграфаваць дзяцей або ўнукаў. На кпіны часта адказваў крыўдным гумарам, дэманстраваў здольнасць абараняць сябе, нібы адгароджваючыся ад крыўднікаў. Відаць было, што яму балюча ад такога стаўлення, і ён, як вожык, выпускаў іголкі. Я не падзяляла такія погляды на старэйшага таварыша і не магу згадаць, каб хоць раз ягоны знішчальны гумар быў накіраваны на мяне. А быў Якуб не толькі старэйшы за нас, але ўжо даволі поўны і не такі спрытны, як мы. Але роўных яму па поспехах у вучобе, у разнастайных ведах і вельмі спрактыкаванай памяці на геафаку тады не было.

Усе дзеці Якубоўскіх набывалі прафесію без бацькоўскай грашовай падтрымкі, разлічвалі толькі на стыпендыю, якую атрымлівалі як старанныя студэнты. Аднак Якуб як нязменны выдатнік з павышанай стыпендыяй у гэтай справе быў апірышчам. Апрача таго, меў пенсію як інвалід па зроку, часта дапамагаў меншаму брату. Аднойчы ва ўніверсітэцкім інтэрнаце на Свярдлова, зайшоўшы да Якуба па нейкай патрэбе, я сустрэлася з Бронечкам. Хлопчык быў насцярожаны, туліўся да брата, было ўражанне, што яму не вельмі ўтульна нават сярод ягоных сяброў. Дзякуючы сваім здольнасцям і старанню стаў добрым фінансістам, быў накіраваны на працу ў Віцебск, дзе працаваў у фінаддзеле гарвыканкама да пенсіі. Сям'і так і не стварыў праз свой, як ён меркаваў, недахоп – малы рост. Шмат чытаў, добра ведаў сучасную літаратуру і гісторыю Беларусі, меў цудоўных сяброў сярод калег. Умеў дапамагаць людзям у складаных варунках і пакінуў па сабе добрую памяць. Апошнім з братоў пайшоў з гэтага свету 8 жніўня 2009 года, пахаваны на гарадскіх могілках у Віцебску.

Браты Якубоўскія вельмі шанавалі сваіх бацькоў, клапаціліся аб іх, і ўдзень, і ўначы не адыходзілі ад хворага бацькі, і пазней ад нямоглай маці. Іх клопаты былі вельмі кранальныя. Я была ўражана такім выпадкам: калі ў 1987 годзе прыйшла вестка, што памёр на рабочым месцы ў Варкуце старэйшы сын Кастусь, дык браты не сказалі пра гэта гора маці. На пахаванне ў Іўе, куды родныя прывезлі яго з Варкуты, паехалі ўсе браты, пакінуўшы мяне з сваёй матуляй і дзецьмі. Мне давялося трымацца, каб не выдаць свайго бедавання, каб маці нічога не западозрыла. Потым браты па чарзе пісалі ёй лісты ад імя старэйшага сына, чыталі іх (сама яна ўжо не магла чытаць), прысылалі грошы таксама ад імя сына. Мне здаецца, што маці, якая ўжо была старэнькай і нямоглай, так і не здагадалася пра няшчасце... Яна таксама знайшла апошні прытулак на Івейскім мізары каля свайго мужа і старэйшага сына, пакінуўшы нас 22 верасня 1989 года.

ХТО ЖАДАЕ, ТАМУ ЛЁС СПРЫЯЕ

Таццяна Якубоўская

Карані і пошукі. У татарскай сям'і Раісы Хасенеўны і Адама Мустафавіча Якуб (Куба) быў чацвёртым дзіцем, але гадаваўся другім, бо двое дзетак да яго памерлі ў раннім дзяцінстве: брацік Сцёпачка, які памёр на трэцім гадку ад хваробы, бо не паспелі давезці да доктара, і сястрычка Раечка. Потым яшчэ нарадзіліся трое хлопчыкаў, і зноў адзін з іх, Аляксандр, не пражыў доўга. Больш ці менш спрыяльнымі і ў дастатку былі даваенныя гады, калі бацька радаваў дзетак, амаль кожны дзень прыносячы з рынку апельсіны ці іншыя ласункі. Якуб за польскім часам скончыў адзін клас, таму праз усё жыццё чытаў і пры патрэбе размаўляў па-польску. Цікава, што ў школе выкладалі Закон Божы, і татарскіх дзяцей, як і габрэйскіх, ксёндз адпускаў з урокаў, бо яны не былі абавязковымі для некаталікоў. Але Якуб часта заставаўся ў класе, на што святар таксама не пярэчыў. З таго часу на ўсё жыццё запомніў «Ойча наш» ды іншыя пацеры.

Ваеннае ліха не абмінула сям'ю Якубоўскіх: у 1943 годзе восенню ў час бою партызан з летувіскім гарнізонам у Камаях згарэла хата, кароўка ў хлеве і ўсё нажытае. Сям'ю прытулілі і падтрымалі, як маглі, далёкія сваякі-татары. Праз некаторы час Якубоўскія пераехалі ў Відзы, што паблізу ад мяжы з Летувой, у старую хату матчынай радні. Пры вызваленні Заходняй Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў за Відзы ішлі ўпартыя баі, фронт не раз праходзіў праз мястэчка.

Местачковыя хлапчукі былі сведкамі ваенных падзей, траплялі ў небяспечныя сітуацыі. У час адной з перастрэлак куля зачапіла скуру на скроні Якуба.

У 1945 годзе забралі ў Чырвоную армію брата Канстанціна (Хасеня). Якуб застаўся ў хаце за старэйшага сына. Пайшоў у школу адразу ў пяты клас. Апаленыя вайной падлеткі да вучобы ставіліся вельмі адказна, вучыліся старанна і з цікавасцю. Якуб вызначаўся здольнасцямі, упартасцю і добрай памяццю. Незадоўга да сканчэння дзесяцігодкі хлопца напаткала бяда: ён атрымаў траўму левага вока, зрэнку назаўсёды закрыла бялъмо. Гэта няшчасце вельмі моцна паўплывала на фармаванне характару і на далейшае жыццё юнака. Тады ён акрэсліў для сябе першую звышзадачу: не толькі не адставаць ад здаровых сяброў у набыцці ведаў і ў культурным развіцці, але і перасягнуць іх.

Пасля заканчэння школы сямейныя абставіны вымусілі Якуба пайсці на свой хлеб. Трэба было дапамагаць сям'і, дзе яшчэ вучыліся два школьнікі і будавалася новая хата, бо старая зусім спарахнела. Працаваў з 1950 года ў розных школах тады Відзаўскага раёна спачатку піянерважатым, потым настаўнікам. Неўзабаве пачаў завочна вучыцца на гістарычным аддзяленні Менскага настаўніцкага інстытута, які існаваў тады пры Менскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага, скончыў яго выдатна ў 1955 годзе ўжо як настаўнік гісторыі. За гады настаўніцтва шмат чытаў, сістэматычна асвойваў поўныя зборы твораў Драйзера, Сервантэса, Талстога, Дастаеўскага, Янкі Маўра, Якуба Коласа і іншых. Захапіўся эсперанта і стэнаграфіяй. Трэніраваў сваю памяць, завучваючы кожны дзень газэлі і рубаі Амара Хайяма, Рудакі, Саадзі, Дэхлеві, любіў кітайскую паэзію. Дасканала ведаў гісторыю Беларусі і Польшчы, гісторыю старажытнага свету Міжземнамор'я і Блізкага Усходу, у антычнасці знаходзіў прыклады для пабудовы ідэальнай дзяржавы будучага. У той час ужо сабраў сваю бібліятэку пераважна з кніг па спецыяльнасці. Думаю, што ўсе свае захапленні ён не хаваў ад вучняў, а, наадварот, прыахвочваў да іх, асабліва старэйшых школьнікаў.

У тыя ж гады сталі відавочнымі сур'ёзныя парушэнні ў рабоце сэрца і абмене рэчываў. Якуб успрыняў гэта таксама вельмі балюча і яшчэ больш зацяўся ў сваім жаданні не саступаць здаровым людзям у працаздольнасці і ведах. І гэтая ўстаноўка разам з уласцівай беларускім татарам-мусульманам добрасумленнасцю, адказнасцю і працавітасцю стала рухавіком яго жыцця. Праз усё жыццё ён вучыўся: пасля Менскага настаўніцкага інстытута ў 1962-м скончыў стацыянарна геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пасля вучобы працаваў у Навукова-даследчым інстытуце глебазнаўства (1962–1967), выконваючы дзяржаўную здымку глебаў у раёнах Беларусі, і завочна вучыўся ў аспірантуры. У 1982 годзе аднавіў вучобу і завочна скончыў Менскі дзяржаўны педагагічны інстытут па спецыяльнасці «гісторыя, грамадазнаўства», у 1989-м – той самы інстытут па спецыяльнасці «беларуская мова і літаратура». І ўсе дыпломы з адзнакай, што, несумненна, вельмі радавала. Жартаўліва ганарыўся тым, што ён быў «самым старым студэнтам педінстытута». Акрамя таго, вучыўся яшчэ па партыйнай лініі, хоць не быў членам партыі, ва Універсітэце марксізму-ленінізму па спецыяльнасці «сацыялогія» і на Рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі кіраўнічых, партыйных і савецкіх кадраў.

Пералік спецыяльнасцяў, што набыў Якуб Адамавіч за сваё жыццё, уражвае сам па сабе. Аднак нельга не сказаць, як ён вучыўся. Па меры асваення чарговага курса наша хатняя бібліятэка напаўнялася поўным наборам падручнікаў для студэнтаў і для школ па спецыяльнасці, якія штудзіраваў ад вокладкі да вокладкі. Кожная курсавая і дыпломная работа ператвараліся ў глыбокае даследаванне накшталт кандыдацкай дысертацыі. Тэмы для іх ён выбіраў сам. Найбольш запомнілася дыпломная работа, прысвечаная Адаму Міцкевічу. Была паднята не толькі ўся даступная ў бібліятэках літаратура на расейскай, польскай і беларускай мовах, але і сабраны копіі ўсіх партрэтаў паэта, ілюстрацыі да выданняў і асобныя творы ў арыгінале, як напрыклад, рэдкі ў нас варшаўскі друк «Sonety krymskie», паэма «Пан Тадэвуш» у цудоўным перакладзе на беларускую мову Язэпа Семяжона з ілюстрацыямі Васіля Шаранговіча. Але найбольшай каштоўнасцю, што ён адшукаў і якая яго вельмі цешыла, былі лекцыі, што чытаў Адам Міцкевіч па славянскай літаратуры ў Парыжы. Якуб Адамавіч зачытваў нам вытрымкі з іх, дзівіўся глыбіні, з якой А. Міцкевіч ведаў і разумеў сучаснае яму прыгожае пісьменства, лічыў, што ніхто не перасягнуў паэта ў даследаванні гэтай дзялянкі творчага духу.

Асобна стаіць аспірантура на геаграфічным факультэце БДУ, якую Якуб скончыў у 1968 годзе. Пад кіраўніцтвам прафесара Заўрыева ён даследаваў тэрмічны рэжым малых азёр на поўначы Беларусі. Да назіранняў далучаліся браты і будучая жонка. Тады ён набыў сваіх верных сяброў сярод студэнтаў – Пятра Бурдыку і Валерыя Ярцава, з якімі не разлучаўся ўсё жыццё, заахвоціў іх да навуковых даследаванняў. Былі выкананы палявыя назіранні тэмпературы па вертыкалі ў тоўшчы вады і па плошчы вадаёмаў на дзясятках стан-

цый на працягу трох гадоў. Усе назіранні былі апрацаваны, пабудавана графіка, напісаны некалькі раздзелаў, кожны памерам як асобная дысертацыя (тут выявіўся ўласцівы яму максімалізм).

Энцыклапедычныя справы. За гады вучобы ў аспірантуры адбыліся падзеі, якія змянілі жыццёвыя арыенціры Якуба Якубоўскага. Ён ажаніўся, нарадзілася дачка, але самае важнае – у 1967 годзе яго запрасілі працаваць у нядаўна створаную Галоўную рэдакцыю Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Энцыклапедычная справа ў Беларусі распачалася фактычна толькі з 1967 года, калі быў створаны калектыў супрацоўнікаў. У яго прыйшлі вядомыя пісьменнікі, навукоўцы, журналісты. Галоўную рэдакцыю ўзначаліў Народны паэт БССР Пятрусь Броўка, тэрміналагічную камісію – Народны пісьменнік Кандрат Крапіва. Калектыў быў ахоплены энтузіязмам, творчым натхненнем. Трэба было выпрацаваць канцэпцыю ўніверсальнага нацыянальнага энцыклапедычнага выдання, бо нічога падобнага ў іншых рэспубліках СССР яшчэ не было. За ўзор магла быць скарыстана толькі 10-тамовая «Малая Советская Энциклопедия», што на той час ужо была завершана ў Маскве ў рэдакцыі «Большой Советской Энциклопедии». Але паўставала мноства пытанняў: якія павінны быць суадносіны беларускага і ўніверсальнага матэрыялу, што можа ўвайсці ў галіновыя раздзелы, як скласці слоўнікі і як іх абмеркаваць з шырокай навуковай грамадскасцю і, канечне, з партыйнымі органамі, як стварыць патрэбныя і арыгінальныя ілюстрацыі і карты, як падабраць аўтарскі калектыў і шмат-шмат іншых. Умовы максімальна магчымай на той час дэмакратычнасці, мяккага кіравання, мінімальных адміністравання і бюракратызацыі, што ўсталяваліся не без уплыву Петруся Броўкі, вельмі спрыялі паспяховай працы. І такі факт, што напачатку галоўны рэдактар займаў кабінет Якуба Коласа, таксама спрыяў наладжванню справы, бо кожны, хто ступаў на вялікі кілім у Коласаўскім кабінеце, быццам бы адчуваў сябе пераемнікам справы Вялікага Песняра.

У 1968 годзе Якуб стаў загадчыкам галіновай рэдакцыі геаграфіі і геалогіі, пазней дадалася геафізіка. Перспектывы ўдзелу ў стварэнні першай беларускай энцыклапедыі захапілі цалкам. У параўнанні з імі аспірантска-дысертацыйныя клопаты падаліся дробязнымі, меркантыльнымі, яны былі забытыя. Якуб Адамавіч па сваіх ведах і вопыту навуковай працы быў добра падрыхтаваны да энцыклапедычнай справы. Ён у пэўны час апынуўся ў патрэбным месцы. І плён гэтай працы радаваў, жыццё перацякала ў тамы выданняў. Спачатку 12-тамовая

ўніверсальная БелСЭ, за якую разам з калегамі ў 1976 годзе атрымаў званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР «За заслугі ў адраджэнні нацыянальнай свядомасці і культуры беларускага народа». Потым на базе гэтага выдання былі зроблены пяцітамовікі «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя» на беларускай і расейскай мовах і «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» таксама ў пяці тамах, якая была любімым стварэннем Якуба Адамавіча, у ёй удалося ўвасобіць свае прынцыпы, сваё бачанне энцыклапедыі аб прыродзе рэгіёну. Начальства, калегі і супрацоўнікі падзялялі амаль усе навацыі загадчыка рэдакцыі і не вельмі абмяжоўвалі ні памер артыкулаў, ні ўсяго выдання. Распрацоўваліся такія артыкулы, якія раней не давала ніводнае энцыклапедычнае выданне. Энцыклапедыя прыроды рыхтавалася разам з рэдакцыяй біялогіі, загадчыкам якой тады быў зямляк Якуба Нарцыс Дзісько. Усе пяць гадоў, пакуль рабілі энцыклапедыю (выйшла ў 1983–1986), найлепшыя вучоныя – геолагі, географы, эколагі і біёлагі з навукова-даследчых і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі – былі згуртаваныя вакол выдання. Яны падсумавалі вынікі сваёй працы па асноўных кірунках рэгіянальных даследаванняў. Фактычна «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» адлюстроўвае стан беларускай прыродазнаўчай навукі сярэдзіны 80-х гадоў XX стагоддзя. Як цяпер бачна, часоў яе росквіту. Потым былі іншыя даведнікі, усяго больш чым на трыдцаці тамах розных энцыклапедычных выданняў стаіць прозвішча Я. А. Якубоўскага, у асноўным як загадчыка галіновай рэдакцыі, гэта значыць, арганізатара і рэдактара ўсіх артыкулаў па профілю рэдакцыі геаграфіі, геалогіі і геафізікі, як яна называлася большы час існавання.

За час працы ў рэдакцыі энцыклапедыі Якуб Адамавіч сабраў багатую ўласную бібліятэку, дзе былі амаль усе патрэбныя яму слоўнікі, як энцыклапедычныя, так і спецыяльныя, статыстычныя зборнікі, навуковыя выданні, што выходзілі ў Беларусі па геалогіі, геаграфіі, эканоміцы ды інш. Ён любіў мець пад рукой усю даведачную літаратуру і, як ніхто, добра ў ёй арыентаваўся.

Якуб часам быў, як кажуць цяпер, нязручным як для начальства, так і для падначаленых. Ініцыятыўны, прынцыповы, працавіты прафесіянал не хітраваў і ніколі не задумваўся, ці на карысць яму самому такія паводзіны. Аднак усе бачылі, што ён дбае толькі аб справе, нідзе не шукае сабе выгады. Для самога Якуба Адамавіча праца ў рэдакцыі энцыклапедыі, акрамя магчымасці найлепшым чынам рэалізаваць свае здольнасці і веды, мела і такі прыцягальны і неабходны для яго адкрытай натуры бок, як магчымасць мець стасункі

з вялікай колькасцю цікавых людзей – аўтараў, рэцэнзентаў, калегаў з аналагічных рэдакцый іншых рэспублік. Кола яго знаёмстваў на той час было вельмі шырокім, з ім, як правіла, ахвотна супрацоўнічалі, а потым нярэдка падтрымлівалі сяброўскія дачыненні.

Энцыклапедычны перыяд працы Якуба Адамавіча доўжыўся 25 гадоў. Якраз на яго прыпалі ўсе гады завочнай вучобы ў ВНУ. Павышэнне сваёй адукацыі і самаўдасканаленне было спосабам жыцця. Клопат пра сваё здароўе лічыў прыкметай дрэннага тону. З цягам часу намножылася стомленасць, адчуваўся душэўны дыскамфорт, як звычайна бывае пры набліжэнні пенсійнага ўзросту. А тут яшчэ ў 1989 годзе на ягоных руках памерла старэнькая маці, якая апошнія 10 гадоў жыла ў сына. Тады ён здзейсніў учынак, які здзівіў і супрацоўнікаў, і начальства: добраахвотна адмовіўся ад пасады загадчыка рэдакцыі на карысць маладога калегі. Аднак крызісны стан духу быў нядоўгім.

Подых Адраджэння. У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў адкрыліся магчымасці для нацыянальнага адраджэння беларусаў і ўсіх народаў, што жывуць на нашай зямлі. Якуб Адамавіч заўсёды адчуваў сябе татарынам, ніколі не хаваў гэтага. Хацеў, каб так адчувалі сябе і яго дзеці: дачка і сын пад яго ўплывам былі запісаны ў першых пашпартах татарамі.

«Volentem ducunt fata, nolentem trahunt» – ахвотнага лёс вядзе, а абыякавага цягне. Якраз тады, калі яшчэ вучыўся на апошнім курсе педінстытута (1989), праз дацэнта філфака М. Ф. Шаўлоўскую пазнаёміўся з татарынам, выкладчыкам з гістарычнага факультэта Ібрагімам Барысавічам Канапацкім. Гэта знаёмства стала вызначальным у яго далейшым жыцці. Якуб Адамавіч знайшоў сабе не толькі паплечніка і аднадумца ў татарскіх справах, але і вернага сябра. Разам абмяркоўвалі планы работы па адраджэнні культурнага і рэлігійнага жыцця ў татарскіх супольнях Менска, Менскай вобласці і ўсёй Беларусі. Шукалі зацікаўленых у гэтай справе татараў, абапіраліся на сяброўства і падтрымку ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі, наладжвалі сувязі з татарамі ў Маскве, Казані, Крыме, Летуве, Польшчы, з студэнтамі з арабскіх краін, што вучыліся ў Менску. Марылі аб адраджэнні менскай мячэці і іншых зруйнаваных мусульманскіх храмаў, бо на той час мячэць у Іўі заставалася адзінай на ўсю Беларусь. Як асабістую трагедыю перажывалі факт нядаўняга вандалізму – разбурэнне Менскага мізара і падрыхтоўку на яго месцы пляцоўкі пад спартыўнае збудаванне.

А неўзабаве з'явіліся першыя добрыя вынікі татарскага руху. У 1989 годзе было створана татарскае грамадска-культурнае аб'яднанне Менскай вобласці, якое пасля было ператворана ў Згуртаван-

не татараў-мусульманаў Беларусі «Аль-Кітаб». Прэзідэнтам яго быў абраны тагачасны дырэктар гімназіі Абу-Бякір Шабановіч, віцэ-прэзідэнтамі – Ібрагім Канапацкі і Якуб Якубоўскі. У красавіку 1991 года выйшаў першы нумар часопіса гэтага згуртавання – квартальнік «Байрам. Татары на зямлі Беларусі» накладам 500 паасобнікаў на беларускай мове. У квартальніку акрэслена кола асобаў і ўстаноў, якія спрыялі з'яўленню часопіса, падтрымлівалі яго. Сярод іх не толькі татары Э. Асановіч, М. Баркоўскі ды іншыя, але і знакамітыя навукоўцы і пісьменнікі Р. Барадулін, А. Грыцкевіч, М. Ермаловіч, Г. Каханоўскі, Ч. Кудаба, М. Ткачоў, К. Тарасаў ды іншыя. Прашу прабачэння, што не ўсіх паважаных сяброў «Байрама» пералічваю, гэта заняло б шмат месца. Складальнік і рэдактар часопіса, якім фактычна быў тады Якуб, у кожным нумары стараўся адзначыць прыхільнікаў і памочнікаў. Пастаяннымі сябрамі рэдактарскай групы і стваральнікамі кожнага нумара часопіса было невялікае кола добраахвотнікаў, сярод якіх, перш-наперш, Ібрагім Канапацкі, тагачасны муфцій Ісмаіл Александровіч, рэдактар выдавецтва «Народная асвета» і паэт Яўген Гучок, філолаг Разалія Александровіч і іншыя энтузіясты.

На той час Якуб Якубоўскі сваё месца і свае мэты ў агульнай справе беларуска-татарскага адраджэння звязваў з гэтым часопісам. Ён заняўся журналісцкай справай: вызначаў тэматыку кожнага нумара, шукаў аўтараў, арганізоўваў усе матэрыялы, пісаў прадмовы. Быў доўгі час і наборшчыкам (друкаваў на нашай хатняй машынцы ўсе артыкулы), і шыхтавальнікам – манціраваў іх у арыгінал-макет, а таксама карэктарам – вычытваў гранкі, і нават экспедытарам – забіраў разам з Ібрагімам Канапацкім з друкарні наклад і распаўсюджваў часопіс. І ўсё гэта рабілася ў хаце, першыя два гады – пасля працоўнага дня і ў выхадныя. Гэта была чыста аматарская справа, можна сказаць, хобі, бо не адзін нумар «Байраму» напачатку выдаваўся за сродкі самога рэдактара і Ібрагіма Канапацкага. З 1995 года набор і макет часопіса рабіў на кампутары запрошаны ў рэдактарскую групу малады татарын Зміцер Чымбаевіч.

У Якуба Адамавіча наўздзіў арганічна спалучаліся глыбіннае імкненне да славы і гіпертрафаваная сціпласць. З выхадам на пенсію ў 1992 годзе прыйшла поўная свабода для рэалізацыі сваіх новых планаў. А яны паволі пачалі пашырацца і станавіцца ўсё больш дзёрзкімі. Узнікла ідэя стварэння энцыклапедычнага выдання «Татары Беларусі, Летувы і Польшчы». З чаго пачынаецца кожная энцыклапедыя, Якуб Адамавіч добра ўяўляў: з слоўніка (рэестра) – ал-

фавітнага пераліку ўсіх тэрмінаў, пра якія будуць артыкулы ў энцыклапедычным даведніку. Веды ж пра татараў Беларусі назапашваліся паступова. Аднаўленне пласта за пластом напаўзабытай гісторыі і культуры свайго народа было магчыма толькі разам з адраджэннем праўдзівай гісторыі беларусаў, сярод якіх 600 гадоў жылі татары, мовай якіх карысталіся, захоўваючы сваю рэлігію, побытавы ўклад і культурныя традыцыі. Лёсы беларускіх татараў і карэннай нацыі нагэтулькі цесна спляталіся, што раздзяліць іх гісторыю аказалася немагчымым. Таму ў слоўнік энцыклапедычнага даведніка па меры працы над ім дадаваліся тэрміны, што, на першы погляд, і не датычылі татараў. Першапачаткова назоў энцыклапедычнага даведніка некалькі разоў удакладняўся і нарэшце трансфармаваўся ў «Энцыклапедыю для беларускіх татараў» («Байрам», 1998, № 1, с. 70). Канцэпцыя яго была выкладзена ўжо ў 1992 годзе ў артыкуле Якуба Якубоўскага «Разважанне пра даведнік аб татарах» («Байрам», 1992, № 2, с. 71), а ў 3-м нумары за той год ужо быў надрукаваны слоўнік энцыклапедычнага даведніка на літару «А» з кароткімі дэфініцыямі. Тамсама апублікаваныя і спробныя артыкулы да гэтага даведніка. Цікава, што пачаў Якуб Адамавіч з артыкула: «АДАМ, першы чалавек, створаны Аллагам, пачынальнік роду чалавечага, прапаведнік і прарок (расул) Аллага...». Гэтым ён быццам сцвярджаў гуманістычны падмурак будучага выдання.

Такім чынам, ужо ў 1992 годзе склаліся новыя прыярытэты ў жыцці Якуба Адамавіча. Асноўныя мэты палягалі ў стварэнні энцыклапедычнага даведніка, напісанні 300 спробных артыкулаў да яго і прадаўжэнні выдання квартальніка «Байрам». Але праца па складанні слоўніка і па напісанні ўзорных артыкулаў для энцыклапедыі ішла не так хутка. Максімалізм і тут замаруджваў справу. Некаторыя раздзелы вымагалі спецыяльнага даследавання, і Якуб Адамавіч з уласцівай яму адвагай распачынаў яго сам. Так, шмат часу патрабавала вывучэнне цюркізмаў у беларускай мове. З паўгода ён правёў у бібліятэках, вывучаючы пытанне, складаючы картатэку паводле «Словаря тюркизмов в русском языке» Е. М. Шыпавай, адшукваючы цюркізмы ў пяцітамовым «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» і ў трохтамовым «Слоўніку беларускай мовы» пад рэдакцыяй М. В. Бірылы ды іншых выданнях. Тады ў хаце з'явілася шматтамовае навуковае выданне «Языки народов СССР». Нарэшце, шмат часу пайшло на складанне самога слоўніка цюркізмаў з паказаннем крыніц, што ўвабраў у сябе больш за 600 слоў. Захапляючыся самім

працэсам даследавання, спадар Якуб зусім не клапаціўся аб публікацыі вынікаў у навуковым друку. Гэты ўнікальны слоўнік цюркізмаў ён часткова надрукаваў у «Байраме» (1995 г., № 4, с. 39–42) ды падараваў яго паслу Турэцкай рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь шаноўнай спадарыні Шуле Сойсал. Поўны пералік цюркізмаў быў апублікаваны Ібрагімам Канапацкім ужо пасля смерці аўтара («Байрам», 1999, № 3, с. 71–76).

І такіх праблем было нямала. Спробныя артыкулы не ўсе рабіў Якуб Адамавіч, але якія рабіў, то з максімальным ахопам праблемы. Такім быў артыкул «Жыта», бо ён справядліва лічыў гэтую культуру асновай існавання людзей на беларускай зямлі, укладаў душу і ў цыкл артыкулаў пра пчалярства (бортніцтва). Аднак знайсці цяпер, якія артыкулы зроблены самім Якубам, немагчыма, бо ён не лічыў дапушчальным нават пазначаць сваё аўтарства. Наогул, усё жыццё Якуб Адамавіч трымаўся правіла, што свае добрыя справы мусульманін не павінен афішаваць, калі ён робіць іх патаемна і бескарысліва, то яны прыносяць людзям найбольш дабра.

Аднак сваёй грамадзянскай пазіцыі не хаваў. Выказваў яе і палкай прамовай на мітынгу ў абарону свабоды чачэнскага народу і на іншых мітынгах, на якіх звычайна трымаў у руках бел-чырвона-белы з маладзіком сцяг беларускіх татараў, і наўмыснай адсутнасцю на афіцыйных урачыстасцях з нагоды 600-годдзя пасялення татараў на землях Вялікага Княства Літоўскага, асцерагаючыся нейкай прыкрасці ад афіцыёзу. Так яно і сталася: на тых урачыстасцях не гучала беларуская мова. Сваю любоў да Бацькаўшчыны выказаў у словах гімна беларускіх татараў «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі».

Пры падрыхтоўцы «Байрама» вымагалі ўвагі ўсе рубрыкі: і сталыя, што былі ўведзены ад першага нумара, і новыя, што з'явіліся з часам. Іх трэба было пастаянна фармаваць, дамаўляцца з аўтарамі, што былі занятыя на працы, нагадваць ім пра тэрміны падрыхтоўкі, ездзіць па гатовыя матэрыялы. Такімі матэрыяламі былі пераклад Кур'ана на беларускую мову, крымскататарска-беларускі слоўнік, беларуска-рускі слоўнік татарскіх імёнаў, стравы татарскай кухні ды шмат іншых. Ён прапаноўваў шмат якія цікавыя тэмы для публікацыі ў квартальніку і абавязкова знаходзіў выканаўцу сваёй задумы. Так на старонках «Байрама» былі надрукаваны артыкулы пра менталітэт, беларусазнаўства ды іншыя, быццам не татарскай тэматыкі, але цікавыя для сучаснікаў.

Пісаць пра ягоную працу над часопісам можна бясконца, яна захапляла Якуба, хоць ён і імкнуўся часам вызваліцца ад яе на карысць энцыклапедычнай. Але да апошніх дзён не пакідаў яе. Здабыткі і хібы гэтай працы грунтоўна даследаваў Леанід Лыч («Байрам», 1999, № 1).

Аб прадмовах да кожнага нумара квартальніка хочацца сказаць асобна. Якуб звычайна доўга над імі думаў, шукаў тэму, хоць гэта быў нібыта звычайна агляд найважнейшых падзей у свеце, перадусім у мусульманскім, і ў Беларусі. Але заўсёды прысутнічаў ляйтматыў, галоўная думка, якая даводзілася чытачу мякка, як у пропаведзі. Возьмем, да прыкладу, хаця бы апошнюю, у № 1 за 1998 год. Пачаўшы з уласцівасці чалавечай памяці захоўваць толькі найбольш яскравыя, святочныя эпізоды жыцця, аўтар пераходзіць да вечных пытанняў: для чаго жыве чалавек, у чым яго шчасце. Для яго гэтыя пытанні спалучаныя, бо ён лічыў, што чалавек прыйшоў на зямлю для шчасця. «Шчасце прыходзіць да кожнага чалавека, толькі не ў кожнага яно жыве доўга...». І ўрэшце, як акорд усяго яго жыцця: «Вялікае шчасце быць здаровым, мець добрых дзяцей, выконваць свой абавязак – абавязак мусульманіна». Свой грамадзянскі абавязак Якуб Якубоўскі выканаў, ды здароўя ўжо не было, але дзеці – дачка і сын – радавалі сваімі поспехамі, чулым стаўленнем, мэтанакіраванасцю, працавітасцю і шчырасцю.

Засталіся таксама цікавыя артыкулы, падрыхтаваныя Якубам да «Мусульманскіх календароў» за 1996–1998 гады. Для аднаго ён склаў дванадцаць нарысаў пра знакамітыя мячэці свету, для другога – пра найбуйнейшыя арабскія краіны, дзе вызнаюць іслам. Усё, што рабіў гэты чалавек, было зроблена грунтоўна і сумленна. Працаваў ён хутка, не адкладаючы справы. Чакаў такой жа працы і ад іншых. Таму за апошнія шэсць гадоў свайго жыцця зрабіў так многа, што хапіла б на цэлае жыццё пры іншых, жыццезберагальных тэмпах. За гэтыя гады знайшоў новых сяброў, яны яму трапляліся ў падарожжы, як дырэктар школы з Нальшчаншчыны Уладзімір Прыхач, або знаходзіліся па газетных публікацыях, як Міхась Маліноўскі, да якога Якуб Якубоўскі сам паехаў у Баранавічы, каб пазнаёміцца, і з якім потым часцей, чым з іншымі, ліставаўся. Адметнай рысай натуры Якуба была лёгкасць і прыязнасць у дачыненні з людзьмі. Знаёмства вельмі часта пераходзіла ў адданае сяброўства на ўсё жыццё. Так, аднойчы сеўшы пад час уступных іспытаў на завочнае аддзяленне геафака Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта за адзін стол з былым ваенным лётчыкам Георгіем Святловічам, ўжо ніколі не

перарываў з ім стасункаў, і для ўсёй яго сям'і «Юра Нясвіжскі» (кажуць, паходжаннем з роду Радзівілаў) і яго сямейнікі сталі лепшымі сябрамі.

Быў вельмі шчаслівы, калі спадары Анатоль Белы і Анатоль Грыцкевіч ўручылі яму і Ібрагіму Канапацкаму дарагую ўзнагароду «За выданне на беларускай мове квартальніка беларускага згуртавання татараў-мусульманаў "Байрам" і актыўны ўдзел у татарскім і беларускім нацыянальна-культурніцкім адраджэнні» – медаль Міколы Шчакаціхіна з надпісам «За братэрскае спрычыненне ў развіцці культуры і навукі Беларусі» і адпаведны дыплом з занясеннем імя ў кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь».

Мэты дасягнутыя. У красавіку 1998 года Якуб Адамавіч дадрукаваў на хатняй машынцы апошнюю старонку слоўніка (рэестра) «Энцыклапедычнага даведніка для татараў Беларусі» – 10 000 тэрмінаў з дэфініцыямі. Верыў, што «напісанае – застаецца» і прыйдзе час, калі яго справа будзе запатрабаваная, і ў роднай яму рэдакцыі «Беларускай энцыклапедыі» на падставе слоўніка будзе створана татарская энцыклапедыя. Быў складзены таксама і кароткі варыянт слоўніка на 3000 тэрмінаў. Перакладзены на беларускую мову рэцэпты 500 татарскіх страў. Напісаны і выйшлі ў «Байраме» апошнія 12 з 350 спробных артыкулаў для энцыклапедыі.

Аднойчы травеньскім вечарам Якуб Адамавіч паставіў кропку пад кулінарнымі перакладамі, адкінуўся ў крэсле і сказаў: "Усё! Выканаў!". Мы парадаваліся разам, нічога не прадчуваючы. Справы жыцця былі прыведзеныя ў парадак, мэты дасягнутыя. Можна было адпачываць першы раз за многія гады. Аднак наканавана было іншае... У чэрвені хутка і загадкава пачала прагрэсаваць хвароба, думалася, язва. Аднак дыягназ прагучаў у канцы ліпеня як прысуд. Я жахнулася ад усведамлення, што яго чакае тое самае, ад чаго памёр і бацька... Лекары не пакідалі ніякай надзеі, гэтак запушчаная была хвароба. Бальніца толькі пагоршыла стан хворага. Пераносіў страшэнны боль моўчкі і сябрам не падаваў нават знаку, як яму блага. Ніхто не верыў, што ўжо нічога нельга зрабіць, так мужна, нават жартуючы, ён адыходзіў... За месяц да канца напісаў цвёрдай рукой для родных памятку «Як хаваць мусульманіна» з падрабязным апісаннем мусульманскага абраду... За 10 дзён да адыходу, седзячы за сталом, перакладаў з польскай мовы артыкул Яна Сабалеўскага. А сілы пакідалі: «Не магу», – прызнаўся з горыччу. На той недапісанай старонцы памылкі ўжо амаль у кожным няроўным слове...

14 верасня 1998 года Якуб Якубоўскі пайшоў з гэтага свету. Сябры-мусульмане з вялікай пашанай пахавалі яго на старажытным мізары ў Смілавічах. Каля магілы, абкладзенай паводле татарскага звычаю каменьчыкамі, праходзіць сцяжынка, і кожны, хто ідзе па ёй, спыняецца тут. Хто можа, чытае малітву, хто проста маўчыць у задуменні, прачытаўшы на камяні «Аллагу належым і да яго вяртаемся».

Плён справы Якуба Якубоўскага належыць не толькі яго нашчадкам, як крэўным, так і духоўным, але і ўсяму татарскаму і беларускаму люду. Яго сын Канстанцін Якубоўскі часткова ажыццявіў няздзейсненую пры жыцці бацькі мару аб выданні электроннай версіі часопіса і вядзе сайт *www.jurnal_bayram.ru* «Байрам. Татары на зямлі Беларусі», на якім можна знайсці ўсе нумары часопіса і матэрыялы пра яго рэдактараў Якуба Якубоўскага і Ібрагіма Канапацкага, а таксама азнаёміцца з слоўнікам «Энцыклапедыі для беларускіх татараў» ды іншымі нарысамі.

Калі справы адпавядаюць высокім мэтам і служаць развіццю грамадства, абуджэнню духоўнасці, калі ў падмурку такіх спраў – ахвярнасць, то іх творца – Асоба. Якуб Якубоўскі – Асоба. У яго быў талент арганізоўваць сваё жыццё дзеля высокай мэты. Была здольнасць падпарадкоўваць гэтай мэце ўсю абсяжную прастору, натхняць і мабілізоўваць дзеля яе ажыццяўлення родных, блізкіх і знаёмых. Быў талент знаходзіць цікавых людзей і заахвочваць іх да ўдзелу ў сваёй справе. Былі добрасумленнасць, працавітасць і бескарыслівасць.

Апошнім часам Якуб няраз казаў сыну, што жыць трэба так, як вучыць мудрасць з крымскататарскай легенды пра Сокала і Вужа (што мы ўсе чыталі ў М. Горкага), каб пра цябе і казкі маглі расказаць нашчадкі, і песні праспяваць. Сам ён таксама стварaў казкі-легенды. Адна з іх – пра тое, што гісторыю можна паправіць, аднавіць справядлівасць. Ён шчыра верыў, што па дамоўленасці паміж Польшчай і Беларуссю можна вярнуць выкрадзеную каралеўскую карону, якую везлі ад папы рымскага на каранаванне Вітаўта Вялікага. Трэба змайстраваць такую самую карону, прывезці яе ў Горадню, у замак Вітаўта, і там наладзіць урачыстую каранацыю. І тады ўжо Вітаўт Вялікі заўсёды будзе згадвацца як кароль нашага гаспадарства. Пра гэта і напісаў у «Запавеце старога татарына». Засталася і песня – гімн татараў Беларусі «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі». Таму справа Якуба Якубоўскага, справа Асветніка і Рупліўца адраджэння душы татарскага і беларускага народаў засталася з намі на зямлі і будзе жыць, пакуль жыць будуць яго нашчадкі па крыві і духу.

НАТАТКІ ЯКУБА ЯКУБОЎСКАГА

ВІДЗАЎСКАЙ ШКОЛЕ – 500 ГАДОЎ*

Летась у нашай газеце быў змешчаны артыкул пад назвай «Унікальны юбілей», у якім, спасылаючыся на працу сучаснага польскага гісторыка-даследчыка Е. Ахманьскага «Старажытная Літва», аўтар паведамляе аб тым, што сёлета Відзаўская школа мае права адзначыць сваё 500-годдзе. З часу публікацыі матэрыялу музей шукае дакументальнае пацвярджэнне прыведзеных у названай кнізе звестак аб тым, што ў 1498 годзе ў Відзах была заснавана парафіяльная школа. А пакуль газета пачынае друкаваць цыкл матэрыялаў жывой гісторыі, прысвечаных гэтай навучальнай установе. Адкрываюць яго ўспаміны выпускніка 1950 года Якуба Якубоўскага.

У дзясятым класе нас было дванаццаць: Амброжа Гульбінскі, Антон Фядотаў, Вячаслаў Цвячкоўскі, Леанарда Будрэвіч, Меля Панятоўская, Мечыслаў Прэдкель, Паша Карунная, Пеця Шыман, Рая Біруліна, Саша Бірулін, Фаня Біруліна і Якуб Якубоўскі.

Па дзіўным супадзенні прозвішчы, імёны і імёны па бацьку памятаю таксама толькі дванаццаці настаўнікаў. Гэта Ганна Спірыдонаўна Біруліна, Ганна Юр'еўна Канавалава, Глафіра Антонаўна Статут, Алена Спірыдонаўна Біруліна, Іосіф Мікалаевіч Райскі, Марыя Васільеўна Савічава, Пётр Аляксандравіч Кога, Сяргей Львовіч Адамовіч, Спірыдон Ігнатавіч Бірулін, Сцяпан Рыгоравіч Троцкі, Цімафей Рыгоравіч Кручак і Фаіна Сямёнаўна Соніна.

Астатніх – каго па імені, каго па прозвішчы, каго па яркіх рысах характару.

У верасні 1944-га ў школу прыйшлі ўсе, хто хацеў вучыцца. Кожны вучань сам выбіраў сабе клас, для якога, меркаваў, у яго хапае падрыхтоўкі. Я пайшоў у 4-ты. Сярод аднакласнікаў быў пераросткам. Вучыўся добра. І калі ў школе неўзабаве адкрылі 5-ты клас, перавёўся туды і прыжыўся.

---

* Артыкул апублікаваны ў газеце «Браслаўская звязда» (1998, люты).

Усе мы чыталі дрэнна. А расейская хрэстаматыя была толькі ў настаўніка Варапаева (хай даруе мне, што памятаю толькі прозвішча). Таму хатнія заданні ён нам даваў па газеце. Трэба было навучыцца чытаць пэўныя артыкулы з яе. А з падручніка вучылі на памяць вершы, якія павінен быў прадэкламаваць кожны. Бяда чакала таго, каго выклікалі першым. І лягчэй было апошняму. Праслухаўшы ўсіх аднакласнікаў, нешта запамінаў і сам мог ужо адказаць на тройку. Нават цяпер я магу прачытаць на памяць многія з тых вершаў.

Затое першая настаўніца батанікі запомнілася тым, што так і не навучыла нас адрозніваць люцік едкі ад люціка паўзучага, ды іншымі недарэчнасцямі. На наша шчасце, яе замяніла Г. С. Біруліна, якую мы палюбілі шчыра і на ўсё жыццё. Яна добра ведала свой прадмет, а яшчэ – нямецкую мову. Многа вадзіла нас па наваколлі. У час такіх урокаў-экскурсій лягчэй засвойвалася праграма, а «Аннушка», як мы яе звалі за вочы, станавілася ўсё больш любімай і паважанай.

Яшчэ ішла вайна, і дырэктара школы ізноў прызвалі ў армію. На яго месца прыслалі Ф. С. Соніну. Па складзе характару ёй было ўласціва браць на сябе самую цяжкую работу. Гісторык па адукацыі, яна ўзялася выкладаць нават фізіку. Умела абыходзіцца з сякерай і пілой.

Мінулыя з той пары гады зрабілі сваё. Многае ўжо бачыцца і ўспрымаецца інакш, чым тады. Гэта цяпер я думаю, што лес для ацяплення школы можна было выдзяляць паблізу, а не за 8–10 кіламетраў ад гарадскога пасёлка. А тады мы ўзбройваліся сякерамі і піламі і ішлі да вёсак Раташалі ці Блажышкі, непадалёку ад якіх і назапашвалі дровы. Працавалі да вечара. Але нашы педагогі не забываліся тут жа, ля вогнішча, падвесці вынікі работы па класах, пахваліць лепшых.

Знаходкай для школы і падарункам для вучняў быў прыход у калектыў Сяргея Львовіча Адамовіча. Ён не толькі, як прынята гаварыць, даваў нам веды, але і выхоўваў. Вучыў нас абавязковасці і працавітасці. Сам быў ва ўсім для нас прыкладам.

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй у школу прыйшлі П. А. Кога і С. Р. Троцкі. Пётр Аляксандравіч служыў афіцэрам у Войску Польскім, куды быў пасланы для ўмацавання камандавання. Некалькі гадоў ён хадзіў на працу ў вайсковым мундзіры. І не таму, што яму падабаліся гузікі з арламі. У настаўніка не хапала грошай, каб купіць сабе новы цывільны касцюм. Яшчэ была картачная сістэма. На працаўніка-службоўца прадавалі 400 грамаў хлеба, на ўтрыманца – 300.

Пасля атаварвання картак у нашага настаўніка хапала грошай яшчэ на дзясятак кілаграмаў збожжа, якія дакуплялiся на рынку. Таму жыў сціпла, але не дазваляў сабе хітраваць, нешта ўзяць у нашых бацькоў. Гэтай сумленнасцю ды арыгінальнай методыкай выкладання ён і запомніўся. Задачы прыдумваў сам, зразумелыя нам па сэнсе. Мы не ламалі галовы над абстрактнай трубой, з якой выліваецца вада, і над хуткасцю цягнікоў, што выйшлі з пункта А ў пункт Б. У задачах дзейнымі асобамі былі самі, і таму лёгка спраўляліся з іх рашэннем. Пазней я даведаўся, што вучыў нас настаўнік індукцыі. А якім майстрам ён быў! Вельмі многае ўмеў рабіць сваімі рукамі. У прыватнасці, з ахвотай вучыў нас фатаграфіі. Захапленне ёй у мяне засталося на ўсё жыццё.

Свой след у развіцці школы пакінуў С. Р. Троцкі. Да яго вайсковую справу выкладалі афіцэры з ваенкамата. Адзін – тапаграфію, другі – стралковую зброю. Сцяпан Рыгоравіч арганізаваў сістэматычнае вайсковае навучанне, а таксама заняткі фізкультурай. Менавіта пры С. Р. Троцкім наша школа трапіла ў лік найлепшых па спорце.

Прыкладна ў 1947 годзе Пётр Аляксандравіч і Сцяпан Рыгоравіч купілі веласіпеды, ці, як іх называлі тады, – веламашыны. І хоць гэта была на той час дарагая рэч, настаўнікі дазвалялі і нам на іх паездзіць.

Пасля таго, як Фаіну Сямёнаўну перавялі на работу ў рэдакцыю раённай газеты, дырэктарам школы стала Ганна Юр'еўна Канавалава. Пра яе скажу толькі, што была гэта вельмі валявая жанчына, якая ў няпросты пасляваенны час імкнулася, каб настаўнікі і вучні мелі добрыя ўмовы для працы і вучобы. Пры ёй школе было прысвоена імя 30-годдзя БССР (так напісана і ў маім атэстаце), пра што многія ўжо забыліся ці наагул не ведаюць.

Па-рознаму склаліся лёсы былых настаўнікаў і вучняў Відзаўскай школы. Сярод іх багата людзей, вартых памяці. І падрыхтоўку да такога вялікага юбілею калектыў настаўнікаў і вучняў мог бы скарыстаць для напісання гісторыі школы не толькі ў дакументах, але і ў асобах.

3. Якубоўскі.

ЦЮРКІЗМЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Беларуская мова належыць да самых развітых і мілагучных моваў свету. Хораша аб ёй гаварыў сын беларускай зямлі Адам Міцкевіч, ён ведаў некалькі моваў і меў з чым параўноўваць мову сваёй Бацькаўшчыны.

Ні адзін народ не жыве ізалявана ад іншых, хіба толькі на акіянічных выспах, таму ў розны час і з розных прычын у кожную мову ўлучаюцца іншамоўныя словы. Бывае, што гэтыя «чужакі» так прыжываюцца, што толькі мовазнаўцы-этымолагі могуць адказаць, адкуль і калі буда, качарга, кабан сталі ў нас сваімі словамі.

У «Слоўніку іншамоўных слоў», які склаў славуты беларускі мовазнавец, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі Аляксандр Мікалаевіч Булыка, змешчана тлумачэнне 5600 слоў, запазычаных з іншых моваў. Сярод іх ёсць таксама запазычанні з цюркскіх моваў – татарскай, турэцкай ды іншых. Часам да цюркскіх запазычанняў умоўна далучаюць арабскія, персідскія, нават вугра-фінскія словы, калі яны перайшлі не наўпрост з гэтых моваў у беларускую, а ў выніку перадачы іх туркамі і татарамі.

Славуты беларускі вучоны, акадэмік Пецярбургскай акадэміі навук Яўхім Карскі, аналізуючы беларускую лексіку, указаў на словы цюркскага паходжання і даў невялічкі слоўнічак іх.

Вось гэтыя словы.

Андарак, абакуліваць, багатыр, ба́йда, ба́каць, бакун, балаба́н, баламут, барыш, бугай, буза, дурань, ёлуп, кабан, калі́та, калека, камяга, кандалы, канчук, капкан, каптан, капшук, каўпак, качан, кіндзюк, кубары, кукла, курган, літаўр, люлька, небажа́, пасталы, разбазарыць, рахманы, тавар, таган, торба, тытунь, учкур, хадзяін, харч, чайка, чарга, чугай, чыгун, шапка.

А. М. Булыка ў сваёй кнізе «Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст.» (Мінск, 1980) падае больш за 4000 адзінак, якія даўно праніклі ў беларускую мову. З іх слоў цюркай лексікі – 186. У пазнейшыя часы праз расейскую і польскую літаратуру ў выніку непасрэдных кантактаў беларусаў з цюркамоўнымі людзьмі прыходзілі ў Беларусь і іншыя словы, пераважна назвы канкрэтных прадметаў і з'яў.

Вялікі ўклад у вывучэнне цюркіх слоў, якія ўжываюцца ў Беларусі, зрабілі доктар філалагічных навук А. К. Антановіч, член-карэспандэнт НАН Беларусі А. І. Жураўскі, дактары філалагічных навук В. У. Мартынаў, А. Я. Супрун ды іншыя.

«Словарь тюркизмов в русском языке», складальнік Шыпава Лізавета Мікалаеўна, пад рэдакцыяй акадэміка АН СССР А. М. Конанава (Алма-Ата, 1976) змяшчае больш за 2000 слоў цюрцкага паходжання, што ўжываюцца ў расейскай мове і якія беларусы разумеюць.

Я прасачыў, якія словы з слоўніка Е. М. Шыпавай трапляюцца ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (Мінск, Т. 1–5, 1977–1984), у якім пазначаны запазычаныя, у т. л. цюрцкія словы.

«Слоўнік беларускай мовы», які выдала ў 1987 годзе «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (пад рэдакцыяй акадэміка М. В. Бірылы), зафіксаваў 118 000 слоў, што бытуюць ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Тут надрукавана больш за 650 слоў, якія паводле слоўніка Е. М. Шыпавай лічацца словамі цюрцкага паходжання – колькасць цюркізмаў у беларускай мове ў тры разы меншая, чым у рускай мове.

Думаю, што беларускім татарам будзе цікава пазнаёміцца з усімі гэтымі словамі, з паняццямі, якія яны азначаюць. Каб не абцяжарваць «Байрам», колькасць старонак якога абмежавана, у гэтым артыкуле змешчаныя толькі тыя словы, якія ўмоўна можна палічыць звязанымі з паняццямі пра жывыя арганізмы, утрыманне жывёл і стравы з жывёльных прадуктаў.

А

Айрон – кіслае малако, разбаўленае вадой; **арба** – высокі двухколавы ці чатырохколавы воз; **аргамак** – высокі імклівы конь, **аркан** – вяроўка з рухомай пятлёй для лоўлі статкавых жывёл; **архар** – горны баран у Цэнтральнай Азіі; **атара** – статак авечак.

Б , В

База – абгароджанае месца для жывёлы; **байбак** – стэпавы грызун; **баклан** – прыморская птушка; **балык** – вэнджаная чырвоная рыба; **баран** – самец авечкі; **барс** – драпежны звер з сямейства каціных; **барсук** – драпежны звер з сямейства куніцавых; **беркут, біркут** – драпежная птушка з сямейства ястрабавых; **біцюг** – конь-цяжаравоз; **бугай** – племянны бык; **вогер** – жарабец; **воя** – кастрыраваны бык.

Г

Газель – жывёла з падсямейства сапраўдных антылопаў; **гогаль** – вадаплаўная птушка падсямейства качыных; **гурт** – статак аднаго віду жывёлы.

Д, Е, Ж, І

Джэйран – жывёла з падсямейства сапраўдных антылопаў; **джут** – масавая гібель жывёлы ад бяскорміцы зімой; **драфа** – стэпавая птушка сямейства жураўлепадобных; **ез, яз** – перагародка на рацэ для затрымання рыбы, **жэмчуг** – каштоўнае перламутравае рэчыва, перлы; **ірбіс** – драпежнік, снежны барс; **ішак** – свойскі асёл.

К

Кабан – самец свінні, дзікая свіння, вепр; **ка́барга** – парнакапытная жывёла з сямейства кабаргавых; **казарка** – вадаплаўная птушка сямейства качыных; **камса, хамса** – дробная марская рыба з сямейства селядцовых; **кантар** – аброць для жарабца; **капкан** – паляўнічая звералоўная пастка; **каравайка** – птушка з сямейства кулікоў; **караван** – група ўючных жывёлаў, якія перавозяць грузы і людзей у пустыні; **каракуль** – шкурка ягняці; **каракульча** – шкурка ягняці ва ўтробе авечкі; **каракурт** – ядавіты павук; **карась** – рыба з сямейства карпавых; **карга** – варона; злая, шкодная; старая; **ка́ры** – масць каня; **качка** – вадаплаўная птушка; **кібітка** – вазок на палазах; **каза, казёл** – дробная свойская рагатая жывёла; **каланок** – драпежны футравы звярок; **карса́к, корсак** – стэпавы ліс; **касяк** – гурт кабыл з адным жарабцом; **каўбаса, кілбаса** – прадукт харчавання з мяснога фаршу; **каўтун** – хвароба валасоў; **качаваць** – весці неаселы спосаб жыцця; **кашара** – стойбішча для авечак; **кізяк** – гной для паліва; **кіндзюк** – кішкі, бруха; **кулан** – дзікі асёл; **кумыс** – пажыўны напітак з малака кабылы; **курдзюк** – тлушчавы нарост у авечкі.

Л, М, Н

Лашак – помесь асла і кабылы; **ляляк** – белая чапля; **мажара, мажары** – доўгі воз; **марал** – высакародны алень, ізюбр; **маштак** – маларослы конік; **муксун** – сібірскі сіг; **мурэна** – марская драпежная рыба; **нагайка** – кароткая цяжкая плётка.

П, С

Плоў – страва з мяса і рысу; **пустальга́** – драпежная птушка, **сабака** – свойская жывёла; **сазан** – рыба з сямейства карпавых; **сайгак** – стэпавая жывёла з падсямейства сапраўдных антылопаў; **сапсан** – драпежная птушка; **саранча** – насякомае падсямейства саранчовых; **сарыч** – драпежная птушка з ястрабавых; **саф'ян** – выпрабленая казліная скура; **слон** – буйная сысуновая жывёла; **судак** – рыба з сямейства акунёвых; **султанка** – курка, паляўнічая птушка; **сурок** – стэпавы грызун; **сычуг** – частка страўніка жвачных жывёл; **сяўруга** – чырвоная рыба з асятровых.

Т, У, Х

Табун – конскі статак; **тавар** – буйная рагатая жывёла; **таракан** – род насякомых; **тарбаган** – грызун з сямейства суркоў; **тарпан** – дзікі конь; **таўро** – кляймо, метка на жывёле; **тузлук** – расол для салення рыбы; **тук** – растоплены тлушч; **тумак** – заяц, помесь беляка з шараком; **турач** – каўказская горная курапатка; **турухтан** – балотная птушка з сямейства бакасавых; **туша** – асвежаванае і выпатрашанае цела забітай жывелы; **тушканчык** – невялікі норны грызун, земляны зайчык; **тырла** – месца для жывёлы ў гарачыню і ўначы; **хамут** – частка конскай вупражы; **хамса** – тое, што камса; **хамяк** – стэпавы грызун; **уюк, юк** – пакунак для перавозкі на спіне вярблюдам, канём, аслом; **цяля, цялё** – дзіця каровы; **цярпуг** – марская рыба.

Ч, Ш, Ю

Чабан – пастух авечага статка; **чайка** – род птушак сямейства чайкавых, жыве пры вадаёмах; **чапрак** – пакрыццё для каня; **чучала** – пудзіла ці ўпрыгожанне, зробленае са шкуры звера, птушкі, рыбы ды інш.; **чырок** – невялікая качка; **шакал** – драпежнік сямейства сабачых; **шамая** – рыба з сямейства карпавых; **шашлык** – страва са смажанага мяса; **югурт** – кіслае малако; **юрага** – падонкі канаплянага алею; **юхт, юхта** – выпрабленая скура гавяды.

«Байрам», 1995, № 4, с. 39–42

ЗАПАВЕТ СТАРОГА ТАТАРЫНА

У імя Аллага Літасцівага, Міласэрнага

Мой дзед Мустафа (Сцяпан) родам з татарскай вёскі Немеж, што каля Вільні. Ён у 1897 годзе быў ужо дзецюком і памятае: татары тады, у 500-годдзе пасялення ў Вялікім Княстве Літоўскім, клапаціліся пра тое, каб перамагла справядлівасць і Вітаўта прызналі каралём, бо ён быў абраны на гэтую пасаду, але па віне нядобрых людзей не атрымаў кароны. Татары казалі, што каб яны былі ў эскорце, калі везлі сімвалы каралеўскай улады, якія перадаў папа Марцін V (памёр у 1431), то яны даставілі б іх па прызначэнні. Гісторыя ведае выпадак, калі татары выратавалі караля Рэчы Паспалітай ад смяротнай небяспекі. Толькі тады татары не змаглі гучна сказаць, чаму Гаспадар, Ваттад, Хан Вітаўт, як яны яго называлі, не быў прызнаны каралём.

Дзед мне казаў: «Можа, ты дажывеш да таго часу, калі будуць разумнейшымі правіцелі і пра Вітаўта можна будзе гаварыць як пра караля. Скажы аб гэтым, бо тады і татары з гонарам скажуць, што нас запрасіў на службу кароль Вітаўт».

Стала вольнай Летува, стала вольнай Беларусь. На пасадзе рымскага папы – паляк. Ён разумее, што калісьці была нанесена вялікая крыўда, у выніку якой Вітаўт не атрымаў кароны.

Татары Беларусі, татары Летувы, свядомыя беларусы выкажуцца за тое, каб праўда, справядлівасць нарэшце перамаглі. Можа быць, татары Польшчы і не могуць выказацца за гэтую прапанову, бо іх не зразумеюць некаторыя палякі.

А ці трэба такі акт? Даўно было...

Толькі гісторыкі могуць згадаць, як была спалена Жана д'Арк, абвінавачаная ў вядзьмарстве, але цяпер ужо лічыцца святой. Пасля смерці і не адразу генерал французскай арміі Дэлятур дэ Тасін'і быў абвешчаны маршалам Францыі.

Калі будуць рабіць карону, якую ў пачатку XV стагоддзя па тагачаснай традыцыі даваў каралям папа, то я думаю, што ў знак павагі для яе прыгожы рубін падаруюць беларускія і летувіскія татары.

Няхай у канцы XX стагоддзя запануе праўда і згода!

СЛОВА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВІТАЎТА ПЕРАД ТАТАРАМІ Ў 1397 ГОДЗЕ*

Вялікі хан каралеўства Дэшт-і-Кыпчак – Залатой Арды, высакародны чынгізід Тахтамыш, сын Туй-Гаджы! Батыры-воіны, святары, паспаліты люд!

Я, Вялікі князь Вялікага Княства, сын Вялікага князя Кейстута і ўнук Вялікага князя Гедзіміна, няхай ім будзе рай прасветлы, з вялікай радасцю і задавальненнем звяртаюся да вас з прапановай заключыць дамову, угодную Богу, карысную нам, маёй дзяржаве, выгадную для вас.

Вялікая, багатая і прыгожая мая краіна. Бог даў нам усе выгоды, каб наш мужны, працавіты і добры народ мог жыць у дастатку, бо лясы нашы багатыя на дзічыну, на борці, дзе шчыруюць меданосныя пчолы, рэкі і азёры нашы багатыя на рыбу, пашы і сенажаці даюць корм для свойскай жывёлы, урадлівыя нівы забяспечваюць нас збожжам, і ў нас заўсёды ёсць хлеб.

Адно толькі дрэнна, што суседзі нашы не выконваюць Божыя запаведзі: не пажадай дабра бліжняга, не забі чалавека. Яны драпежна нападаюць на нас, і нам трэба бараніцца ад рабавання святыняў, гвалту і злачынстваў іх.

Я ведаю ваш ваяўнічы і сумленны народ, які ўмее карыстацца зброяй і цвёрда выконвае дамову з саюзнікам, спадзяюся, што ў імя агульных інтарэсаў мы будзем дзейнічаць разам супраць ворагаў, баронячы сваіх бацькоў, жанчын і дзяцей.

Ад свайго бацькі я чуў пра Акмянскую бітву з крыжакамі, калі вашы воі, якія былі ў складзе войска Кейстута, мужна змагаліся з ворагам.

Ведама мне і пра тое, што паміж нашымі народамі не заўсёды былі мірныя адносіны. Але пра бітву на Сініх Водах можна ўжо і забыць, бо зайшла даўнасць, больш за трыццаць гадоў.

---

* Напісана да 600-годдзя пасялення татараў-мусульманаў на землях Беларусі. Так Якуб Якубоўскі ўяўляў (паводле гістарычных крыніц) зварот Вялікага князя Вітаўта да татараў з прапановай служыць яму.

У маім войску татары, як добрыя коннікі, змогуць хутка дасягаць тых мясцін, дзе ворагі нашай дзяржавы, нечакана для нас, парушаць нашы землі і ўчыняць нам шкоду. Трапныя татарскія стрэлы, арканы могуць быць карыснымі для нас у бойках з рыцарамі, якія не па-рыцарску, а з грабежніцкімі мэтамі ўрываюцца на нашы землі.

Каб татары-воі не час ад часу дапамагалі майму войску, а заўсёды, яны павінны мець бацькоў, жонак і дзяцей, збудаваць сабе хаты, мець свае бажніцы і свае могілкі, на якіх па сваіх звычаях будуць хаваць палеглых у баях вояў і памерлых родных і блізкіх, дзе яны будуць спакойна ляжаць да Суднага дня.

Каб татарскім сем'ям было з чаго жыць, я дам ім пашы і сенажаці, ворную зямлю, лясныя ўгоддзі, якімі іх сем'і будуць карыстацца па спадчыне. Ісламскай верай яны будуць свабодна карыстацца і гвалтоўна ахрышчанымі не будуць, і ніхто з месцічаў не зможа чыніць ніякай шкоды ім.

Калі некаторым татарам не ўдасца зберагчы сваіх жонак і яны не змогуць знайсці сабе пару, то я дазваляю ім з згоды бацькоў мясцовых дзяўчат утвараць мяшаныя сем'і, каб людзі мелі магчымасць выконваць Божую запаведзь: жыць і пладзіцца.

Татары, якія пажадаюць перасяліцца ў маю краіну, будуць мець сваіх камандзіраў, святароў, суддзяў. Галоўным буду я, і мне ведама будзе ўсё. Слушныя просьбы татараў я буду задавальняць. Але час цяпер суровы, і я патрабую ад сваіх вояў абсалютнага паслушэнства, таму ў прысутнасці Вялікага хана, у прысутнасці вашых святароў вы павінны даць прысягу на вернасць новай Радзіме. Прысягаць будзеце на вашай Святой Кнізе перад святарамі, а хто пажадае, то можа прысягаць на мячах, як гэта было ў вас у старадаўнія часы.

Тыя, хто наважыўся пасяліцца на новых землях, станьце пад бунчук высакароднага чынгізіда Тахтамыша. Заўтра мы рушым у дарогу.

Няхай шчасціць нам Бог!

Я ТАК ДУМАЮ*

Я стары чалавек, пенсіянер, які можа і абавязаны выказаць свае думкі. Не магу маўчаць, бо, калі мусульманін ведае аб несправядлівасці, гвалце дужага над слабым, ён павінен спыніць гвалтаўніка сваімі рукамі. Калі ён не можа гэта зрабіць, то павінен звяць на дапамогу, а калі і на гэта ён не здольны, то хаця бы сэрцам, душой не павінен мірыцца з прыцясненнем.

Як мусульманін я цікавіўся, чаму чачэнцы не жадаюць жыць у «единой и неделимой России». Яны жывуць на сваёй, Аллагам дадзенай ім зямлі. Пасля таго, як сілай, маной, подкупам правіцеляў Расея на пачатку XIX стагоддзя авалодала ўсім Каўказам, горды чачэнскі народ не скарыўся царскім уладам. У 1836–1864 гадах народы Дагестана і Чачні вялі справядлівую вайну з вялізнай расейскай арміяй. Чвэрць веку горцаў узначальваў імам Шаміль. Ён супрацьстаяў расейскаму генералу Ярмолаву і генерал-фельдмаршалу Паскевічу (беларусы ведаюць яго як душыцеля паўстання ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім, за што атрымаў ад цара пачэснае званне святлейшага князя Варшаўскага). У 1859 годзе імам Шаміль капітуляваў, аднак ні ён, ні хто іншы не падпісаў просьбу да цара, каб ён улучыў Чачню ў Расейскую імперыю. Такім чынам, ніякіх пацверджанняў юрыдычнага права Расеі на Чачню няма.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года становішча чачэнцаў значна пагоршылася. Мусульманскія святары цярпелі пераслед, рэлігійныя кнігі знішчаліся, у калгасах і саўгасах пятніцу не святкавалі, а зрабілі працоўным днём. Выхадным зрабілі нядзелю, мясцовых жыхароў прымушалі ў калгасах і саўгасах гадаваць свіней, а гэта моцны гвалт над мусульманінам.

У час Вялікай Айчыннай вайны, зімой 1944 года ўвесь чачэнскі народ быў вывезены ў аддаленыя раёны СССР. Народ абвінавацілі ў супрацоўніцтве з нямецкімі фашыстамі, у тым, што яны падаравалі ці то Гітлеру, ці то Гудэрыяну верхавога каня. Адзначу, што Сталін, Берыя і ўсе яго памагатыя ў 1939–1941 гадах падаравалі фашысцкай Германіі мільёны тон нафты і мільёны тон стратэгічных тавараў, з дапамогай якіх Гітлер забіваў тысячы і тысячы людзей у Заходняй Еўропе, а потым і ў СССР. Асноўны кантынгент Расейскай вызваленчай арміі (Русской освободительной армии – РОА) складалі расейцы, якія пайшлі служыць немцам. Аднак аб гэтым маўчалі

* Матэрыял падрыхтаваны ў звязку з пачаткам Першай чачэнскай вайны 1994 года.

і маўчаць, а за тое, што некалькі чалавек пайшло паслугаваць немцам, што падаравалі ім каня, пакуты прыняў увесь чачэнскі народ ды й іншыя народы.

Пасля смерці Сталіна дзяржава прызнала несправядлівым актам высяленне чачэнцаў з родных мясцін. Многія з іх загінулі ў лагерах, ад непасільнай працы, голаду і хвароб. Жывыя вярнуліся на радзіму.

Аллаг мала даў зямлі чачэнцам, можа, па чвэрці гектара воравa на кожнага чалавека. Але гэтая зямля, з волі Аллага, багатая на нафту. Здабывалі яе шмат, амаль па 20 мільёнаў тон на год. З чачэнскай зямлі здабылі, відаць, каля 500 мільёнаў тон. А матэрыяльны ровень жыцця народа быў амаль самы нізкі ў СССР. Куды ж зніклі прыбыткі ад чачэнскай нафты? Іх з'еў ваенна-прамысловы комплекс, яны пайшлі на ўтрыманне камуністычных партый за межамі СССР, яны пайшлі на ўтрыманне савецкай і партыйнай наменклатуры, як крамлёўскай, так і мясцовых манкуртаў.

Паглядзеў чачэнскі народ і вырашыў, што ў вялізным бараку толку ніколі не будзе. Вырашылі чачэнцы жыць без «старэйшага брата», які дзень і ноч клапаціўся пра іх. А «старэйшаму брату» гэта не спадабалася. Маўчаць сродкі інфармацыі, што справа тут і ў нафце, якую могуць згубіць усялякія там нафтагазавыя кампаніі і дзяльцы ад яе продажы-перапродажы.

Цяпер «славные соколы» практыкуюцца ў прыцэльных бамбаваннях, у выпрабаванні кіроўных ракет і снарадаў. Ну, а тое, што і ў Расею прывозяць цынкавыя скрынкі, дык ёсць жа фраза, якую стагоддзе таму сказаў класік расейскай літаратуры: «Дело прочно, когда под ним струится кровь...» Толькі ў таго класіка не было дзяцей і кроў лілася не ягоная.

Мусульмане просяць у Аллага, каб спынілася вайна, каб Аллаг дапамог неразумным зразумець, што яны нарабілі.

ДЗЕНЬ ЖАЛЬБЫ. ПРА ДЭПАРТАЦЫЮ КРЫМСКІХ ТАТАРАЎ*

Ісмаіл Мемет аў, Якуб Якубоўскі

18 траўня 2014 года споўнілася 70 гадоў з таго дня, як таталітарны рэжым былога СССР здзейсніў злачынную акцыю – гвалтоўную дэпартацыю крымскіх татараў з сваёй радзімы ў аддаленыя раёны Сярэдняй Азіі, Казахстана і Сібіры. З часу акупацыі Крыма Расеяй (1783 г.) расправы над татарамі адбывалася шмат разоў, але генацыд 1944 года нельга ні з чым параўнаць.

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце і ў партызанскіх атрадах ваявалі больш за сто тысяч крымскіх татараў. Вядомыя шэсць Герояў Савецкага Саюза – крымскіх татараў. Ахмет-Хан Султан атрымаў гэтае званне двойчы! Два чалавекі былі кавалерамі найвышэйшай салдацкай узнагароды – мелі па тры ордэны Славы. Бясстрашную разведчыцу Аліму Абдэнанаву схапілі і пасля катаванняў расстралялі гестапаўцы. У перыяд акупацыі Крыма фашыстамі гарэлі татарскія вёскі, асабліва ў горных раёнах Крыма. Тысячы татараў былі вывезеныя ў Германію на прымусовыя работы, многія загінулі ў лагерах смерці.

Увесь крымскататарскі народ чакаў вызвалення ад фашысцкай акупацыі і радаваўся, калі яно надышло. Народ пачаў аднаўляць разбураную вайной гаспадарку. Але адбылося непрадбачанае. 18 траўня 1944 года – літаральна праз тыдзень пасля вызвалення ўсяго паўвострава – кожны дом крымскіх татараў абкружылі вайскоўцы. Пад штыкамі салдатаў ноччу ўвесь народ сагналі, пагрузілі ў таварныя вагоны і вывезлі з Крыма. Гвалтаўнікі не далі ўзяць з сабой нават самага патрэбнага. Нішто не бралася да ўвагі: ні сем'і Герояў Савецкага Саюза, ні сем'і партызанаў, ні сем'і воінаў, што загінулі на фронце, ні дзеці, ні хворыя, ні старыя.

Як і ў шматпакутнага беларускага народа, у крымскататарскага народа таксама ёсць свае Курапаты. Хто быў у Крыме, той, напэўна, ведае, што ад Генічаска да Арабацкага заліва цягнецца вузкая Арабацкая стрэлка даўжынёй больш за 100 кіламетраў. Жылі там пастухі, якія пасвілі авечак. Жылі таксама людзі, якія нарыхтоўвалі соль на тамтэйшых саланчаках. У час агульнага высялення пра іх за-

* Артыкул апублікаваны ў квартальніку «Байрам» (1994, № 1), падаецца перапрацаваным і ў скарочаным выглядзе.

быліся. 19 траўня, калі ўспомнілі, усіх гэтых людзей сагналі ў старыя баржы і ўтапілі ў Азоўскім моры. Пакутнікаў было больш за тысячу чалавек!

За адну толькі травеньскую ноч 1944 года крымскататарскі народ абрабавалі на 4,4 мільярда рублёў (па курсе 1975 г.), было захоплена 80 350 дамоў крымскіх татараў, знішчаны татарскія могілкі, разбураны амаль усе мячэці. Амаль палова выгнаных з родных мясцін загінулі ад голаду і хвароб. Невыносныя ўмовы жыцця былі там, куды татараў перавезлі. Размяшчаліся яны ў хлявах і зямлянках, у курніках, на панадворках. Мясцовых жыхароў папярэдзілі, што крымскія татары – здраднікі і злодзеі. Для іх быў устаноўлены лагерны, ваенна-каменданцкі рэжым. Людзі кожны месяц хадзілі распісвацца, што абавязуюцца не парушаць гэтага рэжыму. А таго, хто спрабаваў выйсці за межы, вызначаныя камендантам, тут жа арыштоўвалі. Таму бацькі не маглі ўбачыць сваіх дзяцей; дарослыя дзеці, якія пры дэпартацыі апынуліся ў іншых, чым бацькі, месцах, не мелі права іх наведаць, нават калі яны хварэлі ці паміралі.

Пасля смерці Сталіна становішча крымскіх татараў паволі палепшылася, але фальсіфікацыя, іх ганьбаванне існуюць і сёння. За год да смерці Сталіна, у 1952 годзе, у Сімферопалі была праведзена спецыяльная сесія Інстытута філасофіі і права АН СССР, якая «навукова» абгрунтавала, што «как таковой крымскотатарский народ не существовал и его сегодня нет, а просто была разношерстная шайка разбойников». Населеныя пункты былі перайменаваныя, былая Крымская АССР ліквідаваная адразу пасля вайны. Цэнзура па ўсёй краіне забараніла тады пісаць і ўжываць у афіцыйных дакументах само азначэнне – крымскі татарын. І цяпер людзі, што жывуць у нашых дамах, занялі нашыя гарады і вёскі, аб трагедыі крымскататарскага народа нічога не хочуць ведаць.

Але, нягледзячы на ўсё гэта, крымскататарскі народ працягваў барацьбу за вяртанне на сваю гістарычную радзіму. У 70-х і 80-х гадах мінулага стагоддзя тых, хто спрабаваў вярнуцца ў Крым, не пускалі туды, не прапісвалі, ізноў гвалтоўна высылалі, судзілі. Якія толькі перашкоды не прыдумвалі ўлады для перасяленцаў! У гэты ж час праводзілася актыўная кампанія па засяленні Крыма расейскамоўным насельніцтвам.

Цяпер, калі прызнаная незаконнасць дэпартацыі народаў, ніякіх захадаў у арганізаваным вяртанні крымскіх татараў на гістарычную радзіму не праводзіцца. Яны самі, з сваёй ініцыятывы, без якой-не-

будзь матэрыяльнай дапамогі з боку дзяржавы вяртаюцца ў Крым. На сённяшні дзень вярнулася толькі палова крымскіх татараў – каля 260 тысяч чалавек. Але ніводнай сям'і не вярнулі іх дом у Крыме, а пра кампенсацыю матэрыяльных стратаў, панесеных пры гвалтоўным перасяленні кожнай сям'і, і гаворкі няма, хоць гэтага патрабуюць элементарныя нормы прававой дзяржавы. Чаму ў 1944 годзе, у складаных ваенных умовах, за 24 гадзіны вывезлі ўвесь крымскататарскі народ з роднага Крыма, а сёння, за доўгія гады, нягледзячы на розныя дзяржаўныя і міжнародныя пагадненні аб правах народаў і чалавека, мала што робіцца для вяртання правоў крымскататарскага народа? У той жа час стараннямі акупантаў, якія жывуць у нашых дамах і на нашай зямлі, прыдуманы для татараў абразлівыя словы – «самазахват», «самастрой» і г. д. У некаторых месцах спецыяльна арганізоўваюць супраць крымскіх татараў крывавыя расправы, незаконна арыштоўваюць іх, бураць новабудоўлі.

Імперыі рана ці позна развальваюцца, каты і тыраны паміраюць, а народы працягваюць жыць і шукаць шляхі свайго выратавання ад прыгнёту. Думаецца, што толькі шляхам годнага, праўдзівага ўзаемапаразумення, узаемнай дапамогай і павагай, адраджэннем лепшых крымскататарскіх традыцый мы здолеем палепшыць сваё становішча, у якім апынуліся ў выніку нялюдскіх дзеянняў бальшавіцкага таталітарнага рэжыму. Толькі пераадолеўшы хаос у нашым духоўным жыцці, адрадзіўшы ўзаемапавагу і прыхільнасць, можна разлічваць на нармальнае жыццё і развіццё ўсіх народаў – вялікіх і малых.

ГУТАРКІ З ЯКУБАМ ЯКУБОЎСКІМ

ДУМКІ ІНТЭЛІГЕНТА

На тэму, узнятую ў артыкуле «Дзень жальбы», Якуб Якубоўскі як карэспандэнт квартальніка «Байрам» гутарыў з Яўгенам Гучком – кнігавыдаўцом, паэтам і публіцыстам.

Якуб Якубоўскі: Ці ведаюць у Беларусі пра тое, якая цяжкая доля напаткала крымскататарскі народ у 1944 годзе?

Яўген Гучок: Дэпартацыя татараў адбывалася ў той час, калі большая частка Беларусі была пад нямецка-фашысцкай акупацыяй. Заўважце, Беларусь, як і Крым, як і іншыя тэрыторыі з іх этнасамі, былі кінутыя маскоўска-бальшавіцкімі імперыялістамі, кінутыя пад ногі і гусеніцы сіл Трэцяга райху. Пазней кожны чалавек, які застаўся на акупаванай тэрыторыі, быў пад падазрэннем, нават дзеці (а раптам яны дзеці ворага народа?). Здарылася так, што цывільныя людзі сталіся вінаватымі ў тым, што не абаранілі радзіму ад ворага.

У час дэпартацыі татараў, а таксама пасля хадзілі пра гэта розныя чуткі, якія чарнілі крымскіх татараў. Нашы беларускія татары ведалі аб гэтых падзеях больш, асабліва ў Заходняй Беларусі, таму некаторыя з іх як былыя грамадзяне Польшчы скарысталіся правам выезду і пераехалі за межы СССР, каб не апынуцца пазней у Сібіры. Трэба сказаць, што калі б беларусы як народ былі не такімі шматлікімі, то іх усіх за тое, што жылі на акупаванай тэрыторыі, чэкісты выслалі б у аддаленыя раёны. Хоць ім і тут ствараліся і ствараюцца этнічныя чысткі з боку імперскіх і праімперскіх сіл (пераважная большасць афіцэраў у войску – не беларусы). Чаго вартыя адны Курапаты? Учарашнія каты сёння адмаўляюцца ад таго, што нарабілі.

Веды нашых людзей пра Крым вельмі мізэрныя. У падручніках па гісторыі ўпамінаецца пра Баспорскае царства і паўстанне Саўмака, у старэйшых класах ёсць урок пра Крымскую вайну і абарону Севастопаля, пра Нахімава, Карнілава, Істоміна, храбрага матроса Кошку і санітарку Дар'ю Севастопальскую. Час грамадзянскай вайны

адзначаны расказам аб штурме Перакопа і пераходзе цераз Сіваш. У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны расказваецца аб гераічнай абароне Севастопаля.

Па геаграфіі звестак яшчэ менш. Відавочна, што Міністэрства асветы палічыла, што кожны чалавек сам можа паехаць у Крым і пахадзіць па мясцінах, дзе бываў А. С. Пушкін, Максім Горкі (дарэчы, раней пра знакамітую «Песню пра Сокала» пазначалася, што гэта крымскататарская казка).

Цікаўны беларускі вучань можа ведаць, што ў Ялце пахаваны наш паэт Максім Багдановіч, які памёр у маладосці ад сухотаў. Яшчэ многія завучылі радок-лесвічку Маякоўскага аб тым, што

«жалко тех, которые
не были в Евпатории».

Якуб Якубоўскі: Што можна сказаць пра жыццё тых татараў, якіх вывезлі на чужыну, пазбавілі радзімы?

Яўген Гучок: Як жылі высланыя, беларусы ведалі не ад чужых людзей. Іх саміх высылалі царскія ўлады ў Сібір пасля задушэння паўстання Касцюшкі, паўстання 1831 года і паўстання Каліноўскага.

Якуб Якубоўскі: Каго б вы маглі назваць з тых свядомых людзей, хто адважыўся выступіць у абарону крымскіх татараў?

Яўген Гучок: Перш за ўсё генерала Пятра Грыгарэнку, які свядома заступіўся за татараў, ахвяраваўшы сваёй кар'ерай. Не магу не назваць Андрэя Сахарава. Трэба згадаць гісторыкаў А. М. Некрыча і В. Я. Вазгрына, якія шмат зрабілі для таго, каб сусветная грамадскасць пра гэта даведалася. Праз глушылкі-перашкоды дасягнула праўда тых савецкіх людзей, якія хацелі пачуць праўду. Добрае слова пра крымскіх татараў сказаў дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі, лідэр БНФ Зянон Пазьняк.

Але як жа добра не ведаць пра гора іншых! Цяпер нярэдка ў горадзе ў адным доме, у адным пад'ездзе могуць гуляць вяселле, калі суседзі за сцяной развітваюцца з памерлым. Наогул так, на жаль, было і раней, калі вялікія гуманісты заплюшчвалі вочы, затыкалі вушы і замыкалі сэрца. Згадайце цудоўныя вершы Пушкіна і Міцкевіча пра прыроду Крыма, пра рамантычныя слёзы ханскіх жонак і каханак. Але пра тое, што зусім нядаўна, напрыканцы XVIII стагоддзя, двухгаловы арол пакарыў і далучыў Крым да Расеі, пагубіў, выгнаў у эміграцыю больш за палову крымскататарскага народа, простага народа, а не ханаў, паэты маўчалі.

Ёсць версіі, згодна з якімі вельмі «своечасова» пры Екацярыне II задалося «знайсці» «Слова пра паход Ігаравы» як ідэалагічнае апраўданне барацьбы з «паганымі». Тут жа да мейсца прыйшоўся знойдзены камень, на якім былі выбіты словы пра тое, што русічы змералі Керчынскі праліў. Ну, калі змералі, тады ўсё, ужо законна даведзена, што Крым быў спрадвеку расейскім, толькі часова захоплены злымі татарамі. Але гэта толькі версіі, хаця...

За тое, што расейцы прайгралі Крымскую вайну, вінаватымі сталіся... крымскія татары. Пасля гэтага іх гвалтоўна выганялі з Крыма, у выніку тут напалову паменшылася колькасць карэнных жыхароў. І вялікі гуманіст, удзельнік Крымскай вайны Леў Талстой неяк не заўважыў гэтай несправядлівасці. У «Хаджы-Мураце» можна знайсці асуджэнне царскіх уладаў за гвалт, але ўжо так далікатна, што толькі некаторыя і змаглі гэта заўважыць. Але талстоўскага «Хаджы-Мурата» я ўсё ж разглядаю як самапраекцыю аўтара, які ў прыступе звышчалавечай гардыні змагаецца з царом і ўласнай жонкай. І яшчэ: Жылін і Костылін – героі «Каўказскага палонніка» паказаныя як ахвяры татараў, а не як заваёўнікі Каўказа. Наогул, расейская літаратура не ўздымае свой голас у абарону заваяваных і прыгнечаных Расеяй народаў. Выняткам можа служыць толькі А. Прыстаўкін з яго кнігай «Начавала хмарка залатая» аб дэпартацыі чачэнцаў. Выдаўцы таксама не паклапаціліся, каб надрукаваць тыя творы Джэка Лондана пра заваёву расейцамі Сібіры і Аляскі; яны дагэтуль не перакладзеныя на расейскую мову.

«Всем бы хорош был Крым, если бы не татары» – так казалі тыя расейскія патрыёты, якія пабудавалі тут сабе шыкоўныя палацы ці збіраліся іх пабудаваць. Ажыццявілася іх мара. Праўда, не ўсе дажылі да той пары. 18 траўня 1944 года ўвесь татарскі народ быў пад канвоем вывезены на пагібель. Досвед дэпартацыі ў савецкай улады быў вялікі – гэта вываз карэйцаў з Далёкага Усходу, немцаў з Паволжа, кабардзінцаў, балкарцаў, чачэнцаў, карачаеўцаў, лезгінаў, а таксама многіх і многіх людзей з заходніх раёнаў Беларусі і Украіны, з Прыбалтыкі і Малдовы да чэрвеня 1941 года.

Дарэчы, у XVIII стагоддзі ў Расейскай імперыі існавала амаль аўтаномія сербаў, якія ўцяклі ад туркаў да большага брата. Але большаму брату не спадабалася тое, што сербы не захацелі стаць прыгоннымі расейскіх памешчыкаў, і царскі ўрад хуценька ліквідаваў іх аўтаномнае ўтварэнне. А знаходзілася яно на ніжнім цячэнні Дняпра.

Якуб Якубоўскі: Як, на Вашу думку, будуць развівацца падзеі ў Крыме, ці вярнуцца крымскія татары на сваю гістарычную радзіму?

Яўген Гучок: Стары расейскі прынцып «забараняць і не пускаць» запазычылі сучасныя чыноўнікі і перашкаджаюць пад рознымі зачэпкамі татарам вярнуцца дамоў. За некалькі дзесяцігоддзяў пасля дэпартацыі татараў у Крым прыехала на сталае пражыванне больш за мільён розных людзей, пераважна расейцаў. Для іх месца знайшлося. Ведаеце, цяжка вырваць ахвяру ў драпежніка, асабліва калі драпежнік дужы.

Расейскамоўныя маюць моцныя пазіцыі ў Крыме, яны супраць татараў. Ды ёсць найвышэйшая сіла – Бог, ці, як гавораць татары-мусульмане, – Аллаг. На яго ўся надзея. Але адначасова і самім не паддавацца. Успомнім вечнае: калі дзіця не можа само сябе абараніць, то крыкам заве ўвесь свет на дапамогу. Гэта азначае, што татары ні на хвіліну не павінны спыняць свой зварот да чалавецтва, да сусветнага грамадства аб дапамозе.

Якуб Якубоўскі: Вялікі Вам дзякуй, Яўген Сяргеевіч, што Вы знайшлі час і адвагу, каб адказаць на нашыя пытанні.

«ЛІЧАЦЬ НАС БРАТАМІ СВАІМІ»

Гутарка Ірыны Крэнь з Якубам Якубоўскім. Апублікавана ў газеце «Наша слова» (1997, № 4).

Лёс распарадзіўся так, што да бальшавіцкага перавароту татарам жылося ў нас крыху лепш, чым шмат каму з карэннага насельніцтва, – яны стаялі на вышэйшай прыступцы ў грамадстве. Вялікі князь Вітаўт запрасіў татараў на службу ў Вялікае Княства Літоўскае ахоўваць дзяржаўныя межы. І з таго часу татары верай і праўдай служылі новай Айчыне і ніколі паміж імі і беларусамі не было звадак. Мала таго: татары выступалі нават супраць сваіх адзінаверцаў, калі тыя прыходзілі з іншых краін, каб рабаваць памежныя тэрыторыі Вялікага Княства. У «Літоўскай метрыцы» захаваўся іх ліст да захопнікаў наступнага зместу: «Ні Бог, ні Прарок не дазваляюць вам рабаваць, а нам быць няўдзячнымі. Мы лічым вас за драпежнікаў і шаблямі нашымі забіваем рабаўнікоў, а не братоў нашых. Заставайцеся за Волгаю, бо мы ля Вільні будзем кроў праліваць за ліцьвіноў, якія лічаць нас братамі сваімі». Вядома таксама, што ў Грунвальдскай

бітве татарскія харугвы біліся побач з беларускімі, а ў час вызваленчых рухаў на Беларусі ў 1794, 1833, 1863 гадах многія татары былі на баку паўстанцаў.

Даследчык татарскай гісторыі Алі Мухлінскі ў сваёй працы «Исследование о происхождении и состоянии литовских татар» (1857) адзначыў, што заканадаўства раўняла татараў з шляхтай. Іх надзялялі льготамі і маёнткамі, якія пераходзілі ў спадчыну да нашчадкаў, што вымагала ад іх ладзіць ваенныя паходы за свой кошт. А. Мухлінскі дае наступную характарыстыку этнічна-маральнаму абліччу татараў: «Яны ў большасці выпадкаў высокага росту, стройныя, чарнавалосыя, смуглатварыя, з правільнымі рысамі твару і высакародныя ў абыходжанні, разважлівыя ў размовах, гасцінныя, рахманыя, стрыманыя. Словам, не падобныя зусім да мангольскіх плямёнаў. З маральнага гледзішча яны сумленныя, добрыя, ласкавыя, жывуць у згодзе з іншымі жыхарамі, але не зліваюцца з імі. Амаль ніколі не былі выкрытыя ў крымінальных злачынствах. У хатнім побыце яны міралюбівыя, рэдка паміж сабой сварацца і варагуюць».

Акрамя ваяроў, беларускія (літоўскія) татары былі і чыноўнікамі, і земляробамі, і агароднікамі, і конегадавальнікамі. У XIX стагоддзі, напрыклад, у Менску, дзе колькасць татараў даходзіла да чатырохсот душ, татары, якія гадавалі коней, валодалі на берагах Свіслачы сенажацямі. У Пінску яны выраблялі з скуры саф'ян, у Вільні прадавалі палатно і ніткі, у Наваградку займаліся вазніцтвам. Вядома, што ў савецкі час шмат татараў працавалі гарбарамі.

Мужнасцю, бескарыслівасцю, шанаваннем законаў праславіліся многія татарскія шляхоцкія роды Беларусі, да якіх належалі Адамовічы, Базарэўскія, Бараноўскія, Белякі, Бучацкія, Сабалеўскія, Сулькевічы, Халецкія, Юзэфовічы, Янушэўскія. Шляхта-татары былі людзьмі адукаванымі, некаторыя з іх, акрамя еўрапейскіх моваў, ведалі арабскую і сваю родную – як знак інтэлігентнасці і самапавагі. Некаторыя прайшлі навучанне ў медрэсэ – духоўных навучальнях.

Рэлігійнае і традыцыйнае жыццё татараў ва ўсе часы, акрамя савецкіх, не прыгняталася. Гэты народ жыў супольнямі, маліўся ў сваіх мячэцях, вучыўся ў хатніх школах арабскаму пісьму і ісламу, меў і шанаваў свае могілкі (мізары), захоўваў доўгі час свой нацыянальны строй. Паводле сведчання Пятра Шпілеўскага, у сярэдзіне XIX стагоддзя касцюм татарскага мужчыны нагадваў касцюм мешчаніна: ялавыя боты, шэры доўгі сурдут і шапка з брылём, тым часам як жанчыны яшчэ трымаліся сваіх стракатых шляфрокаў і чырвоных хустак.

Сёння адзенне беларускіх татараў не адрозніваецца ад еўрапейскага. Але некаторыя адметныя татарскія элементы адзення засталіся. Як сведчаць даследнікі, беларусы і палякі перанялі ў татараў бурку, жупан, канфедэратку, халат, андарак, намітку, боты і, магчыма, слуцкія паясы, а з імі ўвайшлі ў беларускі слоўнік назвы гэтых прадметаў. Яшчэ раней у цюркаў-гунаў былі перанятыя порткі, якія ў іх звaліся штанамі.

А вось мову, атабарыўшыся на беларускай зямлі, татары праз два-тры пакаленні пераймалі мясцовую. Праўда, уносячы ў яе і свае словы, якія ахвотна засвойвалі беларусы. Такім чынам у беларускай мове з'явілася шмат татарскіх слоў.

Сталінскія рэпрэсіі і войны скарацілі колькасць татарскага насельніцтва Беларусі. Засталася жменька – 12,5 тысячы чалавек. Але гэтая жменька паступова адраджаецца. У гэтым заслуга не толькі актывістаў адраджэння, але і новага стаўлення дзяржавы да рэлігійных пытанняў (гл. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый», «Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь»).

На пачатку 1990-х гадоў адраджэнне, нібы зыркае полымя, ахапіла асяроддзе беларускіх татараў. Асветную, выдавецкую і навукова-даследчую працу распачалі ўтвораныя ў 1989 годзе пад эгідай Беларускага фонду культуры менскае і гарадзенскае татарскія згуртаванні, якія атрымалі назву «Аль-Кітаб» у Менску і «Кітаб» у Горадні. У гэтых аб'яднаннях былі створаныя камісіі па гісторыі, культуры, пытаннях рэлігіі, міласэрнасці, рабоце сярод моладзі, умацаванні сувязяў з татарамі замежжа. Пачаліся клопаты аб захаванні ў Беларусі татарскіх помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры і напісанні гісторыі тутэйшых татараў. Гэтая задача запатрабавала неадкладнага наладжвання выдавецкай справы, правядзення навуковых канферэнцый. Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Летувы і Польшчы» (1993) прысвячалася 600-годдзю татарскага асадніцтва, юбілей якога адзначаўся ў 1997 годзе. Падставай для святкавання гэтай даты паслужыў запіс Яна Длугаша ў ягонай Хроніцы аб тым, што татарскія паселішчы ў Вялікім Княстве Літоўскім былі заснаваныя менавіта ў 1397 годзе. Канферэнцыя была арганізаваная сіламі згуртавання «Аль-Кітаб» пры падтрымцы беларускіх навукоўцаў, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. На ёй былі разгледжаныя праблемы этнічнага, рэлігійнага і культурнага жыцця, старонкі ваеннай гісторыі татараў на тэрыторыі Беларусі. Другая міжнародная канферэнцыя «Ісламская культура татараў-мусульманаў Беларусі, Летувы і Польшчы, яе ўзаемадзеянне

з беларускай і іншымі культурамі» (1995) прыцягнула значную ўвагу сусветнай грамадскасці. На ёй выступілі дэлегаты з Турцыі, Прыбалтыкі, Егіпта, Татарстана, Нігерыі, Расеі, Польшчы, Швейцарыі, ЗША.

Ад 1991 года ў Менску згуртаванне «Аль-Кітаб» выдае часопіс «Байрам». У гутарцы з яго галоўным рэдактарам Якубам Якубоўскім працягваецца тэма татарскага адраджэння ў Беларусі.

Ірына Крэнь: Раскажыце пра будні згуртавання «Аль-Кітаб».

Якуб Якубоўскі: Збіраемся на сходкі два разы на месяц. Наведванне іх неабавязковае, бо мы не звязаныя ні членствам, ні складкамі. Хочаш – прыходзь, хочаш – не прыходзь. Наш актыў, а гэта звычайна чалавек 30–40, прысутнічае па маральным абавязку. На сходах абмяркоўваем праблемы і справы, у тым ліку выдавецкія і звязаныя з працай камісій. Заслухоўваем паведамленні людзей, адказных за розныя кірункі дзейнасці згуртавання, а таксама гутарым з гасцямі і асобамі, якім ёсць пра што расказаць і што сказаць. У канцы бываюць заняткі па гісторыі ісламa і крымскататарскай мове.

Ірына Крэнь: У вас выходзіць часопіс пад назвай «Байрам». А што азначае гэтае слова?

Якуб Якубоўскі: «Байрам» у перакладзе з татарскай мовы азначае «свята». Паколькі ў нас сродкаў няма, то выходзіць ён пакварталь на. Значыць, чатыры разы на год з нагоды выхаду чарговага нумара ў нас і бывае свята.

Ірына Крэнь: А чаму «Байрам» выходзіць на беларускай мове?

Якуб Якубоўскі: Таму што большасць нашых чытачоў – татары, родная мова якіх беларуская. Такіх у нас, паводле апошняга перапісу насельніцтва, налічваецца восем тысяч. Дзве тысячы адзінаверцаў пераехала з Паволжа, іх родная мова – татарская. І толькі дзве з паловай тысячы нашых людзей гавораць па-расейску і на іншых мовах, а гэта меншасць. Акрамя таго, у нас так заведзена, што кожны татарын, які тут жыве, павінен ведаць беларускую мову. Аднак хваліцца татарыну, што ён ведае гэтую мову часам лепш за беларуса, нягожа. Ён павінен быць сціплым і саступіць месца першым, менавіта беларусам, бо яны на тысячу гадоў раней пасяліліся на гэтай зямлі і тым самым далі магчымасць тут жыць татарам. Часам ад паволжскіх або крымскіх татараў можна пачуць папрок, што вось вы не ведаеце роднай мовы. На яго я адказваю так: «Мы даўно карыстаемся роднай нам беларускай мовай, гаворым і на расейскай, разумеем польскую і ўкраінскую. Але галоўнае, мы выхоўваем сваіх дзяцей сумленнымі

і працавітымі людзьмі, якія маюць гонар называцца татарамі ў любых абставінах. А што да татарскай мовы, то прыйдзе час, і ў нас будуць свае татарскія школы».

Ірына Крэнь: Наколькі мне вядома, татары з беларусамі заўсёды жылі дружна.

Якуб Якубоўскі: Наогул, так. Але вось праз школу і ў царскія часы, і цяпер праводзіцца думка, што наш народ – эксплуататар, ён трыста гадоў трымаў славян у ярме. У падтэксце гучыць, што, маўляў, наша сённяшняе адставанне ад еўрапейскіх цывілізаваных краін абумоўліваецца татара-мангольскім ярмом, ад якога дагэтуль не акрыялі. Такое адмоўнае стаўленне да татараў праз падручнікі перадалося і на Беларусь, хоць тут татара-манголаў нават трыццаць дзён не было. Але самі беларусы нас ні ў чым не папікаюць.

Ірына Крэнь: Чым адрозніваецца «Байрам» ад беларускіх выданняў?

Якуб Якубоўскі: Сваёй тэматыкай. Гэта гісторыя беларускіх татараў і падзеі, да якіх яны прычыніліся; асновы ісламу, даследнікі татарскай гісторыі і культуры, заняткі і рамёствы, жыццё ў Татарстане, крымскія, сібірскія, астраханскія, беларускія і польскія татары, татары далёкага замежжа, слоўнік татарскіх найбольш ужывальных слоў і выразаў, татарская кухня, мастацкая творчасць і г. д. А па сваёй спецыфіцы гэты часопіс сямейны. У нас няма сілы і жадання падбіраць рафінаваных аўтараў.

Ірына Крэнь: Што Вы хочаце гэтым сказаць?

Якуб Якубоўскі: Хачу сказаць, што ў нас кола аўтараў шырокае, шмат пішуць і простыя людзі – па-простаму.

Ірына Крэнь: А хто вашы аўтары?

Якуб Якубоўскі: Татары, беларусы і габрэі. У часопісе актыўна друкуюцца і беларускія даследнікі А. Грыцкевіч, Л. Лыч, Г. Каханоўскі, Л. Побаль, Э. Іофэ, А. Бяляцкі, В. Дадзіёмава, паэт Я. Гучок ды іншыя.

Ірына Крэнь: Што ў вас робіць рэдакцыйная група?

Якуб Якубоўскі: Дапамагае ў апрацоўцы і навуковым рэдагаванні тэкстаў. Усе добраахвотнікі. Дапамагаюць бескарысліва.

Ірына Крэнь: Што ў вас яшчэ выходзіць акрамя «Байрама»?

Якуб Якубоўскі: Часопіс з рэлігійным кірункам «Жизнь» – на расейскай мове, бо ён дасылаецца за межы Беларусі, у тым ліку і ў арабскія краіны. Жыццё ў ім паказваецца і такое, якое яно ёсць, і такое, якім яно павінна быць.

Ірына Крэнь: Як ідзе Ваша праца над «Энцыклапедыяй для беларускіх татараў»?

Якуб Якубоўскі: Слоўнік энцыклапедыі разлічаны на 8–9 тысяч артыкулаў разам з спасылачнымі. Спецыфіка выдання палягае ў адборы артыкулаў. У нас даецца тое, што не прачытаеш у іншых энцыклапедыях. Напрыклад, мы плануем серыю артыкулаў па асновах мусульманскай веры, бо спадзявацца, што гэта будзе зроблена беларусамі ці летувісамі, не даводзіцца. Мусульманскімі і цюрцкімі краінамі і народамі мы больш цікавімся – скажам, якутамі або малдаўскімі гагаузамі. Набярэцца, мабыць, пяцьсот – шэсцьсот мусульманскіх народаў, пра якіх раскажа нашае выданне. А наогул будуць артыкулы пра кожную краіну ў свеце, у якіх будзе адзначана, дзе там жывуць мусульмане. Не будзе абыдзена і гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расейскай імперыі. У нас будуць артыкулы пра ўсіх князёў, каралёў і цароў, якія тады панавалі. Пра Івана Жахлівага, напрыклад, які па маці паходзіў з татараў і які ў 1552 годзе, захапіўшы Казань, атруціў там ваду. Усяго ж будзе каля двухсот артыкулаў прысвечана гістарычным асобам. Шэраг артыкулаў будзе пра татарскую этыку і мараль, напрыклад, пра шанаванне бацькоў або пра тое, як мусульманскае права вучыць ставіцца да сіротаў. У нас лічыцца ганьбай, калі старыя бацькі трапляюць у прытулак для састарэлых, а дзеці – у сіроцкія дамы. Асірацелых дзяцей абавязкова павінен нехта прытуліць і выгадаваць. Пры напісанні артыкулаў на рэлігійныя тэмы ў якасці ўзораў мы бярэм шматтамовую касцёльную энцыклапедыю – выданне, якое з'яўлялася ўласнасцю беларускага дзеяча ксяндза Адама Станкевіча і якое цяпер знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Карыстаемся і габрэйскай энцыклапедыяй, а пры асвятленні пытанняў праваслаўнай веры – Беларускім царкоўным календаром.

Ірына Крэнь: Вось Вы далі артыкул пра Канстанціна Езавітава. Ён татарын?

Якуб Якубоўскі: Мы далі яго таму, што ён выдатны дзяяч беларускага Адраджэння. Ведаеце, той, хто надта скараецца і схіляецца перад уладамі, – ненадзейны чалавек, пра такога і пісаць не варта.

Ірына Крэнь: Як Вы робіце татарскі каляндар?

Якуб Якубоўскі: Паводле ўзору заходнебеларускага. Мы працягваем традыцыі татараў, якія жылі ў Заходняй Беларусі, Польшчы.

Ірына Крэнь: Ваша праца грунтуецца на дэмакратычнай аснове?

Якуб Якубоўскі: На іншай і немагчыма было б.

«ПАКІНУЦЬ СЛЕД У ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ...»

Уяўнае інтэрв'ю

Падрыхтавалі Таццяна Якубоўская і Разалія Александровіч

Вялікую цікавасць на імпрэзе з нагоды 80-годдзя Якуба Якубоўскага ў прысутных выклікала ўяўнае інтэрв'ю з ім, калі на дзесяць пытанняў Разаліі Александровіч вытрымкамі з прадмоў да «Байрама» ад імя галоўнага рэдактара адказвала яго жонка, Таццяна Якубоўская. Ушаноўваючы памяць Якуба Адамавіча як беларускага географа, гісторыка, філолага, энцыклапедыста, дзеяча беларускага і татарскага адраджэння 90-х гадоў мінулага стагоддзя, як годнага чалавека, падалося цікавым паразмаўляць з ім праз прадмовы да часопіса «Байрам». Аўтарамі гэтага часопіса былі не толькі пасіянарныя асобы з асяроддзя татарскай інтэлігенцыі Беларусі, Татарстана, Польшчы, Летувы, арабскага свету, але і выдатныя беларусы – даследчыкі, літаратары і гісторыкі. Іх агульнымі намаганнямі і падтрымкай сілкаваўся гэты першы ў гісторыі беларускіх татараў часопіс на беларускай мове.

Прадмовы да кожнага нумара спадар Якуб як рэдактар старанна рыхтаваў сам. У іх ён узгадваў галоўныя палітычныя падзеі ў свеце, закранаў пытанні міжнароднага і грамадскага жыцця ў краінах, дзе жывуць татары, адзначаў святочныя і сумныя падзеі ў супольнях татараў-мусульманаў Беларусі і нават у асобных сем'ях, словам, пісаў пра тое, што яго хвалявала. Таму можна ўяўна задаць Якубу Якубоўскаму некалькі пытанняў і адказы на іх знайсці ў тых прадмовах або артыкулах, якія ён пісаў для часопіса.

1. Адкуль і калі з'явіліся на беларускіх землях татары?

«На зямлі высакароднага, зычлівага і працавітага беларускага народа жыве жменька татараў. Іх так мала, што ў звычайных даведніках колькасць не пазначаецца, бо складае каля 0,12% ад насельніцтва Беларусі... Татары... пасяліліся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV стагоддзя... Прайшло ўжо 600 гадоў, як мы жывём воддаль ад сваёй былой радзімы – Паволжа і Крыма, але мы не выракліся сваёй веры – ісламу і свайго імя» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1991. № 1, с. 3)*.

«Татары Беларусі, Летувы і Польшчы – нашчадкі тых татараў Залатой Арды, якіх запрасіў вялікі князь літоўскі Вітаўт у 1397 годзе на вайсковую службу, якія змагаліся пад Грунвальдам поплеч

з беларусамі, летувісамі, палякамі, смалянамі і іншымі воямі супраць крыжакоў, а затым і супраць іншых ворагаў беларуска-летувіскай дзяржавы» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1996. № 1–3, с. 3)*.

2. Калі і як узнікла згуртаванне «Аль-Кітаб», яго дзейнасць?

«Парадуе нашых татараў падзея, якая ў свята Курбан-Байрам адбылася ў Іўі. Вялікая колькасць татараў з усіх абласцей Беларусі вырашыла стварыць Згуртаванне татараў-мусульманаў на Беларусі ("Аль-Кітаб"), якое мае на мэце адрадзіць культуру нашага народа і пашырыць мусульманскую веру сярод татараў, падтрымліваць сувязь з нашымі супляменнікамі ў іншых дзяржавах, з нашымі братамі-адзінаверцамі. Прэзідэнтам нашага Згуртавання адзінадушна абраны Абу-Бякір Шабановіч, ураджэнец гарадскога пасёлка Іўе. Пажадаем яму і нашаму згуртаванню плённай працы» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1991. № 2–3, с. 3)*.

Далей падаюцца цікавыя звесткі аб працы згуртавання. «Можа, найважнейшай справай нашых татараў становіцца навучанне ісламу дзяцей. У гэтым нумары "Байрама" (1992, № 2) мы друкуем першапачатковы падручнік для дзетак-мусульманаў. Пасля азнаямлення з ім нашай мусульманскай грамадскасці можна было б узяць і з'ехацца годжыям (настаўнікі мусульманскіх школ – *Т. Я.*) з Іўя, Клецка, Навагрудка, Гродна, Менска і іншых гарадоў і мястэчак, каб падзяліцца вопытам навучання дзяцей, а заадно і паслухаць лекцыі па асновах ісламу, гісторыі беларускіх татараў, абмеркаваць слоўнік і некаторыя артыкулы даведніка пра нашых татараў. На час гэтага 5–7-дзённага семінара годжыяў прытулак і харчаванне для прыезджых дадуць менскія мусульмане».

«Беларускае згуртаванне татараў-мусульманаў "Аль-Кітаб" не замыкаецца толькі ў сваім коле інтарэсаў. У вялікай падзеі – Першым з'ездзе беларусаў свету ў якасці дэлегатаў узялі ўдзел Муса Канапацкі (ён сын менчука Гасана Канапацкага – патрыёта Беларусі. За актыўны ўдзел у жыцці гданьскіх беларусаў Мусу і паслалі дэлегатам у Менск), Алег Гізатулін (ураджэнец Беларусі, актыўны ўдзельнік беларускага згуртавання ў Малдове, добра ведае родную беларускую мову, вось чаму і абралі яго беларусы сваім дэлегатам), Ібрагім Канапацкі (віцэ-прэзідэнт згуртавання "Аль-Кітаб", даўно па-беларуску чытае лекцыі па гісторыі ў педінстытуце). Шмат папрацавала на беларускім тэлебачанні татарка Тамара Муха дзеля таго, каб тэлегледачы азнаёміліся з работай Першага з'езда беларусаў у Менску.

Разам з усімі беларусамі, з навуковай грамадскасцю рэспублікі мы адзначаем 110-годдзе з дня нараджэння выдатнага дзеяча Вацлава Ластоўскага і 75-годдзе з дня нараджэння Фёдара Янкоўскага. Гэтыя вучоныя шмат зрабілі для беларускай навукі і культуры. Яны вельмі істотна дачыніліся да культуры беларускіх татараў. Глыбей і раней за іншых даследчыкаў Вацлаў Ластоўскі і Фёдар Янкоўскі ацанілі татарскія "Аль-Кітабы" як крыніцы, дзе захаваліся ўсе асаблівасці беларускай гутарковай мовы XVI–XVII стагоддзяў. Мова беларусаў тых часоў чысцюткая і зусім зразумелая і так адрозніваецца ад афіцыйнай мовы дакументаў таго часу, як адрозніваецца мова беларускага пісьменніка ад канцылярскай мовы сучаснага "русского-ворящего". Гэтыя славутыя вучоныя знаходзілі маладых таленавітых хлопцаў і накіроўвалі іх на вывучэнне "Аль-Кітабаў". І гэта крыніца пазнання беларускай мовы яшчэ не вычарпана. Вацлаў Ластоўскі і Фёдар Янкоўскі клапаціліся, каб татарскія юнакі маглі атрымаць вышэйшую адукацыю і развіваць татарскую культуру» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1993. № 3, с. 3)*.

3. Якія першапачатковыя мэты былі ў стваральнікаў «Байрама»?

«Ініцыятыўная група татараў з Менскага грамадска-культурнага аб'яднання "Аль-Кітаб" пры Менскім абласным аддзяленні Фонду культуры (у 1991 годзе – *Т. Я.*) спрабуе пачаць выданне квартальніка «Байрам». Пра што будзем пісаць? Пра гісторыю і падзеі, да якіх мелі дачыненне беларускія татары, пра асновы ісламу, пра даследчыкаў гісторыі і культуры татараў, пра заняткі і рамёствы, пра жыццё татараў у Татарстане, пра крымскіх, сібірскіх, астраханскіх, пра родных і блізкіх летувіскіх і польскіх татараў. Мяркуем друкаваць слоўнік казанскататарскіх і крымскататарскіх найбольш ужывальных слоў і выразаў. Некалькі старонак адводзім на артыкулы пра татарскую кухню, пра нацыянальныя песні і танцы» *(Тамсама, с. 4)*.

4. Як татары Беларусі сустрэлі распад СССР?

У «Байраме» № 4 за 1991 год у прадмове напісана: «У апошні час адбылася падзея сусветнага значэння – распаўся Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які быў пабудаваны на месцы Расеі – "турмы народаў" (азначэнне У. І. Леніна) і шмат гадоў заставаўся аплотам вялікага лагеру, абгароджанага калючым дротам на працягу многіх тысяч кіламетраў. Цяпер вальней дыхаецца ўсім, у тым ліку і мусульманам».

5. Як ставіліся беларускія татары да падзей у Чачні ў 1990-х гадах?

У той самай прадмове да № 4 за 1991 год ёсць радкі аб пачатку тых падзей, што абярнуліся дзвюма войнамі ў гэтай каўказскай рэспубліцы. «Вялікі дзякуй Аллагу, што не дапусціў увядзення салдатаў на зямлю чачэнцаў, зведаўшых царскую няволю, а пасля і дэпартацыю з родных мясцін (у час Другой сусветнай вайны – *Т. Я*). Цікава, што нават з вядомага верша А. С. Пушкіна "Кавказ" цэнзура (савецкая – *Т. Я.*) выкінула апошняе чатырохрадкоўе, бо яно было актуальнае ў пасляваенныя гады. Вось яно (цытую па памяці):

Так буйную вольность законы теснят,
Так дикое племя под властью тоскует,
Так ныне безмолвный Кавказ негодует,
Так чуждые силы его тяготят».

І далей: «Вайна ў Ічкерыі-Чачні, вайна ў Босніі і Герцагавіне, падзеі ў Крыме... Яны засмучаюць нас. Мы душою разам з тымі, хто пакрыўджаны. Мы просім Аллага, каб скончылася вайна і людзі маглі спакойна працаваць, жыць, гадаваць сваіх дзяцей» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1995, № 2, с. 4)*.

6. Часам Вы з гумарам кажаце пра вельмі сур'ёзныя рэчы, але пазіцыю сваю наконт падзей тым не менш акрэсліваеце пэўна...

«Вядома, што ўсё благое ідзе ад нячыстай сілы – шайтана. Але з нечысцю можна і трэба змагацца. 80 гадоў таму было зроблена злачынства, якому чалавецтва не дало належнай ацэнкі, – гэта забойства амаль двух мільёнаў армянаў – цывільнага насельніцтва – жанчын, дзяцей, старых, усіх, хто трапіў у рукі туркаў. Цяпер унукі і праўнукі тых, хто ў 1915 годзе даў загад забіваць армянаў, хто выконваў гэты бесчалавечны загад, усімі сродкамі, з дапамогай самай сучаснай зброі знішчэння чалавека забіваюць курдаў, якія жывуць на сваіх спрадвечных землях, але захопленых Турцыяй, Іракам і Іранам. Курды моляцца Аллагу, але сілы зла яшчэ працягваюць сваю чорную справу. Калі б чалавецтва ў час армянскай бойні выступіла супраць генацыду, то, можа, не было б фашызму з усімі яго зверствамі, не было б зверстваў у час Грамадзянскай вайны ў Расеі, не было б ГУЛАГу» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1995, № 1, с. 3)*.

І таксама зусім сур'ёзна: «Вельмі хвалююць нас справы нашых адзінакроўных братоў – крымскіх татараў. Дэпартацыя татараў з Крыма, якая адбылася ў 1944 годзе, была зроблена на загад Сталіна. Мно-

гія татары, якія былі старымі, хворымі і нядужымі, памерлі па дарозе ў Сібір, Казахстан і Сярэднюю Азію. Маёмасць крымскіх татараў была разрабаваная. І хоць некалькі разоў друкавалі ў газетах пра рэабілітацыю крымскіх татараў, але гэта ўсё толькі словы. Ні зямлю, ні забудовы крымскіх татараў не аддаюць рабаўнікі. Расея, якая з'яўляецца праваперамніцай СССР, нічым не дапамагае крымскім татарам, бо яны жывуць у Сярэдняй Азіі і Казахстане, а тым, што з вялікай цяжкасцю пераехалі ў Крым, таксама нічога не даюць, бо яны жывуць ва Украіне. Вось і спрабуюць на гэтым расейскія шавіністы зрабіць крывавую гульню, супрацьпаставіць татараў украінцам... Каб застрашыць актыўных дзеячоў-татараў, нярэдка іх забіваюць. Гэта палітычная расправа пад выглядам звычайнага крымінальнага злачынства (нядаўна быў забіты Юры Бякіравіч Асманаў, якога ведалі таксама беларускія татары)» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1993. № 4, с. 4).*

7. Які ўдзел бралі татары-мусульмане ў палітычных падзеях у Беларусі?

«У гэтым годзе адбудуцца выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Татараў-выбаршчыкаў будзе 0,1 % ад колькасці ўсіх, хто пажадае выбраць кіраўніка дзяржавы. Не мае практычна ніякага значэння, за каго прагаласуюць татары. Гэта будзе мець значэнне толькі для самога татарына і татаркі, для іх дзяцей. Калі ён і яна могуць сказаць самім сабе і сваім дзецям: "Я галасаваў за прыстойнага чалавека, за вольную Беларусь, за незалежную дзяржаву", то гэта і будзе тое, што патрабуе сумленне мусульманіна, абавязак грамадзяніна нашай Айчыны – Беларусі» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1994, № 1, с. 5).* І яшчэ раз пра гэтыя выбары: «Адбыўся першы тур выбараў прэзідэнта. Лічбы для большасці выбаршчыкаў, ды і саміх прэтэндэнтаў на вышэйшую пасаду, аказаліся нечаканымі. Толькі ў гэтым выбары татары не адыгралі ніякай ролі, бо яны склалі не больш за 0,1 % выбаршчыкаў Беларусі» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1994, № 2, с. 3).*

І пра другое. «Адбылася, дзякаваць Богу, доўгачаканая падзея – усур'ёз і надоўга абраны Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь (тады ніхто не мог і думаць, што хутка адбудзецца брутальны разгон гэтага парламента – *Т. Я.*). Дзяржава мае цяпер усе тры апірышчы – заканадаўчы, выканаўчы, судовы органы. У Вярхоўным Савеце 12-га склікання татары мелі добразычлівага апекуна – Ніла Сымонавіча Гілевіча. Ён дапамог татарам выдаць кнігу С. Думіна і І. Канапацкага "Беларускія татары: мінулае і сучаснасць", якая паслужыць не аднаму пакаленню нашых супляменнікаў. Народны паэт Ніл Сы-

монавіч, высакародны і мудры, не адмовіць татарам у падтрымцы і цяпер, і ў будучыні. Трыццатага верасня – дзень народзінаў народнага паэта, і кожная татарская сям'я пашле ў думках нашаму заступніку найлепшыя пажаданні» («Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1995, № 4, с. 3).

8. Раскажыце пра «Энцыклапедыю для беларускіх татараў».

Пра энцыклапедычны даведнік для татараў падрабязна напісана не ў прадмовах, а ў артыкулах, напрыклад, у «Разважанні пра даведнік аб татарах» *(«Байрам». № 2, 1992, с. 71–72)*. Задуманае ў 1992 годзе выданне «Татары Беларусі, Летувы і Польшчы» планавалася ажыццявіць за пяць гадоў, да 600-годдзя пасялення татараў на землях Вялікага Княства Літоўскага, якое адбылося ў час яго росквіту пры Вітаўце Вялікім. Вось што пісаў Якуб Адамавіч: «Пра што можна будзе прачытаць у гэтай кнізе? Пра кожны населены пункт, дзе жыве хоць некалькі татарскіх сем'яў. А пра вялікія і сярэднія гарады будуць звесткі па гісторыі і культуры, пра колькасць татараў цяпер і ў мінулым, пра татарскае жыццё. Асобнай увагі заслугоўваюць нашы мізары і мячэці. Клецкія татары прапануюць напісаць асобныя артыкулы пра кожны мізар, змясціць план, паказаць на ім магілы кожнага мусульманіна. Усім будзе цікава і карысна ведаць пра мячэці, як дзейныя цяпер, так і збэшчаныя нелюдзямі, зруйнаваныя, спаленыя.

Вядома, у гэтым даведніку нямала месца зоймуць матэрыялы пра людзей. Гісторык літоўскіх татараў (так іх называюць у гістарычнай літаратуры – беларускіх і летувіскіх. – *Т. Я.*) С. Думін мяркуе, што мы належым да 300 прозвішчаў, якія ахопліваюць каля 20 тысяч нашых татараў. Пра кожнае прозвішча і будзе артыкул з самай істотнай інфармацыяй: першая згадка гэтага прозвішча ў якім-небудзь дакуменце, найбольш вядомыя носьбіты... Патрэбны будуць артыкулы пра гісторыкаў, этнографаў, літаратараў, якія спрычыніліся да даследавання і вывучэння нашых супляменнікаў, прычым нацыянальнасць, веравызнанне ці атэізм вучоных не перашкодзіць таму, каб пра іх ведалі нашы чытачы.

Вялікая група артыкулаў будзе пра асноўныя заняткі нашых татараў, пра абрады, звычаі і традыцыі, пра гістарычныя падзеі, да якіх мелі дачыненне татары.

Вялікую цікавасць для нас ўяўляюць паволжскія, крымскія, касімаўскія, сібірскія (нашы татары знаходзілі ў іх падтрымку ў час высылак за ўдзел у паўстаннях супроць царызму)... Можа, найбольш будзе артыкулаў пра пытанні, звязаныя з нашай рэлігіяй. Усе тэмы, закранутыя ў "Аль-Кітабах", вартыя таго, каб пра іх напісаць у нашым даведніку.

Калі ж мы пастараемся, і нам дапаможа Аллаг, то знойдуцца добрыя людзі, якія дадуць сродкі для выдання добрым друкарскім спосабам...».

9. Для чаго чалавек жыве, у чым шчасце?

«...чалавек жыве не дзеля юбілеяў, іншых святаў. А дзеля чаго? Калі запытаць у многіх людзей рознага ўзросту, рознага вопыту, адукацыі, то атрымаеш адказы: "Не ведаю", "Даў Бог жыццё, то Ён і ведае, для чаго", "Жыццё чалавеку даецца для шчасця". У "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы" (Менск, 1996) сказана: "Шчасце – стан і пачуццё поўнай, найвялікшай задаволенасці". Шчасце прыходзіць да кожнага чалавека, толькі не ў кожнага яно жыве доўга. Ці то ён сам вінаваты, што не збярог яго, ці нейкія абставіны, а то і непрыяцелі абрабавалі.

Мусульманін ведае, што найвялікшую задаволенасць, найвялікшае шчасце адчувае, калі выконвае абавязкі мусульманіна ці хоць бы імкнецца, каб гэтыя абавязкі выканаць найлепшым чынам. Увесь час вучобы ў школе, іншай навучальнай установе мусульманін выконвае нійет, які палягае ў тым, каб сумленнай працай заслужыць добрую адзнаку, добра працаваць, дапамагчы чалавеку ў яго клопатах, справе. Толькі ў такім разе мусульманін лічыць сябе шчаслівым.

Вялікае шчасце для мусульманіна, калі ён далікатны з усімі людзьмі, з кім узаемадзейнічае ў суседстве – ці то на рабоце, вучобе, ці то па месцы жыхарства. Калі мусульманін згодна з правіламі мусульманскай маралі паводзіць сябе ў дачыненні да сваіх бацькоў, да радні і сваякоў. ...Мець добрых дзяцей – гэта непараўнальна большае шчасце, чым матэрыяльнае багацце, знаходжанне на прэстыжнай, каралеўскай пасадзе. ...Вялікае шчасце быць здаровым, мець добрых дзяцей, выконваць свой абавязак – абавязак мусульманіна» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1998, № 1, с. 3–4)*.

10. Ваша крэда?

«Трэба працаваць так, як быццам ты будзеш жыць вечна, але жыць так, як быццам сёння памрэш і ўжо нічым не паправіш сваіх правінкаў-грахоў» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1994, № 1, с. 5)*. Трэба «знайсці сабе занятак, які пакіне след у памяці нашчадкаў» *(«Байрам. Татары на зямлі Беларусі». 1997. № 2, с. 4)*. І яшчэ: Якуб Адамавіч быў паслядоўным у выкананні правіла, што свае добрыя справы мусульманін не павінен афішаваць, зробленыя патаемна і бескарыслівa, яны прыносяць людзям найбольш дабра.

Мір Вам і міласць Аллага Усявышняга!



Герб «Тапор» («Старжа»)
шляхоцкага рода Якубоўскіх



«Якуб Якубоўскі ў месяцовым святле».
Мастак Алесь Цыркуноў



Камайскі касцёл Яна Хрысціцеля, XVII ст. Фота А. Доўганя



Галоўны алтар касцёла, перад якім Браніслаў Руткоўскі частаваў дзяцей цукеркамі



Камайскі крыж, высечаны ў XV–XVII стст. з ружовага граніту. Фота С. Логвіна



Нямецкі абоз. Камаі ў час нямецкай
акупацыі, 1915 г.



Камайская сямігадовая школа, дзе ў 1938–1940 гг.
вучыўся Якуб Якубоўскі



Яніна Аніцэтаўна Пашкоўская,
першая настаўніца
Якуба Якубоўскага



Марыя Рыгораўна Бальшакова,
другая настаўніца
Якуба Якубоўскага



Яніна Пашкоўская з вучнямі на экскурсіі,
1930-я гг.



Мячэць у Відзах, знішчаная ў гады Першай сусветнай вайны



Новая мячэць у Відзах, мінарэт.
Фота Тамаша Вісьнеўскага, 1935 г.



Відзы. Касцёл Нараджэння
Найсвяцейшай Дзевы Марыі



Хата Якубоўскіх у Відзах



Мізар у Відзах, дзе пахаваныя продкі
Якуба Якубоўскага



Сям'я Якубоўскіх: маці Раіса Хасенеўна, бацька Адам Мустафавіч, сыны: Адам (паміж бацькамі), злева Якуб, за бацькамі Хасень, 1941 г.



Старшакласнік Якуб з сябрам
Уладзікам Малашэнкам, 1949 г.



Сям'я Якубоўскіх: стаяць браты Адам, Якуб, Браніслаў,
сядзяць Канстанцін з жонкай і дочкамі, маці Раіса, бацька Адам, 1962 г.



Якуб Якубоўскі (трэці злева ў другім радзе) з настаўнікамі і сямікласнікамі Тракішскай школы, 1952 г.



Якуб Якубоўскі, 1972 г.



Адам Якубоўскі,1960 г.




Якуб з жонкай Таццянай, 1965 г.



Галіновая рэдакцыя геаграфіі і геалогіі, 1975 г. Верхні рад, злева направа: Ігар Афнагель, Ала Шаўрова, Якуб Якубоўскі. Ніжні рад, злева направа: Вера Варанцова, Валянціна Вераценнікава, Іна Несцяровіч



Якуб Якубоўскі на адпачынку з сябрам Уладзімірам Малашэнкам, 1976 г.



У Сцяпана Рыгоравіча Троцкага ў гасцях сын Якуба Кастусь, Браслаў, 1990 г.



Якуб Якубоўскі з унучкамі Тоняй і Вікай, 1994 г.



Адам Адамавіч і сын Якуба Кастусь гасцююць на лецішчы Ібрагіма Канапацкага ў Смілавічах, 2000 г.



Сын Якуба Якубоўскага Канстанцін, канструктар авіяматораў, 2010 г.



Дачка Якуба Якубоўскага Аўгіння, архітэктар, 2015 г.



Анатоль Белы і Анатоль Грыцкевіч уручаюць Якубу Якубоўскаму дыплом і медаль Міколы Шчакаціхіна, 22 сакавіка 1998 г.



Разалія Александровіч і Таццяна Якубоўская агучваюць уяўнае інтэрв'ю з Якубам Якубоўскім, 17 красавіка 2012 г.



На Смілавіцкім мізары жонка Якуба Таццяна Якубоўская, 2000 г.

Сябры рэдактарскай групы часопіса «Байрам»





Ібрагім Канапацкі



Яўген Гучок



Разалія Александровіч



Зміцер Чымбаевіч



Ісмаіл Александровіч



Сям'я Пашкоўскіх: Людвіка, Яніна, Уладзіслаў,
Багдан, Генрык, 1949 г.



Ірэна Грыбоўская расказвае Івану
Драўніцкаму пра Пашкоўскіх. Камаі, 2008 г.



Творчыя набыткі – кнігі жыцця Якуба Якубоўскага

УСПАМІНЫ СЯБРОЎ І ПАПЛЕЧНІКАЎ

ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ

Ісмаіл Александровіч

Якуб Якубоўскі быў сумленным, сціплым, адданым нашай агульнай справе мусульманінам. Гэты чалавек абраў для сябе адзін з найцяжэйшых кірункаў дзейнасці – асвету татараў у галіне нашай гістарычнай, культурнай і рэлігійнай спадчыны, абуджэння і прарастання ў кожным асобна яго этнічнай самасвядомасці, замацавання каштоўнасных арыенціраў і накіравання энергіі, ведаў на адраджэнне і захаванне традыцый, культуры, мовы беларусаў.

Якуб Адамавіч быў ініцыятарам падрыхтоўкі энцыклапедычнага даведніка аб татарах Беларусі, Летувы і Польшчы. Ён здолеў сабраць вялікі матэрыял, склаў агульны спіс усіх артыкулаў. Спробныя (узорныя) артыкулы розных аўтараў змяшчаў у часопісе «Байрам», галоўным рэдактарам якога сам і з'яўляўся ад першага нумара да надрукаванага ўжо пасля яго смерці першага выпуску за 1998 год.

Наш абавязак – спрыяць таму, каб задуманыя і распачатыя ім справы, яго намеры мелі свай лагічны працяг. Гэта стане найлепшым праяўленнем памяці аб ім для тых, хто не быў знаёмы з ім асабіста, але павінен ведаць, што ён жыў сярод нас. Нашыя нашчадкі з удзячнасцю будуць дакранацца да вынікаў бескарыслівага служэння свайму народу першапраходца Якуба Адамавіча Якубоўскага.

ДУША ТАТАРСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Ібрагім Канапацкі

Чалавек энцыклапедычных ведаў – лінгвіст, гісторык, культуролаг, географ Якуб Якубоўскі ў канцы 1980-х гадоў стаяў ля вытокаў беларускага і татарскага Адраджэння. Ён добра разумеў, што без адраджэння беларусаў немагчыма вырашыць і праблемы беларускіх татараў.

Ён быў душой татарскай супольнасці, яскравым прыкладам служэння свайму народу, сваёй Бацькаўшчыне – Беларусі. Сталі хрэстаматыйнымі яго словы: «Нас, татараў, разам з беларусамі дзесяць мільёнаў». Ён быў аўтарам звароту з нагоды рэферэндуму да супляменнікаў, усіх грамадзян Беларусі (травень 1995 г.), які падпісалі лепшыя прадстаўнікі татарскай інтэлігенцыі. Бо спадзяваўся, што на рэферэндуме татары Беларусі, як старажылы, так і пазнейшыя пасяленцы, выкажуцца за беларускую дзяржаўную мову без агаворак, бо гэта праяўленне далікатнасці, павагі і шчырасці да народа, сярод якога жывуць татары, да краіны, дзе нарадзіліся нашы дзеці, дзе вечным сном спачываюць нашы продкі. Нашчадкі не даруюць нам здрады нашай Бацькаўшчыне.

За дасягненні ў даследаванні айчыннай гісторыі, культуры і рэлігіі беларускіх татараў, за актыўны ўдзел у татарскім і беларускім нацыянальна-культурніцкім Адраджэнні Якуб Якубоўскі ў 1998 годзе быў узнагароджаны грамадскім Камітэтам ушанавання медалём Міколы Шчакаціхіна «За братэрскае спрычыненне ў развіцці навукі і культуры Беларусі» і дыпломам. Імя Якуба Якубоўскага занесена ў кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь».

Спадар Якуб любіў паўтараць: «Трэба працаваць так, быццам будзеш жыць вечна, а жыць так, як быццам апошні дзень працуеш». Ён браў удзел ва ўсіх імпрэзах, што праводзіла Беларускае згуртаванне татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб» разам з Мусульманскім рэлігійным аб'яднаннем у Рэспубліцы Беларусь, – вечарынах, навуковых канферэнцыях, урачыстасцях з нагоды татарскіх і мусульманскіх святаў. Ён з'яўляецца стваральнікам гімна татараў-мусульманаў Беларусі. У гэтым творы такія радкі: «Йшлі гады, і нашчадкі татар-мусульман беларускую мову з павагай прыдбалі. Але веру ў Аллага – свяшчэнны Іман мы на векі вякоў захавалі».

ЁН ПРАЦАВАЎ САМААДДАНА

Мустафа Канапацкі

Якуб Якубоўскі належыць да таго рэдкага тыпу людзей, якія пры жыцці самаадданай працай ствараюць сабе помнік. Вонкава звычайны, просты: невысокага росту, поўны, у акулярах. Але гэта толькі вонкава. Перад тымі, хто яго ведаў, ён паўставаў высокаадукаваным чалавекам, які аддаваў сябе ўсяго дарэшты людзям. Чалавек з вялікай літары, патрыёт сваёй Радзімы. Ён аднолькава балюча ўспрымаў

праблемы беларускага і татарскага Адраджэння, цалкам прысвяціў сябе гэтай высакароднай справе. Ужо цяжка хворы, Якуб Адамавіч працягваў сумленна працаваць: выдаваў часопіс-квартальнік «Байрам», распачаў падрыхтоўку да выдання энцыклапедычнага даведніка па гісторыі, рэлігіі і культуры татараў Беларусі, Летувы і Польшчы. Ён меў багаты жыццёвы досвед. Разважаў адначасова і як філосаф, і як практык, мог даць слушную параду. Нешматслоўны чалавек, ён мог коратка і трапна адказаць на кожнае пытанне. Спадар Якуб вельмі любіў Беларусь і хацеў бачыць яе вольнай і шчаслівай. Гэтую любоў і вернасць Радзіме ён пранёс праз усё жыццё.

СТВАРАЛЬНІК ГІМНА БЕЛАРУСКІХ ТАТАРАЎ

Іван Драўніцкі

Якуб Якубоўскі меў цвёрдую грамадзянскую пазіцыю. Выказваў яе і ў палкай прамове на мітынгу ў час Першай чачэнскай вайны, і ўдзелам у іншых мітынгах апазіцыі, на якіх звычайна трымаў у руках бел-чырвона-белы сцяжок з маладзіком і зорачкай пасярэдзіне – сцяг беларускіх татараў. Сваю любоў да Бацькаўшчыны выказаў у гімне беларускіх татараў «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі». Аднак аўтар слоў гімна доўга быў невядомы чытачам «Байрама», хоць надрукаваны яны былі ўпершыню сярод тэкстаў татарскіх песень ужо ў 1991 годзе *(«Байрам», 1991, № 4, с. 55)* разам з перакладам на крымскататарскую мову Ісмаіла Меметава. Спадар Якуб доўга не прызнаваўся, што такія годныя словы і спеўныя рыфмы належаць яму. Толькі настойлівая цікавасць Міхася Маліноўскага вымусіла яго прызнаць сваё аўтарства, пра што М. Маліноўскі распавёў у «Байраме» (1999, № 3, с. 43). Музыку да гімна пісалі татарскія кампазітары Алег Гембіцкі, Якуб Канапацкі і Дзінара Мазітава. Аднак на святах і імпрэзах часцей выконваўся гімн на музыку Дзінары Мазітавай.

Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі

Словы Я. Якубоўскага,
муз. Дз. Мазітавай

Мы з Паволжа і Крыма з Іманам прыйшлі
На гасцінныя землі Літвы й Беларусі.
Пад Грунвальдам суровы экзамен здалі
І уланскую службу няслі без прымусу.

Рэфрэн: Ляй лагу іллялагу, Мухамед расул Аллагу,
Ляй лагу іллялагу, Мухамед расул Аллагу.

Мы зляпілі дамы, пры ауле сваю
Для малебнаў Аллагу мячэць збудавалі.
Нарадзілі дзяцей, асвяцілі зямлю
І ў яе па ісламу памерлых хавалі.

Рэфрэн.

На прызыў Спадара ў любую пару
Батыры сваіх коней сядлалі,
Жонак бралі сваіх, каб варылі яду
І знявечаных у баях даглядалі.

Рэфрэн.

Служба цяжкай была, у суровых баях
Шмат галоў маладзецкіх паклалі.
За адвагу і мужнасць татарскім сынам
Каралі прывілеі давалі.

Рэфрэн.

Йшлі гады, і нашчадкі татар-мусульман
Беларускую мову з павагай прыдбалі.
Але веру ў Аллага – свяшчэнны Іман
Мы на векі вякоў захавалі.

Рэфрэн.

ЯК СВЯТЛО І ЯК СУСВЕТ

Разалія Александровіч

Беларусь – Зямля Асветнікаў. Яны яе воі і яе аратыя. Яны яе духоўнікі. Асветнікі набліжаны ў Беларусі да святых. Яны, перадаючы з рук у рукі прамяністы агонь, асвятляюць свайму народу шлях у Сусвет.

Пачаўшы гаснуць у сэрцах беларускіх татараў агеньчык еднасці і ведаў аб сабе ахінуў, удыхнуўшы ў яго свежае паветра, Якуб, сын Адамаў, Якубоўскі. Менавіта гэты самавіты (самастойны, паважны, дасведчаны) чалавек быў абраны Усявышнім Аллагам дзеля здзяйснення Вялікага наканавання – стварэння ў 1991 годзе першага друкаванага выдання беларускіх татараў – штоквартальнага часопіса «Байрам».

28 нумароў! З імі ён пражыў кожны радок, кожны артыкул. «Байрам» – гэта наш знак у сусвеце агульначалавечым. Знак аб нашай веры, аб нашых зямных справах, аб нашых надзеях. Надоўга наперад вызначыў раздзелы, тэматыку, дух «Байрама» чалавек, які не

любіў казаць «Я», але, ведаючы, што яго літара завяршальная ў алфавіце, закончыў свой зямны шлях плённа і годна – дадзеныя яму Аллагам розум і сілы аддаў свайму народу і зямлі, якая стала нам, татарам, роднай. Якуб Якубоўскі пакінуў пасля сябе глыбокі след, але найперш і на зачын – часопіс «Байрам» і верш-гімн «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі», а таксама энцыклапедычную спадчыну.

Калі развіццё нацыі на ўзроўні вуснай перадачы з пакалення ў пакаленне духоўных каштоўнасцяў вычарпана, на дапамогу прыходзяць кнігі. Праз стагоддзі татары-мусульмане захоўвалі сваю еднасць на новай Радзіме дзякуючы галоўнай кнізе – Святому Кур'ану. Яго моц і яго вечныя словы далі магчымасць татарскаму народу не згубіць сябе, яны былі падтрымкай штодня і ў кожнай падзеі. На землях Беларусі, Летувы і Польшчы татары стварылі ўнікальныя рукапісныя помнікі, сярод якіх асабліва вылучаюцца «Кітабы».

Часам уздыму татарскага руху стаў 1925 год, а цэнтрам – Вільня, калыска нашага агульнага з беларусамі адраджэння. Тут было створана аўтакефальнае духоўнае ўпраўленне мусульманаў Польшчы, культурна-асветны звяз татараў і свае друкаваныя выданні на польскай мове, у тым ліку «Rocznik Tatarski».

Пасля гэтага штогодніка, год заснавання якога і год нараджэння Якуба Якубоўскага сімвалічным чынам супадаюць, «Байрам» стаў першым друкаваным словам татараў Беларусі на беларускай мове. Спадар Якуб не проста даў жыццё нашаму часопісу і ўсяліў у яго душу, ён быў вельмі добрым бацькам: ні на адзін нумар не пакідаў без увагі сваё «дзіця». Менавіта першыя гады вызначальныя для фармавання асабовых якасцяў. За непрацяглы час часопіс не проста стаў на ногі, ён пачаў годна рэпрэзентаваць нашае згуртаванне. Паступова вызначаліся раздзелы. Змяшчаліся найперш пераклады Кур'ана на беларускую мову, артыкулы з будучага энцыклапедычнага даведніка пра татараў Беларусі, Летувы і Польшчы, матэрыялы канферэнцый. Спадар Якуб заўсёды прасіў паведамляць з месцаў наступныя звесткі: далі азан (правялі абрад надання імя немаўляці), узялі шлюб, адзначылі юбілей, а таксама жалобныя весткі. Такія традыцыйныя рубрыкі вельмі кранаюць, бо менавіта з гэтага складаецца жыццё.

Яго адчуванне важнасці для гісторыі самых разнастайных сведчанняў было надзвычай абвостраным. Ён не стамляўся іх збіраць, шмат каго прыцягваў да гэтай справы. Не пакінуў без ўвагі не толькі мяне, маю маму, Лілію Аляксандраўну, але і маю дачку Анжэлін.

І менавіта ёй выпала апошняй з нашай сям'і сустрэцца з Якубам Якубоўскім, каб перадаць складзеныя маёй мамай спісы ўдзельнікаў цырымоніі адкрыцця мячэці ў Наваградку. Як звычайна, спадар Якуб прыехаў на трамвайны прыпынак каля нашага дома. Гэтае месца для сустрэч было вызначана ім самім яшчэ ў той час, калі ён жыў недалёка. Ён не прызначаў іншага месца, а было ўжо лета, апошняе лета яго жыцця, і яго ногі былі такія слабыя... Прабачце нам, Якуб Адамавіч! Ваша хвароба прагрэсавала вельмі хутка, а ў нашым уяўленні вы былі здаровым і жыццядзейным. Таму, калі не стала айца Яна Матусевіча (1948–1998) – вечны спакой яму ў Царстве Божым, – і я збіралася ісці на яго пахаванне на Кальварыйскія могілкі, спадар Якуб быў першым, пра каго я згадала, каб пайсці разам. Менавіта з Якубам Якубоўскім мы былі там, дзе ў першых шэрагах знаходзіўся гэты беларускі святар, шчыры патрыёт Бацькаўшчыны: на ўшанаванні памяці ахвяраў палітычных рэпрэсій у Курапатах, на «Чарнобыльскім шляху». Хоць мы ніколі не гаварылі аб той падвіжніцкай справе, якую здзяйсняў айцец Ян, але, на мой погляд, яны з Якубам Адамавічам былі вельмі блізкія духам, падобныя ў самаахвярнасці і нават вонкава падобныя. Я ведала, як шануе спадар Якуб гісторыю Беларусі і яе лепшых людзей. Гэта ён некалі патэлефанаваў мне і сказаў пра адно з першых святкаванняў угодкаў Грунвальдскай бітвы. Мы пайшлі, каб разам з беларусамі схіліць галовы ў знак удзячнасці за мужнасць і нашых, татарскіх ваяроў-коннікаў і мужнага сына Тахтамыша – хана Джэлал-эд-Дзіна.

Разам прысутнічалі на сустрэчах сяброў менскай суполкі Згуртавання наваградцаў свету. У падобных выпадках ён з характэрным і вельмі адметным гумарам, за якім была шчырасць і адкрытасць, казаў: «Такім чынам, тут прадстаўлены ўсе татары: ад А (Александровіч) да Я (Якубоўскі)». Гэта быў не толькі жарт. Ён імкнуўся падтрымліваць зычлівае стаўленне грамадства да нашай нешматлікай ў Беларусі супольні. Быў вельмі ўдзячны людзям іншых нацыянальнасцяў, а найперш гаспадарам гэтай зямлі, за ўсякую добрую справу для татараў. Марыў аб заснаванні спецыяльнага знака «Заслужаны перад татарамі».

Якуб Якубоўскі ўмеў бачыць і шанаваць кожнага чалавека. Пачуўшы ад некага аб няпростым лёсе пажылой наваградчанкі па прозвішчы Асановіч (па мужу), прыехаў у Наваградак, каб самому пачуць яе аповед. Жанчына дажывала свой век у сям'і прыёмнай дачкі, якую выхоўвала з маленства. А з далёкай Англіі ў Наваградак ішлі пасылкі

і лісты ад нявесткі, з якой яны ніколі не бачыліся. Дзвюх жанчын аб'ядноўваў дарагі ім мужчына: для адной – сын, а для другой – муж. Малады Асановіч паехаў перад вайной у Боснію вучыцца на мусульманскага святара. Вайна абрала яму новы дом, а пасля і месца вечнага спачыну. Калі яго не стала, у Англіі засталася жонка, для якой маці мужа ў далёкай Беларусі была адзінай сувяззю з яе каханым. Хоць так яна старалася аддзячыць свекрыві за выхаванне сына. Але ж гэта апошнія гады з жыцця спадарыні Асановіч, а колькі было ўсяго... Якуб Адамавіч вельмі ўсцешыўся, калі даведаўся, што перад ім адна з ягоных жывых бабуль, хоць і стрыечная. З той пары пачалі ўсе тры браты Якубоўскія праз маю маму перадаваць у Наваградак грошы для сваёй бабулі. Ведаю таксама пра жаданне Якуба Адамавіча запісаць успаміны яшчэ адной наваградчанкі, якая ў 1930-х гадах у часы сваёй маладосці ўваходзіла ў склад жаночай каманды «Strzelcy» і была адзначана як спрытны стралок.

Ніколі не забуду, як ён быў заклапочаны, калі з адной з газет яму перадалі ліст дзяўчыны-сіраты. Яна выхоўвалася ў інтэрнаце, пасля пачала працаваць і зноў жыла ў інтэрнаце. Мела праблемы ва ўзаемадачыненнях з суседкамі па пакоі, бо не падзяляла іх звычак. Як ён шукаў найлепшы, найбольш далікатны і, па магчымасці, дзейсны сродак дапамагчы сіраце! А гэта адна з запаведзяў Кур'ана. Ён жа ніколі не лічыў сябе дасканалым у гэтым сэнсе. Рабіў вялікае, а лічыў сябе самым звычайным. Але часам, гледзячы, як ён сціпла сядзіць у куточку, прыйшоўшы не сябе паказаць, а паслухаць іншых, міжволі адчувалася яго сталая велічнасць і нейкая адлучанасць ад зямных турбот.

Калі казаць пра пазначаных Богам, то спадар Якубоўскі адзін з іх. Я бачу нават магічнасць у адмераных яму гадах жыцця. Якуб Адамавіч пражыў як мінімум два жыцці. Іх працягласць можна палічыць як шэсцьдзясят і шэсць, апошнія – праца над «Байрамам». Гэта можа быць і два разы па трыццаць тры. Але галоўнае, напэўна, тое, што ён здолеў аб'яднаць у адно жыццё татарына па спадчыннасці і грамадзяніна Беларусі па адданасці нашай зямлі.

Кожны раз, калі сустракаюся з праявамі шчырай увагі да нашай супольнасці з боку прадстаўнікоў тытульнага народа, узгадваю Якуба Якубоўскага і яго мару аб стварэнні ад імя татараў спецыяльнай узнагароды. Калі ў 2009 годзе выйшаў на беларускім тэлебачанні цыкл «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў» з чатырох частак па 25 хвілін, вельмі хацелася адзначыць аўтара, вядучага і рэжысёра Аляксандра Матафонава. Вялікай падзякі заслугоўвае таксама дзей-

насць Лілііі Коршун, вядучай на Беларускім радыё праграмы «Супольнасць», у якой сярод прывітальных слоў гучала і «Салям алейкум» Ібрагіма Канапацкага, часта выступалі прадстаўнікі татарскай інтэлігенцыі.

І ўсё ж узнагарода ад імя татараў ужо існуе. Яе заснавалі польскія татары – гэта медаль «Хана Джэлал-эд-Дзіна» (medal «Chana Dżelal Ed Dina»). У Польшчы ўсталяваны і адзіны на тэрыторыі былых Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай помнік татарам, на адкрыцці якога выступаў з прамовай прэзідэнт Браніслаў Камароўскі. А ў поліканфесійным Іўі на галоўнай плошчы ў 2012 годзе пастаўлены адзіны ў свеце помнік чатыром канфесіям, што ў згодзе суіснуюць у Беларусі – праваслаўнай, каталіцкай, юдэйскай і мусульманскай – манумент «У гонар дружбы і адзінства канфесій Івейшчыны».

ДАРАГІ ЧАЛАВЕК

Юрась Качкоў

«Не говори с тоской – их нет,
а с благодарностию – были»
В. Жуковский

Многія гады спадар Якуб быў для мяне чалавекам, з якім дзяліў свае рэдкія радасці і частыя засмучэнні, бо мы разам працавалі і сябравалі. Гутаркі з ім замянялі чытанне кніг, наведванне тэатраў, слуханне лекцый. Ён нам, яго малодшым таварышам, быў і ўніверсітэтам, і энцыклапедыяй, і акадэміяй жыцця. Складалася ўражанне, што ён ведае ўсё. Быў нястомным генератарам ідэяў і задумаў ў розных, часам зусім нечаканых, пытаннях прыродазнаўчых, гуманітарных і грамадскіх навук, з імпэтам, не без гумару, імкнуўся давесці табе сваю чарговую цікавую, дасціпную, часам парадаксальную ідэю.

Якуб Якубоўскі не стаў вучоным у фармальным сэнсе, не атрымаў такіх пажаданых і прэстыжных у былыя часы (ды і цяпер) вучоных ступеняў і званняў, аднак яго аўтарытэт быў значна вышэйшы за некаторых дактароў навук, а веды перасягалі іх навуковы багаж. І ёсць вядомыя людзі, якія дзякуючы яго ідэям і праектам дасягнулі поспеху ў навуцы.

Ён быў чалавекам высокай маралі. Сумленнасць, прыстойнасць, моцнае пачуццё адказнасці за справу вылучалі яго сярод нас і ў застойныя гады, і ў часы перабудовы, і ў цяжкія гады (са страчанымі

момантамі надзеі) адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і ўсведамлення сваёй адметнасці кожным народам, які жыве ў Беларусі. Спадар Якуб быў сумленнем таго калектыва, у якім яму даводзілася вучыцца ці працаваць – у школе, на геаграфічным факультэце БДУ, у здымачных атрадах Інстытута глебазнаўства, у рэдакцыйных аддзелах выдавецтва БелСЭ.

Дысцыплінаванасць і выключная стараннасць ў справах ішлі не ад патрабаванняў начальства, а былі яго сутнасцю. Ён не дазваляў сабе спазніцца на працу або раней часу пакінуць працоўнае месца, хаця многія лічылі гэта магчымым з-за мізернага памеру заробку. Праца для яго заўсёды была надзвычай важнай справай, нават калі ў ёй не адразу бачны пэўны сэнс. Незвычайная працавітасць і глыбокая зацікаўленнасць справай уражвалі, бо ў яго ўжо даўно былі праблемы з здароўем, быў дрэнны зрок. Якуб Адамавіч не мог, напрыклад, у часе палявой працы на здымцы глебавага покрыва прапусціць самы дробны контур з адметнай глебай і не закласці на ім кантрольны шурф (хоць інструкцыі дапушчалі экстрапаляцыю, а жорсткія нарматывы перашкаджалі якаснаму правядзенню абследавання), таму складзеныя ім карты вызначаліся дэталёвасцю і дакладным адлюстраваннем натуры. Яны да гэтага часу не страцілі сваёй актуальнасці і вартасці.

У рэдакцыі БелСЭ яго захапіла рэгуляваная стыхія выдавецкай справы, тут знайшоў ён сваё прызначэнне і змог годна ажыццявіць многія з сваіх ідэй і задум. Тут здольнасці і веды Якуба Якубоўскага былі незаменнымі.

Як географ і негарадскі чалавек, ён любіў і тонка адчуваў прыроду, дакладна вызначаў месца чалавека ў ёй. Добра ведаў і аддаленыя куткі нашай краіны, і блізкае навакольле мясцін, дзе даводзілася жыць. Быў фатографам-аматарам, на яго фотаздымках з мягкай лірычнасцю адбіліся задуменныя беларускія краявіды, прыгажосць азёр, прыязныя твары дзяцей і дарослых.

Ён любіў і шанаваў кнігі, сабраў багатую і разнастайную бібліятэку як у хаце, так і на працы. Кнігі па філасофіі, гісторыі, археалогіі, філалогіі, геаграфіі, батаніцы, заалогіі стаялі на паліцах разам з энцыклапедычнымі выданнямі, шматлікімі слоўнікамі, вызначальнікамі. Сярод іх знайшлося месца для класічнай паэзіі і прозы розных эпох і народаў. Вельмі любіў і глыбока разумеў паэзію антычнасці і старажытнага Усходу, быў у захапленні ад Гётэ. Якуб Адамавіч добра ведаў нямецкую і польскую мовы, размаўляў на цудоўнай беларускай мове і пры неабходнасці карыстаўся дасканалай расейскай.

Больш таго, ён заўсёды падкрэсліваў, што беларуская мова багатая і мілагучная, што мову народа, на зямлі якой вы пражываеце, дзе знайшлі сабе дом, абавязаны ведаць, калі паважаеце гэты народ.

Ён заўсёды адчуваў, што непакоіць душу народа, з болем спагадаў яго нялёгкаму гістарычнаму і сучаснаму лёсу, заўсёды падтрымліваў пакрыўджаных і абяздоленых. Якуб Адамавіч шмат рабіў, каб умацаваць дух, аднавіць гісторыю беларускай нацыі, яе адметную культуру, дапамагаў выдаваць і распаўсюджваць лепшыя помнікі мовы, літаратуры, культуры. Ён ставіўся да гэтага так аддана і добрасумленна, як і да адраджэння татарскага народа, выдатным сынам якога быў. Яго сімпатыя і падтрымка заўсёды былі на баку кожнага малога народа, прыгнечанага большым народам. Вось чаму спадар Якуб быў адным з нямногіх, хто ў 1995 годзе на агульнагарадскім мітынгу ў Менску выступаў у абарону чачэнскага народа.

Быў цудоўным палемістам. Яго логіка была бездакорнай, довады і аргументы цяжка было абвяргаць, трапныя параўнанні і эпітэты пранізвалі гаворку, што рабіла моцнае ўражанне на суразмоўцаў і слухачоў. У яго было выдатнае пачуццё гумару (перададзенае дзецям), ягоныя жарты і прыгаворкі звычайна не крыўдзілі людзей, а залагоджвалі напружаны момант. У яго быў вялікі запас мужнасці, які дапамог годна пераносіць злыбеды лёсу, а ў канцы жыцця – страшэнныя болі смяротнай хваробы. Ён рана пакінуў нас, калі так быў патрэбны. Але ён быў і жыў сярод нас.

Я СЯБРАВАЎ З ІМ СОРАК ГАДОЎ

Ігар Афнагель

Я сябраваў з Якубам Якубоўскім сорак гадоў, ад 1958 года, калі мы былі студэнтамі геафака БДУ. Мы працавалі разам у рэдакцыі геаграфіі, геалогіі і геафізікі выдавецтва БелСЭ больш за 20 гадоў. Хачу сказаць, што гэта быў незвычайны чалавек, які станоўча ўплываў на ўсіх людзей, якія сустракаліся з ім на шляхах жыцця. Ён нястомна вучыўся і за сваё жыццё атрымаў дыпломы па трох спецыяльнасцях ў ВНУ Менска, і ўсе яны былі з адзнакай. Але гэта не так значна, як яго незвычайныя чалавечыя якасці і энцыклапедычная эрудыцыя. Глыбокая ўніверсальнасць ведаў і асаблівасці яго натуры вылучалі яго і рабілі прыцягальным для людзей. Ён быў адданым патрыётам Беларусі, ведаў і шанаваў яе гісторыю, культуру і мову. Яго веды ў гэтых абсягах намнога перавышалі агульнавядомыя. Беларуская мова, якой ён заўсёды карыстаўся,

была сакавітай, натуральнай, літаратурнаўзорнай і народнай у самым высокім сэнсе. Яго характарызавалі выдатныя чалавечыя якасці – дабрыня, памяркоўнасць, талерантнасць, прага пошукаў ісціны.

На працягу многіх гадоў Якуб Адамавіч быў загадчыкам рэдакцыі, і, на маю думку, найлепшым загадчыкам. Дасканалае валоданне беларускай мовай, веданне польскай, нямецкай і, зразумела, расейскай моваў спрыяла яго прафесіі энцыклапедыста. Ён як загадчык дапамагаў супрацоўнікам рэдакцыі ва ўсім і заўсёды. Калі хто-небудзь адмаўляўся рэдагаваць цяжкі або нестандартны артыкул, Якуб Адамавіч браўся за яго сам і даводзіў да ладу. Браў на сябе больш, чым іншыя загадчыкі. Пры падрыхтоўцы шматлікіх энцыклапедычных артыкулаў не спыняўся на палове шляху, імкнуўся палепшыць кожны артыкул да апошняга этапа падрыхтоўкі – амаль да друку. Яго энцыклапедычная дзейнасць была высока ацэнена, і ў 1976 годзе разам з шэрагам супрацоўнікаў БелСЭ ён атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР за стварэнне 12-тамовай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (1971–1976).

Якуб Адамавіч стаў адным з першапраходцаў беларускай энцыклапедычнай справы, і гэта было звязана з дадатковымі цяжкасцямі: распрацоўкай тэрміналогіі, слоўнікаў (рэестраў), напісаннем геаграфічных назваў і г. д. Усе артыкулы і ілюстрацыі тады праходзілі жорсткую цэнзуру. Вельмі цяжкай праблемай быў пошук аўтараў. Не ўсе геаграфічныя і геалагічныя тэмы былі дастаткова распрацаваныя, былі закрытыя і паўзакрытыя (географы 1930-х гадоў, або польскамоўныя і інш.). Ён быў генератарам новых ідэй у энцыклапедычнай справе. Самая выдатная яго ідэя, дасканала распрацаваная на ўсіх стадыях, – пяцітамовая «Энцыклапедыя прыроды Беларусі», якая і на сённяшні дзень з'яўляецца адзінай у краінах былога СССР. Былі ў яго каштоўныя ініцыятывы ў шэрагу іншых выданняў (пра гарады Беларусі, гістарычныя выданні). Яго ўдзел у агульнаэнцыклапедычным абмеркаванні макетаў артыкулаў быў заўсёды максімальна грунтоўным, рознабаковым, часта нават разгромным (гэта не ўсім падабалася), што міжволі выяўляла яго вялікую эрудыцыю ў самых розных галінах ведаў. Ён не шкадаваў свайго часу, часта працаваў на сваім рабочым месцы ў БелСЭ ў выходныя і святочныя дні, і ні адзін з сваіх адпачынкаў не выкарыстоўваў поўнасцю. Ён часта гаварыў мне: «Ігар, у чалавека павінна быць адно хобі – праца». Гэта было яго адрозненне ад шмат якіх супрацоўнікаў. Адзіным яго сур'ёзным недахопам было тое, што не зважаў на стан свайго здароўя. Мала хто ведаў, што Якуб Адамавіч з юнацтва быў інвалідам па зроку. Гэта

ўскладняла яму жыццё, прымушала карыстацца не толькі акулярамі, але часам і павелічальным шклом. А калі ён сур'ёзна захварэў, выявілася, што ў паліклініцы на яго нават не заведзена картка. Ён пражыў толькі 66 гадоў. Яго творчы патэнцыял яшчэ далёка не быў вычарпаны, і ён мог стварыць шмат новага, і вельмі шкада, што ён так рана пайшоў ад нас.

Але зрабіў вельмі важнае – разам з Таццянай Васільеўнай стварылі выдатную сям'ю, выхавалі дачку-архітэктара і сына-авіяканструктара, якія, працягваючы сямейную традыцыю, дасягнулі поспехаў у сваіх галінах. Я ўпэўнены, што для сваіх нашчадкаў, а таксама для ўсіх, хто яго ведаў, Якуб Якубоўскі будзе прыкладам у жыцці і дзейнасці. А ў яго было неабсяжнае кола знаёмых, з многімі ён сябраваў на працягу ўсяго жыцця. Любіў прымаць гасцей, вельмі клапаціўся пра сваіх братоў і бацькоў, якія апошнія гады свайго жыцця, ужо нямоглыя, знайшлі прытулак у ягонай сям'і.

Калі спадар Якуб пайшоў на пенсію, то шмат зрабіў для беларуска-татарскага адраджэння. Быў прыхільнікам дэмакратычнага развіцця Беларусі, да самых апошніх дзён па магчымасці ўдзельнічаў у адпаведных грамадскіх акцыях і імпрэзах 1990-х гадоў у Менску. Ён застанецца ў гісторыі Беларусі як выдатны энцыклапедыст, патрыёт, Чалавек з вялікай літары, унікальны сваімі ведамі і маральнымі якасцямі.

БЕЛАРУСКІ ТАТАРЫН ЯКУБ ЯКУБОЎСКІ

Яўген Гучок

Па-дзіцячаму чысты і, можа, нават крыху наіўны, Якуб Якубоўскі быў мудрым чалавекам. Да ўсяго яшчэ і інтэлектуалам, пры гэтым пастаянна займаўся самаадукацыяй. Увогуле спадар Якубоўскі быў вялікі працаўнік. А таму чаго ён толькі не ведаў! І нядзіўна, што, як настаўніка дзеці, яго вучні вельмі любілі яго. Амаль з дня заснавання энцыклапедычнага выдавецтва працаваў загадчыкам навукова-галіновай рэдакцыі геаграфіі, геалогіі і геафізікі. Пры яго чынным удзеле пабачылі свет не толькі такія салідныя навуковыя выданні, як «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (12 тамоў), але і папулярныя выданні: «Блакітная кніга Беларусі», даведнікі «Геаграфія Беларусі», «Геаграфічныя паняцці і тэрміны», аднатамовік «Прырода Беларусі» ды інш. Як падагульненне пералічанаму ў 1983–1986 гадах там выйшла ў пяці тамах «Энцыклапедыя прыроды Беларусі». Зноў жа, творчая прысутнасць у ёй Якуба Якубоўскага відавочная.

Свабодна валодаючы расейскай, польскай і нямецкай мовамі, Якуб Якубоўскі ў сям'і, на працы ды ў іншых месцах спрэс карыстаўся мовай беларускай. Быў адным з галоўных ідэолагаў татарскага адраджэння ў Беларусі. Фармаваў і рэдагаваў кожны нумар штоквартальнага часопіса «Байрам», ствараў «Энцыклапедыю татараў Беларусі». Заўважым, што беларускія татары ў свой час страцілі сваю мову і таму перайшлі на мову карэннага насельніцтва іх новай Радзімы.

Дома над ложкам Якуба Якубоўскага месціўся бел-чырвона-белы сцяг з паўмесяцам. Да канца жыцця ён заставаўся сябрам Таварыства беларускай мовы, заўсёды рэгулярна плаціў сяброўскія складкі, плюс да іх часта рабіў грашовыя ахвяраванні на развіццё беларускай мовы. Пакуль былі сілы, не прапускаў ніводнага мітынгу ў падтрымку беларускай незалежнасці і дэмакратыі.

Апошнія гады свайго жыцця Якуб Якубоўскі цяжка хварэў, але ніколі і нікому не скардзіўся на нездароўе. Як сапраўдны мусульманін пераносіў гэта цярпліва, мужна, па-філасофску, мудра.

Памёр Якуб Адамавіч 14 верасня 1998 года ў Менску. Пахаваны на татарскім мізары ў Смілавічах. На помніку на ягонай магіле напісана па-арабску і па-беларуску: «Аллагу належым і да яго вяртаемся».

Якуб Якубоўскі быў ва ўсіх сэнсах шчодры, гатовы заўсёды прыйсці на дапамогу, дзяліць з табой тваю сапраўдную радасць, не здольны пакрыўдзіць чалавека, прынізіць яго годнасць. І яшчэ: здольны глянуць за межы жыцця зямнога, людскога.

У маіх успамінах ён застаўся асобай вялікай і адначасова сціплай. Памяці незабыўнага старэйшага таварыша прапаную свой верш.

Я сёння ў сне Якубоўскага бачыў,
Ён мілай усмешкай мяне азадачыў.
А змест той усмешкі гранічна быў просты –
Што мудрасць людская як птах – і бяскрылы, і бясхвосты.

СЛУЖЫЦЬ ІСЦІНЕ ДЗЕЛЯ ІСЦІНЫ

Філасофія энцыклапедычнай справы

Вячаслаў Вайткевіч

Сёння пад магутным валам інфармацыі мы пачуваемся ніякавата, часам не ведаючы, як з ёю ўправіцца. Таму цікава звярнуцца да мудрага досведу мудрага чалавека, аднаго з пачынальнікаў беларускай энцыклапедычнай веды. Такіх людзей філосафы – будзем

спадзявацца, яны ёсць сярод нас – вызнаюць так: класічная душа. Няхай я загіну, але няхай жыве ісціна – вось галоўны прынцып класічнай душы. Спраўдзіць жа ісціну льга пры ўмове, што мы суадносім, сувымяраем сябе з чымсьці вышэйшым, сутнасным – ens a se. Гэта ўжо мудрасць усечалавечай культуры. Так, яшчэ на золку сусветнай філасофіі для старажытных грэкаў «...неба было асаблівым, гарманічна ўладкаваным прадметам, назіраючы які, можна ўвесці парадак у неўпарадкаваныя і разбураныя рухі чалавечай душы. Стан чалавечай душы ў часе разбураецца. Аднак, як я казаў вам, і рассыпаны на тысячы аскепкаў, ён можа быць прыведзены ў парадак сувяззю чалавека з якойсьці гармоніяй. Не з гармоніяй, якую ён адкрывае, а з гармоніяй, якая ўжо ёсць наглядна і фізічна, даступная агляду» (Мераб Мамардашвили. Мой опыт не типичен. – СПб, 2000, с. 81–82). Магчыма, і задоўгая цытата, але яна вельмі слушная для разумення высокіх праяваў чалавечай дзейнасці, у тым ліку мыслядзейнасці, якой абавязана тварэнне энцыклапедый. Шматтамовыя энцыклапедыі рыхтуюцца цэлымі калектывамі – аўтарскімі, рэдактарскімі, выдавецкімі. А прафесіяналізм энцыклапедыста – гэта не «ўсёведанне», як нам здаецца, а перш-наперш веданне таго, што і як трэба рабіць, каб бездакорна аўтарытэтная энцыклапедыя (такі яе статус), кожны фаліянт якой лашчыць рукі сваёй важкасцю, стала б зборам, зводам назапашаных і – вельмі істотна – сістэматызаваных, структураваных, прыведзеных у парадак ведаў. Больш за тое, каб яна спараджала ў карыстальнікаў імкненне да новых ведаў, да самастойнай думкі, да непадробных духоўных каштоўнасцяў. А для гэтага трэба аддаць ёй талент адкрывальніка і талент самаахвярных пошукаў ісціны. Гэта сапраўдныя таленты Якуба Якубоўскага, энцыклапедыста сярод энцыклапедыстаў. Зрэшты, калі каго і можна назваць усёведам, дык якраз спадара Якуба (які меў, дарэчы, тры вышэйшыя адукацыі – гістарычную, геаграфічную, філалагічную). Яго акадэмічную дасведчанасць, яго жыццёвую абазнанасць трэ' было б характарызаваць таксама па-класічнаму – вучонасць, многавучонасць. Ды цяпер так не кажуць, а дарма. Вершы самых розных паэтаў, напрыклад, ён мог чытаць на памяць, не стамляючыся, – сутак не хопіць. Проста дзіва, што пры такой нагружанасці ўсялякімі сэнсамі, тлумачэннямі, весткамі зберагаў чысцюткаю свежасць успрымання. Бывала, казанае-пераказанае, чытанае-перачытанае, а ён, той яшчэ гарэзнік, ажыўляў яго іскрынкамі, бліскаўкамі іроніі дый пяшчотнай самаіроніі, што стымулявалі, будзілі думанне. Дасціпнасцю,

вынаходлівасцю ў слове скараў усіх – што бойкую кампанію, што паважную аўдыторыю. Яго трапна-нечаканыя параўнанні, асацыяцыі, парадоксы былі роднасныя мастацкім тропам, і шкада, што ніхто не здагадаўся іх запісваць. Яго гумар святіўся глыбокай інтэлектуальнай культурай, чаго не падробіш, не зымітуеш. Глыбока інтэлектуальным быў увесь воблік гэтай абаяльнай у сваёй цэласнасці асобы.

Вось тут мы вернемся да зорнага неба. Тварэнне энцыклапедыі, па сутнасці, змястоўна неабсяжнае, як і прастора над намі. Лічыцца справядлівым меркаванне фізікаў пра пашырэнне Сусвету, а сучасная філасофія цвердзіць мыслёвае і псіхалагічнае пашырэнне чалавека праз тэксты, праз мову навуковага і ўсякага іншага пазнавальнага апісання: яркія кнігі Герберта Маршала Мак-Люэпа «Галактыка Гутэнберга», «Разуменне медыя. Знешнія пашырэнні чалавека» (абедзве 1963) – назвы гавораць самі за сябе. Далей, калі мы пагодзімся з прабацькамі еўрапейскага мыслення, што неба – «гарманічна ўладкаваны прадмет», які служыць нам узорам адмыслова прыводзіць у парадак зямныя, тутэйшыя справы, то бясспрэчна, што энцыклапедыя павінна быць узорна спарадкаваная і што гэтая спарадкаванасць уздымае яе змястоўна на ровень шматсэнсавага сінтэзу. Прычым не забывайма, што шукаем – дамагаемся гармоніі, у якой тоіцца ісціна.

Лёгка гэта казаць, ды не лёгка рабіць. Вывучку мець – трэба, эрудыцыю мець – добра. Але вялікая рэдкасць мець дар згледзець ідэю, натхніцца ідэяй. Мы часта прымаем за ідэю спакушальную ілюзію, фантазм. А ідэя, праз якую мы спасцігаем гармонію фізічную і метафізічную і тады – гармонію ў саміх сабе, даруецца ў адзінкавыя хвілі. Або людзям, якія абраныя лёсам мысліць ідэямі. Якуб Якубоўскі і быў з такіх абраннікаў. Ён бачыў і прадбачыў ідэю ўсю адразу, цалкам, менавіта ў гарманічным адзінстве. Яна прыходзіла яму жыванароджанай, уцялесненай, напоўніцу шматгалосай. Гэта не містыка. Такую дзівосную магчымасць працы нашай свядомасці Імануіл Кант тлумачыў, даслоўна, як ненаўмысную геніяльнасць. Чуць, бадай, неспадзявана? Ненаўмысная геніяльнасць – глыбінная і аб'ектыўная, а не суб'ектыўная праблема тэорыі спазнання.

Усе сілы ў свеце дзейнічаюць у паслядоўнасці, але адначасна яны непарыўна і непадзельна ўзаемазвязаныя між сабой, і на кожным кроку паслядоўнасці іх узаемасувязь ужо іншая, хоць яна абавязкова застаецца. Гэта ёсць ненаўмысная каардынацыя канцага ў бясконцым, здольнасць ухапіць яе адразу, цалкам, у непарыўнасці і непа-

дзельнасці і ёсць ненаўмысная геніяльнасць. Яна запраграмаваная прыродай у нашых галовах, хіба што галовы нашы не аднолькавыя… Узважым цяпер, якую шырачэзную і якую складаную каардынацыю мусіць ажыццявіць у сваёй свядомасці энцыклапедыст. Дальбог, каму многа даецца, з таго многа і патрабуецца. Перадусім неабходна здумаць і абгрунтаваць канцэпцыю – ідэю ідэй. Матэрыялу – бездань, і дух лунае над бездданню. Дзеецца тварэнне. Усё-ўсё павінна быць згодна з апошнім словам навукі спарадкавана: разгорнутая ў прасторы і часе сістэма паняццяў і тэрмінаў, таксанаметрычная (герархаічная) паўната прадметных групаў і класаў, парадыгмальныя нормы эксплікацыі, прычынна-выніковая залежнасць. Усё-ўсё ў полі зроку… Працуючы з артыкуламі на літару «А», думай пра літару «Я» – тая самая ўзаемасувязь, каардынацыя. Папярэдне прадуманай і спарадкаванай як няўхільны закон сеткай спасылак большая тэма падпарадкоўвае сабе меншую, аднак меншая мае роўныя з большай «правы грамадзянства». Ніякіх пустот, лакун, белых плямаў энцыклапедыя не церпіць. Калі дзесьці ўзнікла пытанне, у адпаведным томе, на адпаведнай старонцы забяспеч паўнацэнны адказ – самы правільны з магчымых. Нюанс, адценне – зусім не драбяза, або такая драбяза ў матэрыі энцыклапедыі, як субатамарныя часціцы ў фізічнай матэрыі. Энцыклапедыста ўвогуле можна параўнаць з незвычайным даследнікам, які спраўна карыстаецца і тэлескопам, і мікраскопам. Такі вось універсалізм. Скажуць, на тое яна і спецыялізацыя, каб «кожны на сваім месцы…». Так, але сапраўдны энцыклапедыст, зноў жа ў класічным разуменні, і вялікае, і малое абавязкова праводзіць праз сябе. Якуб Адамавіч быў, вобразна кажучы, – ды не вобразна, а насамрэч – і дойлід-праектант, і інжынер-распрацоўшчык, і сам жа муляр, тынкоўшчык, сталяр-чырвонадрэўшчык. Думаецца, хораша праявілася ў тым і нацыянальная рыса беларускіх татараў, так годна ўвасобленая ў ім. Хто сачыў за будзённым чорнарабочым рэдактарствам Якуба Адамавіча, той прызнае, што доля стваральніка энцыклапедыі не для слабых духам, а як для яго, дык шчаслівая. Што ён быў адораны бачыць і прадбачыць ідэю як гарманічнае адзінства, можна засведчыць і далікатнымі фактамі: яго дачка Аўгіння – архітэктар, а сын Канстанцін – канструктар у галіне самалётабудавання. Ім гэтаксама выпала жыць і працаваць з навукова-творчымі ідэямі. Шчасліва перадалося. Высакародная сям'я. Адухоўленая працавітасць яе ўнутрана мацавала. Жонка спадара Якуба, Таццяна Васільеўна, кандыдат геолага-мінералагічных навук, таксама агорала

непад'ёмнае, чаго вымагалі падбор-адбор і аналітычная апрацоўка матэрыялу па выкапнёвых раслінах. Мужавых аднадумцаў яна прымае і за сваіх аднадумцаў, тактоўна і зычліва памагае ім у справах, якія, ведае, радавалі б яго душу. Задум Якуб Адамавіч выношваў безліч. Дзяліўся ён імі на зайздрасць шчодра, шчыра. Яны былі, вядома, арыгінальныя, але пры тым, што называецца, канструктыўныя і прадуктыўныя. Будаваў Якуб Якубоўскі не на пяску.

Ён узначальваў рэдакцыю геаграфіі і геалогіі выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» (тады «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя») з самага першага тома. Розум і сэрца рэдакцыі. Рухавік рэдакцыйнага працэсу. А яшчэ яго чынны гаспадар, бо ўсё тут пачыналася з Якубоўскага і сыходзілася на Якубоўскім. За ўдзел у выданні ўніверсальнай 12-тамовай энцыклапедыі ён уганараваны Дзяржаўнай прэміі БССР за 1976 год. Ён жа быў галоўным ініцыятарам, ідэйным стратэгам і арганізатарам унікальнага выдання «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» ў пяці тамах, аналагаў якой няма на ўсёй постсавецкай тэрыторыі. Калектыў яе стваральнікаў таксама адзначаны Дзяржаўнай прэміі (а яму ж паводле правілаў другі раз атрымаць было нельга). Калі мы хочам вучыцца валодаць інфармацыяй, не толькі пашырацца, а менавіта валодаць інфармацыяй, то варта ўгледзецца ў форму, у структуру, з якімі паўстала ў гэтых тэкстах, апісаннях наша прырода. Тут усё арганічна, адзінства ў множнасці і множнасць у адзінстве. Тут і трысцінка – рэпрэзентатыўны факт. А чалавек, вядома, – паскалеўская трысцінка, якая розумам абымае сусвет. Энцыклапедыі – жывыя арганізмы. І як жывыя арганізмы, яны з гадамі старэюць. Але старасць энцыклапедыі – асаблівая старасць. Яна заўсёды хвалюе, яна заўсёды для нас каштоўнасць. У старой энцыклапедыі можна дазнацца пра тое, чаго не дазнаешся больш нідзе. Дый гаворыць яна з намі так, як мы гаварыць і слухаць паадвыкалі.

Хай не пакрыўдзяцца нашы найноўшыя энцыклапедысты, але ровень Якуба Якубоўскага становіцца быццам сімвалічным, каб быць на роўні сучаснай энцыклапедычнай веды. Не тое, што камусьці не стала таленту, адукацыі, рупнасці, апантанасці. Відаць, няпроста адкрываецца пакліканне служыць ісціне дзеля ісціны. Тым больш, што ўсемагутны інтэрнэт пачувае сябе найвышэйшай гаспадай спазнання. Вышэйшы, усё ж, гэты мудры досвед Якуба Якубоўскага: спазнаваць праз угляданне ў тое бясконцае, што над намі.

«ПРАЦА – ГЭТА ЁСЦЬ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ»

Міхась Маліноўскі

Да 70-годдзя Якуба Якубоўскага

Неяк па тэлебачанні я глядзеў кінафільм. Шчыра кажучы, спаў на ім, але ў адзін момант схамянуўся, бо чалавек сэрцам гаварыў тое, што сядзела ў ім і трывожыла яго душу, розум: «Спачатку я думаў аб задавальненнях, потым аб працы, а зараз зразумеў, што праца – гэта і ёсць задавальненне».

Тады адразу ж запісаў гэтыя словы. Калі яны паклаліся на паперу, дык чамусьці нібыта побач з сабою адчуў жывы подых дарагога і светлага для мяне Чалавека, вечнага Працалюба, Жыццялюба і самаадданага Творцу! Ён сам «уварваўся» ў маё жыццё, каб мяне яшчэ болей абудзіць, каб я яшчэ больш дбайна працаваў у імя яго маленькага, рупнага народа, які з'яўляецца самай арганічнай, самай неадлучнай, самай самабытнай і істотнай часткай нашай «краіны-браначкі». Што й казаць: «Праца – гэта ёсць задавальненне», «Памірай, а жыта сей», «Спяшайся рабіць, бо сёння гэта можа быць твой апошні дзень» – гэтыя яго словы так моцна ўвайшлі ў мяне, што нават кіруюць мною штодзённа.

Якуб Якубоўскі – гэта той Чалавек, з якім наканавана было мне сысціся. Я да яго «падбіраўся» паціху, але энтузіясты заўсёды апярэджваюць. Якуб Адамавіч праз армію сваіх прыхільнікаў, паслядоўнікаў, сяброў, прыяцеляў, памочнікаў сам знайшоў мяне, напісаў мне і сам прыехаў да мяне. У маёй кватэры назаўсёды засталіся гукі яго Вялікага і Шчырага Сэрца, яго гутаркі, яго падарункі. Засталіся яго ўвага, павага, абаянне, рознабаковыя энцыклапедычныя веды, мудрасць яго, любоў да Беларусі, беларускай мовы, літаратуры, культуры і гісторыі.

Спадар Якуб няраз казаў мне, што ён асабіста рады, ганарыцца, што нарадзіўся менавіта ў Беларусі. І як сапраўдны патрыёт, грамадзянін гэтай краіны, патрабаваў ад усіх павагі да жывога слова Бацькаўшчыны, дзе ён жыве, працуе, вучыцца, дыхае паветрам, п'е яе ваду!

Памятаю, як у другі прыезд да мяне ў Баранавічы Якуб Адамавіч пабачыў на маім стале І.Гётэ і прамовіў яго словы: «Калі чалавек стары, ён павінен больш рабіць, чым калі быў малады». Усе прыезды да мяне Якубоўскага былі яго асабістым гераізмам, бо ён меў цэлую процьму, як жартаваў, сімфонію хваробаў, якія ішлі за ім ад Другой

сусветнай вайны. І нават у знясіленым стане ў першую чаргу думаў аб працы, аб сваіх ідэях, аб тым, каб яны пераўтвараліся ў справы, дбаў аб сябрах і з упэўненасцю глядзеў у будучыню.

І тады, калі я прыязджаў да яго ў Менск на вуліцу Славінскага, у яго запоўненую кнігамі, часопісамі, газетамі, рукапісамі кватэру, дык і там бачыў, што спадар Якуб, як і ягоная жонка Таццяна Васільеўна, ніводнай хвіліны не адпачываюць. Я засынаў пры грукаце яго старэнькай канцылярскай машынкі і прачынаўся пад яе строкат, або ад водару страў, прыгатаваных ім або яго вернай і надзейнай суджанай. Што Якуб Адамавіч дзівосны кухар, адзначаў і вучоны з Швейцарыі Паўль Сутэр, з якім мы разам аднойчы гасцявалі ў Якубоўскіх.

Я вельмі шкадую, што не ўсе лісты Якуба Якубоўскага да мяне пабачылі свет у квартальніку «Байрам. Татары на зямлі Беларусі». Частка з іх была такой асабістай, што назаўсёды засталася ў маім сэрцы. Невялічкая частка карэспандэнцыі згінула ад затаплення маёй кватэры гарачай вадой. Добра, што тое здарылася, калі быў дома, дык паспеў захаваць кнігі, часопісы і газеты, дасланыя мне з Менска і сагрэтыя яго рукамі і подыхам.

Якуб Адамавіч быў зусім бескарыслівым чалавекам і ў сваім жыцці ніколі не меў аніякай выгады, нават вялікая ўзнагарода – дзяржаўнае лаўрэацтва – звалілася на яго, як мне ён сам казаў, зусім нечакана. Зразумела, гэта клопат аб ім праявіў Пётр Усцінавіч Броўка, які ўмеў падбіраць людзей, цаніць іх, даражыць імі і, вядома ж, завальваць працай і патрабаваць самаадданасці, вернасці, каб у кожную хвіліну абаперціся на гэтага чалавека.

У спадара Якуба было і ёсць шмат сяброў і паплечнікаў, самаадданая жонка, добрыя дзеці і ўнукі. Гэта яны ў свой час правялі свята яго памяці. Ініцыятарам гэтага ўшанавання ў 2002 годзе, як і выдання прысвечаных яму выпускаў квартальніка «Байрам. Татары на зямлі Беларусі» (1998, № 3 і 2002, № 42), быў яго паплечнік, вучоны, грамадскі і рэлігійны дзяяч Ібрагім Канапацкі. Аддаць даніну светлай памяці Якуба Адамавіча тады прышлі акадэмік Радзім Гарэцкі, слынны гісторык Анатоль Грыцкевіч, народны паэт Рыгор Барадулін, паэты Мікола Аўрамчык і Яўген Гучок, галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова» Міхась Шавыркін, вучоныя, музейшчыкі, супрацоўнікі «БелЭн імя Пятруся Броўкі», родныя яго і блізкія, сябры, прыяцелі, прыхільнікі, знаёмыя. Справядліва ў тыя дні народны паэт Рыгор Барадулін адзначыў: «У татарына Якава Якубоўскага бальшыні беларусаў трэба было вучыцца беларушчыне».

ВЕЧАРЫНА З НАГОДЫ 80-ГОДДЗЯ ЯКУБА ЯКУБОЎСКАГА

Таццяна Якубоўская

17 красавіка 2012 года ў сядзібе Таварыства беларускай мовы адбылася вечарына, прысвечаная 80-годдзю Якуба Якубоўскага.

Вечарына праходзіла пры перапоўненай аўдыторыі, удзельнікаў прывітала Алена Анісім, якая адкрыла імпрэзу і адзначыла, што яна праводзіцца Таварыствам беларускай мовы ў межах кампаніі «Будзьма». У адпаведнасці з традыцыяй беларускіх татараў на пачатку Мустафа Канапацкі прачытаў малітву – ясін на ўспамін пра Якуба Якубоўскага.

Далей рэй вялі беларускі паэт Яўген Гучок і даследніца гісторыі і культуры беларускіх татараў Разалія Александровіч. Яна нагадала аб цікавым гістарычным супадзенні – Якуб Якубоўскі нарадзіўся ў 1932 годзе, калі ў Вільні пад рэдакцыяй Леона-Наймана-Мірзы Крычынскага пабачыў свет «Rocznik tatarski» – першае выданне для татараў на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Так што дзейнасць Якуба Якубоўскага як стваральніка квартальніка «Байрам. Татары на зямлі Беларусі», можна сказаць, была перадвызначаная. Разалія перадала цёплыя вітанні ўдзельнікам ад народных паэтаў Ніла Гілевіча і Рыгора Барадуліна, якія па стане здароўя не маглі прысутнічаць.

Гісторык, даследчык нацыянальнага адраджэння на Беларусі прафесар Леанід Лыч выказаў занепакоенасць, што да гэтага часу не з'явілася асоба, якая змагла бы прадоўжыць справу Якуба Якубоўскага, што цяпер назіраецца пэўны заняпад нацыянальна-культурнага руху сярод татараў, аднак надзея на яго адраджэнне не згасае.*

Акадэмік Радзім Гарэцкі ўзгадаў аб плённай працы з Якубам Якубоўскім як загадчыкам рэдакцыі геаграфіі, геалогіі і геафізікі ў стварэнні «Энцыклапедыі прыроды Беларусі», ён ацаніў гэтае выданне як унікальнае; яно да гэтага часу не страціла сваёй вартасці як крыніцы звестак аб розных галінах прыродазнаўчай навукі ў Беларусі.

Калега па рэдакцыі ў БелСЭ Ігар Афнагель распавёў пра супольную працу, адзначыў, што спадар Якуб быў выключна дэмакратычным, эрудзіраваным, выдатна падрыхтаваным для энцыклапедычнай працы, з ім было цікава і павучальна працаваць.

---

* Адзначым, што ў 2014 годзе выйшаў з друку чарговы нумар часопісу «Байрам. Татары на зямлі Беларусі» як штогоднік. Адказны за выпуск Іосіф Якубоўскі (гл. на сайце *www.tatbel.by*).

Ігар Яўгенавіч засведчыў, што ідэя стварэння «Энцыклапедыі прыроды Беларусі» належала менавіта Якубоўскаму, ён здолеў яе ўвасобіць паводле сваёй задумы. Паэт Васіль Жуковіч прачытаў свой шчымлівы верш «Быў святлом ён гаючым», прысвечаны светлай памяці Якуба Якубоўскага. На вечарыне гучала шмат паэзіі – вершы Рыгора Барадуліна, Яўгена Гучка, пераклады Міхася Маліноўскага. Хоць на вечарыне абмяркоўваліся і сур'ёзныя пытанні, паэзія надавала дзеі лірычны настрой.

Міхась Маліноўскі ў сваім выступе распавёў пра сяброўства і дапамогу Якуба Адамавіча ў яго выдавецкіх справах, падараваў сям'і свае кнігі, у якіх ёсць успамін пра Якубоўскага.

Мастак Алесь Цыркуноў прэзентаваў створаны да 80-х угодкаў з дня народзінаў партрэт Якуба Якубоўскага, на якім усе ўбачылі ўзнёслы, светлы, духоўны вобраз шляхотнага інтэлігента, які з надзеяй углядаецца ў будучыню, а за ім на старажытным мізары пакаленні продкаў, што палеглі на зямлі беларусаў у змаганні за яе волю, з постаццю прывіда, які нагадвае Вялікага Беларуса, што ўсё яшчэ блукае ў пошуках лепшай долі.

Выступілі з успамінамі таксама сябры, што вучыліся разам з Якубам Якубоўскім ва ўніверсітэце, цяпер самі выкладчыкі ўніверсітэтаў – Анатоль Лепешаў і Ядвіга Аношка, таварыш у палявых даследаваннях на азёрах геолаг-навуковец Валер Ярцаў, калега па энцыклапедыі Галія Фатыхава, якую шанаваў Якуб як адзінаверку. Гісторык і старшыня суполкі «Спадчына» Пятро Русаў зацікавіўся набыткамі Якубоўскага як даследніка беларуска-татарскіх дачыненняў. Зарына Канапацкая распавяла пра сяброўскую супрацу яе бацькі Ібрагіма Канапацкага і Якуба Якубоўскага.

Многа цікавага аб сяброўстве з Якубам Адамавічам нагадаў Яўген Гучок, сваё цёплае стаўленне да сябра ён увасобіў у вершы: «Я сёння ў сне Якубоўскага бачыў...»

На заканчэнне вечарыны прагучаў гімн беларускіх татараў на словы Якуба Якубоўскага «Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі».

ДВА ЗНАКАВЫЯ ТВОРЫ

Алесь Цыркуноў

Добры дзень, спадару Якубе, звяртаюся так, бо чую і бачу Вас па-ранейшаму, хоць Вы ўжо і адыйшлі на вечны спачын. Абы толькі ўзгадаў чалавека, якога зведаў душою, як ён ужо цалкам перад табою, як адчуваеш ягоныя памкненні і думкі, быццам маеш трэцяе вуха і вока ці штосьці яшчэ.

Зусім выпадкова сустрэліся мы ўпершыню на Круглай плошчы. Дакладней, Якубоўскі і мой даўні знаёмы і сябра, таксама татарын з Нарочча, мусілі, як у іх было прызначана, сустрэцца, а я быў тут «між іншага», але мы збольшага пазнаёміліся. Такая кароткая сустрэча пакінула досыць прыязны ўспамін пра Якуба Адамавіча як пра чалавека, з якім можна брацца за якую хочаш адказную справу. Потым, мусіць, праз год, я ўжо меў патрэбу згадаць пра яго. Прычынай гэтага была мая чарговая карціна на рэлігійную тэматыку, з рознымі выявамі і надпісамі сакральнага значэння, у тым ліку мусульманскага зместу. З кім толькі не давялося тады перазнаёміцца! Урэшце дарога з пытаннямі-загадкамі прывяла мяне зноўку да гэтага чалавека: я проста змушаны быў звярнуцца да яго як да апошняй інстанцыі. Мала таго, што ён быў высокаадукаваны і высокакультурны чалавек і валодаў энцыклапедычнымі ведамі, у чым я хутка пераканаўся пры нашых узаемных дачыненнях, дык яшчэ і вызначаўся выключна высакароднымі душэўнымі якасцямі. Здзіўляла яго маторыка, ён лёгка, як кажуць, «з паўабарота» мог раптам загарэцца. Пераконваў з такім імпэтам і так доказна, што і спрачацца не выпадала, а хацелася толькі слухаць яго. Пытанняў у мяне па той карціне з трытвору «Адвечнае святло Беларусі» было даволі шмат. Нават не ведаю, ці знайшоў бы на іх адказы, каб не тая нашая сустрэча, не ягоная асоба. Для мяне было відавочна, што я маю справу з адным з найлепшых сыноў нашай Бацькаўшчыны.

Здзівіўся я дужа ў час нашай апошняй сустрэчы, якая адбывалася якраз на свята Масленіцы ў яго на кватэры, куды я забег літаральна на пару хвілін. Такая надзвычай далікатная ненавязлівая гасціннасць уласціва прыроджаным псіхолагам, знаўцам душы чалавечай, якім ён, бясспрэчна, і быў. Калі б вы паспыталі тых незвычайных блінцоў з прысмакамі, аздобленых ягонымі дасціпнымі жартамі ды прыгаворкамі, дык, можа, у тым гасціннym палоне заседзеліся б да поўначы…

Я быў здзіўлены ягонай зноў раптоўнай прапановай намаляваць карціну з выявай Адама Міцкевіча на татарскім старым мізары… Гэта мяне дужа ўзрушыла. А ён спакойна дадаў: «То хіба можна не аднаму маляваць, а з кімсьці яшчэ». Я зразумеў: можа атрымацца знакавы твор. Непахіснасць і лагічная паслядоўнасць яго разваг, бясспрэчна, мелі свой патаемны сэнс, раскрываць які яму не надта хацелася. Ну і я на тым не дужа настойваў, разумеючы, што да яго трэба дайсці самому. Вось гэтая здольнасць выказаць сваю думку

так, каб і іншыя прызнавалі яе за сваю, уласціва надзвычай рэдкім людзям. Таму ягоная прапанова доўга вярэдзіла маю памяць, не давала забыцца, прымушаючы раз-пораз вяртацца да яе, думаць і шукаць вырашэння.

Але ўсяму Божая воля. Напрыканцы мінулага стагоддзя маю сутнасць вольнага мастака стала займаць ідэя супольнага існавання на нашай Бацькаўшчыне розных паводле веравызнання супольнасцяў. Напачатку я засяроджваўся на хрысціянскай супярэчнасці, якая праяўлялася ў рознаканфесійнай падзеленасці. Пазней развагі вывелі мяне на больш шырокі абсяг, бо побач з хрысціянамі жывуць у нас і юдэі, і мусульмане. У выніку з'явіўся трытвор «Адвечнае святло Беларусі». Адна з частак яго цалкам прысвечаная мусульманам, дакладней, беларускім татарам...

Натуральна, гісторыя існавання татарскай меншасці ў нашай Бацькаўшчыне мне была амаль невядома. Дый дзе хто з нас мог штосьці ведаць пра беларускіх татараў і іх рэлігію, калі ўжо і самі зракліся сваіх прашчураў з іх вераваннямі і традыцыямі! Але ж чым складанейшы пошук, тым выразнейшая мэта.

Дзякуючы таму, што маю лецішча на Нарачы, я пазнаёміўся ў Кабыльніку з шчырым «бэнээфаўцам» Аляксандрам Якубоўскім, якога я звычайна называў спадар Алехна. На маё здзіўленне, хутка высветлілася, што ён татарын, адно прынцыпова беларускамоўны, і гэтая акалічнасць яшчэ больш надавала нашым размовам і сустрэчам імпэту. Калі я пачаў распытваць яго аб тых драбніцах, якія мяне цікавілі, ён толькі разводзіў рукамі. Але суцешыў тым, што ёсць у яго ў Менску брат*, надта адукаваны, і які здолее даць адказ на ўсе мае пытанні. Так праз Алехну я і пазнаёміўся з Якубам Адамавічам, без кансультацый і рознага роду дапамогі якога мне, бадай, не ўдалося б раскрыць гэтую тэму з той паўнатой, якая ўрэшце атрымалася. Акрамя змястоўна-літаратурнага аспекту было знойдзена, што немалаважна для кожнага мастацка-жывапіснага твора, і стылёва-пластычнае рашэнне як ключ да яго прачытання. Бо раней ніхто, да каго мне даводзілася звяртацца, дакладна і адназначна адказаць на мае пытанні не мог.

Такім чынам, гэты твор, можна лічыць, у пэўнай ступені ўзнік у суаўтарстве з Якубам Якубоўскім.

---

* Заўважу, што Аляксандр Якубоўскі з Кабыльніка сапраўды быў раднёй Якубу. Пасяліўся на Нарачы пасля вяртання з Варкуты, дзе працаваў разам з Канстанцінам Якубоўскім. Ён часта наведваў Якуба ў Менску. – *Т. Я.*

Аднаго разу пры сустрэчы, калі збольшага істотныя пытанні былі развязаныя і засталіся толькі недастаткова высветленыя пра камяні і пліты на татарскім могільніку-мізары, ён раптам спыніўся і, быццам асвечаны нейкім дзіўным месяцовым святлом, пачаў распавядаць пра Адама Міцкевіча. Сказаў мне: «А чаму б не намаляваць такую карціну, дзе ў ззянні поўні між надмагільных камянёў і пліт блукае самотная постаць нашага генія? Хіба ж гэта не кранальна?» Я быў уражаны ягонай раптоўнай імпрэсіяй, але адказаў: «Тут ёсць шмат розных момантаў, якія належыць высветліць».

Пазней, як мне давялося працаваць над вобразам самога спадара Якуба, калі яго ўжо не стала, я не мог абысці гэты сюжэт з постаццю паэта ў месяцовым святле, што нагадвае здань з ягоных «Дзядоў». Балазе, як пазней я даведаўся, Якуб Якубоўскі з асаблівай увагай і сімпатыяй ставіўся да творчасці Адама Міцкевіча, пра што сведчыць яго дыпломная праца пры сканчэнні філалагічнага факультэта, прысвечаная творчасці паэта. Калі ж верыць водгукам тых, хто быў знаёмы з Якубам Якубоўскім, у гэтым партрэце я патрапіў пазбегчы штучнай перадузятасці паказу і таму даволі поўна раскрыў саму ягоную асобу.

На заканчэнне хочацца паўтарыць думку прафесара Леаніда Лыча аб стасунках татарскай і беларускай культур: татары ў сваім культурным развіцці не гублялі свядомай повязі з тытульнай нацыяй, чым рабілі і робяць значны ўнёсак у скарб агульнасусветнай культуры і гэтым даюць прыклад служэння нашай агульнай Бацькаўшчыне.

ДАСЛЕДНІК ВОЗЕРА НАРАЧ

Іван Драўніцкі, Таццяна Якубоўская

Возера Нарач. Пра яго складзены легенды, яму прысвячалі і прысвячаюць вершы і паэмы, яго адлюстроўваюць на карцінах і здымках, яго даследуюць навукоўцы. Першыя крокі па вывучэнні Нарачы у наш час зрабіла Нарачанская біялагічная станцыя ў 1946 годзе. Але для глыбокага вывучэння возера не было добрай базы, патрабаваліся грунтоўныя даследаванні і энтузіясты. Такім энтузіястам быў Якуб Якубоўскі. Ранняй вясной 1966 года, калі «возера толькі ўзламала свой лядовы панцыр» (ягоныя словы), прыехаў ён у вёску Урлікі, каб збіраць матэрыял і рыхтаваць кандыдацкую дысертацыю. Тэмай навуковай працы Якуб Адамавіч абраў тэрмічны рэжым азёраў Беларусі, а кіраўніком дысертацыйных вышукаў быў

прафесар БДУ В. Р. Заўрыеў. Гэта крыху дзівіць, бо вядома, што на той час лімналагічныя даследаванні ўзначальвала Вольга Піліпаўна Якушка. Аднак відавочна, што кіраўніка дысертацыі прызначылі з яе згоды, яна тады інтэнсіўна працавала са сваёй доктарскай дысертацыяй. Менавіта ёй абавязаны Якуб Адамавіч цікавасцю да даследавання азёраў і першымі ўрокамі ў гэтым кірунку. Студэнтам геафака Якуб удзельнічаў у зімовых экспедыцыях, якія наладжвала Вольга Піліпаўна для свідравання на азёрах (лядовае покрыва гэтаму спрыяла), каб узяць пробы грунту, пробы вады для вызначэння хімічнага складу, утрымання кісларoду ды іншых рэчываў на розных глыбінях, паглядзець размеркаванне тэмпературы ў тоўшчы вады. У час гэтых няпростых палявых экспедыцый былі розныя выпадкі – і смешныя, і сумныя. Героем аднаго з іх быў і Якуб, пра што так успамінае Вольга Піліпаўна: «... позна ўвечары зімой мы з Я. А. Якубоўскім вярталіся дахаты. Ён не мог хадзіць хутка і адстаў ад групы. Наступіўшы ў лунку, кінутую рыбакамі, Якуб апынуўся ў вадзе, утрымаў яго цяжкі заплечнік з бутэлечкамі для адбору вады на кісларод. Дома ўсе, вядома, пасміхаліся, але хутка перапранулі яго ў цёплае і напаілі гарачай гарбатай». (О. Ф. Якушко «Моя судьба – географический факультет». Минск, 2009, с. 22). Цяпер можна казаць, што гэта быў першы сігнал: не гэтая праца прызначана лёсам для Якуба.

Як аспірант-завочнік Якуб Адамавіч уладкаваўся часова на працу на Нарачанскую гідраметэаралагічную станцыю, каб назапасіць як мага больш палявых назіранняў для дысертацыі. Начальнікам станцыі тады быў Уладзімір Ярмоленка, вельмі спагадлівы і зычлівы чалавек. Апрача даручаных Якубу абавязковых гідралагічных назіранняў можна было праводзіць дадатковыя, што было карысна і для станцыі, і для аспіранта. Назіранні вялі з вялікага плыта, усталяванага метраў за трыста ад берага над трохмятровай тоўшчай чысцюсенькай вады. Яшчэ трэба было ездзіць на катары на дзве самыя глыбокія мясціны возера (24,8 метра на Вялікім плёсе і на 18 метраў на Малым плёсе), каб рабіць замеры тэмпературы вады і браць яе пробы праз пэўныя інтэрвалы па вертыкалі. Так і казалі: «Едзем на вертыкаль».

І тут у Якуба былі непрыемныя прыгоды. Ці праз тое, што быў сляпы на адно вока, ці хвалі разгуляліся занадта, але аднойчы ён вярнуўся дахаты з пераламаным вялікім пальцам рукі – так моцна яго зацiснула паміж бортам катара і плытом. Але гэта ніяк не паўплывала на працаздольнасць даследніка. Магчыма, гэта было другое папярэджанне, што Якуб займаецца не той справай, што яму вызначана.

Жыў тады Якуб Якубоўскі з жонкай у маленькім пакойчыку пры станцыі і да лютага наступнага года збіраў матэрыял па тэме дысертацыі. Рабіў замеры і параўноўваў тэмпературу вады Нарачы і меншых азёр – Мястра, Баторына, Рудакова, Мядзела, Бляда. Гэтыя разнатыпныя азёры былі вельмі зручным палігонам для правядзення фундаментальных і дастасоўных гідраэкалагічных даследаванняў.

У выніку аспірант зрабіў значны ўклад у вывучэнне возера Нарач і папулярызацыю звестак пра яго. Вынікамі ягоных назіранняў, карысталіся пазней супрацоўнікі біястанцыі «Нарач» (цяпер Вучэбна-навуковы цэнтр «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга»), прыдаліся яны і лабараторыі азёразнаўства геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На аснове сабраных матэрыялаў – вынікаў гідрабіялагічных даследванняў біяфака і лімналагічных геафака БДУ, гідралагічных назіранняў Нарачанскай гідраметэаралагічнай станцыі – Якуб Якубоўскі напісаў абагульняльны артыкул пра Нарач (разам з светлай памяці археолагам, гісторыкам, пісьменнікам Міхасём Чарняўскім) для 7-га тома БелСЭ. Потым з мэтай папулярызацыі звестак пра Нарач больш падрабязны артыкул быў апублікаваны ў пяцітамовай энцыклапедыі «Прырода Беларусі».

У 2002 годзе для біястанцыі на беразе Нарачы быў узведзены новы шматпавярховы корпус, які змяшчае сучасныя лабараторыі, навучальныя класы, канферэнц-залу, бібліятэку. Нарачанская біялагічная станцыя забяспечвае вучэбную і вытворчую практыку студэнтаў біяфака, выкананне дыпломных, магістарскіх і аспіранцкіх работ. На базе біястанцыі праводзяцца буйныя міжнародныя канферэнцыі. Дзякуючы шматгадовым мэтанакіраваным даследаванням азёры Нарачанскай групы ўлучаны ў міжнародны спіс азёр, якія вымагаюць асаблівай дзяржаўнай аховы. У гэтай справе ёсць і часцінка плёну Якуба Якубоўскага.

ПРЫСВЯЧЭННІ

Рыгор Барадулін

Пасля таго, як Беларусь годна развіталася з Рыгорам Барадуліным, адным з лепшых паэтаў і таленавітым моватворцам, асаблівы сэнс набылі развітальныя словы самога народнага паэта да Якуба Адамавіча Якубоўскага. Вось гэтыя словы.

ЧОРНАЯ ВЕСТКА

Як абухом па галаве. Чорная вестка. Ня стала Якава, сына Адамавага, Якубоўскага.

Ня стала, каб неставаць нам ягонае мудрасьці, ягонае ўсёдапытнасьці, ягонае дабрыні й любові да ўсяго роднага, вечнага, наскага.

Спадар Якуб любіў свой народ, бескарысьліва слугаваў яму. Як сьвятую ваду ў прыгаршчах, нёс мову й веру продкаў сваіх. Множыў славу сумленнага, мужнага, працавітага татарскага народа. Асьветлены ведамі, супроцьстаяў цемрашальству ўсіх масьцей.

Мала хто зь беларусаў гэтак шанаваў, гэтак энцыкляпэдычна ведаў Беларусь.

У татарына Якава Якубоўскага бальшыні беларусаў трэба было вучыцца беларушчыне.

У Беларусі не стала яшчэ аднаго ўлюбёнага сына.

У мяне не стала панавітага брата.

Хілю сваю сівую галаву перад сьветлай памяцьцю нястомнага спадзьвіжніка й асьветніка, рупліўца на духоўнай ніве – Якава, сына Адамавага, Якубоўскага.

Хай будзе лёгкім табе беларускі пясок, мой татарскі браце!

БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ

Якаву, сыну
Адамаваму, Якубоўскаму

На Беларусь нашэсьце вашае
Вітаю,
Мірныя татары!
Вы дбалі – будавалі, важылі,
Аблокаў пасьвілі атары.

Былі гароднікамі ўпартымі
Кажушнікамі, макалямі,
Прэч гора адганялі жартамі,
Кулямі смутак затулялі.

Вы засланяліся правіцаю
Кайданьнікамі на этапах
Вы мову зьбераглі крывіцкую
І ў сэрцах вашых,
І ў Кітабах.

Пытаньне ўсім на вуха дыхае:
Каму зашкодзілі,
Скажэце,
Татарскія магілы ціхія,
Маладзічковыя мячэці?

Хапіла ж нашым мовам
Сьмеласці
Сышоўшыся, не разгубіцца
А ў маладой паразумеласьці,
Як дзьвюм крыніцам,
Сьветла біцца.

На Шчары, Нарачы, на Сьвіцязі
Схаўрусіць хай
З салам алей кум.
Татары!
Множцеся й пладзіцеся,
Вы нашыя.
Салям алейкум!

БУДЗЬМА!

Нас суседзі пасварыць хацелі,
Толькі мы праз доўгія вякі
Не счужыніліся, не ўлюцелі
І як землякі, як сваякі.
Нашы лемяшы і нашы шаблі
Заадно стараліся здаўна.
Разам мы і пекліся і зяблі,
Чашу горкую пілі да дна.

Нас вучылі вы, як верыць трэба
У сваё,
Як мову берагчы.
Мы на сіта згоды –
Сьведкай неба –
Напіналі разам абручы.

І прасейвалі на гэтым сіце
Пыцель на вясёлы каравай.
Сонейка ўсьміхалася ў блакіце,
З вышынёю заручала край.

Стане нам Гасподняй ласкі й кары,
Пешчаў лета, гурбішчаў зімы.
Будзьце доўга, наскія татары.
Будзеце –
І з вамі будзем мы!

САЛЯМ! ЧАЛОМ!

Да 600-годдзя з нагоды
татарскага асадніцтва
ў Вялікім Княстве Літоўскім

Над небам мячэці маладзічок
Займаецца колькі стагоддзяў.
Нібыта адкінуты ўздыхам
Кручок
З дзьвярэй,
Каб блуканец заходзіў
У храм,
Дзе яго падпярэжа Алах
З Карана суровай сурою.

Блуканец імя сваё
Знойдзе ў імглах
І ўмые зарою сырою.
І роспач сьляпая
Захоча вачэць,
І сподзеў ня ўпусьціць свой шанец.
І будзе пакутна
Глядзець на мячэць
Апошні крывіцкі паганец…

Васіль Жуковіч

Паэт адгукнуўся на сыход з гэтага свету Якуба Якубоўскага шчымлівым вершам. Верш быў змешчаны ў «Байраме» (1998, № 3, с. 28), а паэт прачытаў яго на вечарыне, прысвечанай 70-годдзю Якуба 29 красавіка 2002 года.

БЫЎ СВЯТЛОМ ЁН ГАЮЧЫМ

Светлай памяці
Якуба Якубоўскага

Вестку цяжкую мне за трывожнымі снамі
Вечаровы эфір нечакана прынёс:
Вас няма на Зямлі. Плача восень дажджамі,
Плача сэрца маё – вочы поўныя слёз.

Беларускі татарын Якуб Якубоўскі,
Я любіў Вас – не смеў бы тут словам грашыць;
Знаў свяшчэнны агонь – назаву яго Боскім –
Далікатнае вашай і мужнай душы.

Той агонь саграваў, быў святлом ён гаючым,
Быў стваральным на нашай гаротнай зямлі.
Ён пранесены быў да мяжы немінучай
Гэтак годна – інакш, знаю, Вы не маглі.

Я трымаю «Байрам» – у жыццёвых нягодах
Вамі ўзрошчаны плод самых добрых надзей,
Мне падораны ён з дрэва дружбы народаў
І сяброўства сардэчных і верных людзей.

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ

ДЗЕЙНАСЦЬ ЯКУБА ЯКУБОЎСКАГА Ў ЛЮСТЭРКУ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА АДРАДЖЭННЯ ТАТАРАЎ БЕЛАРУСІ

Леанід Лыч

Якія б важныя, вялікія праблемы ні вырашаў той ці іншы народ, у яго здзяйсненнях заўсёды вельмі яскрава вызначаецца адметная роля найбольш буйных асобаў. Гэтая роля падаецца яшчэ больш выразнай, калі размова датычыць невялікіх па колькасці народаў, нацыянальных меншасцяў. Да катэгорыі іх належаць і беларускія татары. Таму ва ўсім тым, што ім удалося дасягнуць з канца 1980-х гадоў у нацыянальна-культурным адраджэнні, постаць такога славутага змагара за гэтую святую ідэю, як Якуб Якубоўскі, ва ўсёй сваёй велічы добра бачыцца і ў бяззоркавую ноч, і пры густым дзённым тумане. Ці размова заходзіць пра стварэнне Беларускага згуртавання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб» і заснаванне іх друкаванага перыядычнага органа – штоквартальніка «Байрам. Татары на зямлі Беларусі», ці пра падрыхтоўку і правядзенне навукова-практычных канферэнцый па татарскай праблематыцы, закладку мячэці ў Менску, арганізацыю нядзельных школ для татарскіх дзяцей, ці пра ладаванне святочных імпрэзаў з нагоды 600-годдзя пасялення татараў-мусульманаў у Вялікім Княстве Літоўскім – усюды перад намі паўстае асоба Якуба Якубоўскага. Праўда, ён неяк умеў вельмі спрытна хаваць сябе ў цень і заставацца незаўважаным не толькі для старонняга вока, але і для блізкіх сяброў, з якімі нястомна працаваў на карысць татарскай справы. Шмат хто ведае, што Якуб Якубоўскі быў нязменным галоўным рэдактарам 28 нумароў часопіса «Байрам», але дзе, у якім з нумароў гэта пазначана? Не знойдзем такога. Больш за тое, і ў шэрагу нумароў гэтага перыядычнага выдання мы не знаходзім імя Якуба Якубоўскага нават сярод рэдактарскай групы. Не думаю, што такая канспірацыя выклікалася нейкімі надзвычай важнымі абставінамі.

Відаць, з прычыны вялікай сціпласці, уласцівай гэтаму чалавеку, ён проста сам не ўносіў свайго прозвішча ў склад рэдкалегіі, на што ніхто з яе сяброў не звяртаў асаблівай увагі, бо не сумняваўся ў прыналежнасці яму галоўнай ролі ў выхадзе кожнага нумара «Байрама». Але ці ўсе з чытачоў ведалі пра гэта, беручы ў рукі часопіс? Вядома, не ўсе. Гэтага не будуць ведаць і з гадамі, што не дасць магчымасці скласці правільнае ўяўленне пра ўклад Якуба Якубоўскага ў станаўленне і развіццё татарскай перыёдыкі ў Беларусі. Незалежна ад таго, з якой прычыны мы не бачым імя гэтага выдатнага чалавека там, дзе яно павінна прысутнічаць, гэтакае становішча пакідаць без увагі нельга. Народ павінен ведаць сваіх герояў, а тым больш такая невялікая этнічная супольнасць, якой з'яўляюцца беларускія татары.

Добра ведаючы, што на працягу выдання ўсіх 28 нумароў штоквартальніка «Байрам» яго галоўным дойлідам быў Якуб Якубоўскі, сцверджу, што з гэтай нялёгкай, вельмі адказнай функцыяй ён спраўляўся на выдатна з плюсам. Паводле раздзелаў часопіс вельмі арыгінальны, мала ў чым падобны да іншых аналагічных перыёдыкаў. У ім абавязкова знойдзеш штосьці важнае, асабліва для мусульманаў, з іх Кур'ана, карысныя ўрыўкі з іншых кніг рэлігійнага зместу. З цікавасцю чытаецца даведачны матэрыял з задуманага да выдання «Энцыклапедычнага даведніка». І зусім апраўдана, што з першага і да апошняга нумара «Байрама» ён прыстойна спраўляўся з функцыяй абуджальніка гістарычнай памяці беларускіх татараў. Кожны, хто знайшоў бы вольны час і ўважліва прачытаў усе гістарычныя артыкулы «Байрама», даволі дакладна ведаў бы гісторыю беларускіх татараў. Веды пра іх дапаўняюцца яшчэ і тым, што рэдакцыя часопіса ахвотна дае магчымасць выступіць на яго старонках аўтарам і па тых праблемах гісторыі Беларусі, без раскрыцця якіх немагчыма было б стварыць больш-менш поўны малюнак і гісторыі татараў. Такой практыкі, якую гэтак актыўна ініцыяваў галоўны рэдактар часопіса «Байрам» Якуб Якубоўскі, варта трымацца і надалей, бо карысць ад яе відавочная. За надзвычай станоўчае і нават фенаменальнае трэба прызнаць, што за 600-гадовае жыццё татараў у Беларусі яны не зрабіліся абыякавымі да таго, што адбывалася на іх прарадзіме. Таму рэдакцыя часопіса «Байрам» вельмі правільна робіць, што падтрымлівае гэтае святое пачуццё. Тут столькі гістарычнага матэрыялу пра паволжскіх і крымскіх татараў, што яго хапіла б пры адпаведнай апрацоўцы на дзясяткі курсавых і дыпломных працаў, што выконваюцца студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў. Знаёмства з такім

матэрыялам не толькі ўзбагачае гістарычную памяць беларускіх татараў, але і дае магчымасць лепш зразумець сваю прыналежнасць да шматмільённай татарскай супольнасці свету. Лічу, што і надалей гэткія матэрыялы павінны займаць належнае месца на старонках штоквартальніка «Байрам».

Цалкам апраўдана змяшчэнне з нумара ў нумар крымскататарска-беларускага слоўніка. Калі знаёмішся з яго паасобнымі словамі, адразу адчуваеш прыгажосць, самабытнасць крымскататарскай мовы. Не перабольшу, калі скажу, што выпускам крымскататарска-беларускага слоўніка будзе ўнесены каштоўны ўклад у цюрцкае і беларускае мовазнаўства. Гэтага ўкладу проста нельга будзе не заўважыць Інстытуту мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Ёсць у часопіса «Байрам» і шмат іншых станоўчых бакоў, за што трэба дзякаваць найперш яго галоўнаму рэдактару. Сваім укладам у стварэнне гэтага цікавага перыядычнага выдання ён заслугоўвае права на неўміручасць у памяці беларускіх татараў. Таму мяне нямала здзівіла афіцыйная інфармацыя на старонцы трэцяга нумара часопіса «Байрам» за 1998 год. Там змешчаны загад аб узнагароджанні Ганаровай граматай Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь асобаў, якія маюць значныя дасягненні ў справе татарскага адраджэння. Такіх асобаў (агульнай колькасцю чатыры чалавекі) вызначыла Праўленне Беларускага аб'яднання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб». У дачыненні да кожнага з пералічаных не можа быць аніякіх пярэчанняў. Толькі губляешся ў здагадках: а чаму ў спісе адсутнічае імя Якуба Якубоускага?

Не толькі сівая мінуўшчына, але і сучаснасць даюць нам безліч прыкладаў цеснага сужыцця беларусаў з татарамі. Таму, каб гаварыць, аналізаваць праблемы, што стаяць перад беларускімі татарамі на рубяжы XX і XXI стагоддзяў, другога і трэцяга тысячагоддзяў, трэба хоць у самых агульных рысах сказаць пра такога роду беларускія праблемы.

Як гэта ні парадаксальна, беларусы, якія доўгі час (з 1 студзеня 1919 г.) жылі ва ўласнай дзяржаве – Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (БССР), дзесьці праз 20–30 гадоў ужо ўшчыльную сутыкнуліся з праблемай захавання сябе як самабытнага этнасу. Цяпер нам добра зразумелыя прычыны такой трагедыі: БССР не была як след беларускай дзяржавай, Масква ў дачыненні да яе праводзіла жорскую русіфікатарскую палітыку. Прыпыніць размах

асіміляцыйных працэсаў, але не цалкам зліквідаваць іх, дапамагла абвешчаная генеральным сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым перабудова. Усё, што на гэты час засталося здаровым, прыродна чыстым, не засмечаным у зношаным беларускім арганізме, прыйшло ў рух. На паверхню ўсплыло і вельмі хутка набыло шырокую папулярнасць у народзе даўно забытае слова Адраджэнне.

Зусім заканамерна, што разам з нацыянальным рухам тытульнага народа Беларусі адбылося абуджэнне ўсіх яе этнічных супольнасцяў, у тым ліку і адной з самых старажытных на нашай зямлі – татарскай. Прычым усе гэтыя супольнасці пачалі ратавацца не ад нацыянальнага ўціску тытульнага народа, як гэта практычна бывае ва ўсіх поліэтнічных дзяржавах, а ад русіфікацыі. Вось у такім гуртавым змаганні і адбывалася яднанне ўсіх нацыянальных рухаў у Беларусі, асяродкам якога стаў нацыянальны рух яе карэннага насельніцтва. З гэтай прычыны актывісты беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння не толькі не перашкаджалі, а наадварот, усяляк спрыялі ўлучэнню ў такі прагрэсіўны рух усіх этнічных супольнасцяў нашага краю. У належнай меры адчулі на сабе гэта і беларускія татары, што толькі спрыяла актывізацыі іх удзелу ў нацыянальна-культурным адраджэнні.

Як і прынята ва ўсіх падобных выпадках, беларускія татары пачалі з самаарганізацыі: у 1991 годзе стварылі Беларускае згуртаванне татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб» і заснавалі свой перыядычны орган – штоквартальнік «Байрам», абсалютная большасць матэрыялаў якога публікуецца на беларускай мове. Толькі вось вялікая недарэчнасць, што ўсе гэтыя лёсавызначальныя ў жыцці нашых татараў з'явы не знайшлі ніякага адлюстравання ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Відаць, не дагледзелі і беларусы, і татары. Гэтую памылку трэба абавязкова выправіць у адпаведным томе «ЭГБ» на літару «Т», унёсшы паняцце «татары беларускія», дзе разам з іншымі пытаннямі асвятліць і іх сучаснае нацыянальна-культурнае становішча.

Хапіла ў нашых татараў сілы і магчымасцяў, каб разам з іншымі беларускімі навукоўцамі і культурнымі дзеячамі правесці ўжо ў 1993 годзе важную навукова-практычную канферэнцыю на тэму «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Летувы і Польшчы». Такія канферэнцыі адбываліся і пазней. Апошняя з іх у сакавіку 1997 года – «Праблемы вывучэння і захавання культурнай спадчыны татарскага народа на Беларусі».

Такой актывізацыяй нацыянальнага жыцця татары вельмі прыстойна сустрэлі і адзначылі ў лістападзе 1997 года 600-годдзе свайго з'яўлення на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, законным спадкаемцам якога ёсць сучасная наша дзяржава – Рэспубліка Беларусь. Ёсць пэўныя пазітыўныя зрухі ў арганізацыі мусульманскіх школ для беларускіх татараў, дзе выкладаюць і студэнты-арабы, што вучацца ў ВНУ нашай краіны. Унікальнай з'явай стане выданне «Энцыклапедыі для беларускіх татараў». Матэрыялы, якія ўвойдуць у яе, рэгулярна падаюцца ў часопісе «Байрам», і гэта вельмі правільна, бо з'яўляецца магчымасць з дапамогай чытачоў штосьці змяніць, падкарэктаваць, унесці нейкую новую дэфініцыю. З цягам часу, як вызначыцца рэдакцыя «Энцыклапедыі для беларускіх татараў», ёй дарэчы было б прысвоіць імя Якуба Якубоўскага, бо якраз яму належыць ідэя стварэння такой кнігі.

Тое, што распачалі з належным размахам татары Беларусі на мяжы 80–90-х гадоў, не магло не быць заўважаным іх супляменнікамі з іншых рэспублік, а пазней і з краін СНД. Большасць з глыбокім разуменнем паставілася да такіх звестак і пачала падтрымліваць гэты рух і словам, і справай. Але выказваліся і песімістычныя прагнозы. І тут няма нічога дзіўнага, бо працэсы дэнацыяналізацыі гэтай этнічнай супольнасці дайшлі да крытычнай рысы. Таму я вельмі высока ацэньваю пазіцыю беларускіх татараў, іх настойлівыя пошукі шляхоў нацыянальна-духоўнага адраджэння зусім не аслабляла тое, што кагосьці апаноўвала паняверка. На чыім баку праўда, пакажа час. Калі разумна выкарыстаць усе найбольш істотныя фактары адраджэння, яно здзейсніцца. Галоўнае, што ў яго яшчэ ёсць людскія рэзервы. Патрэбна мэтанакіраваная, глыбокаасэнсаваная тлумачальная праца ў асяроддзі татарскага насельніцтва Беларусі незалежна ад таго, куды вядуць іх карані: у Крым, у Паволжа ці кудысьці яшчэ. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на асобаў татарскай нацыянальнасці з высокай эрудыцыяй, занятых у розных сферах навукі, культуры і адукацыі, надзеленых прыродай здольнасцямі кампазітара, музыканта, спевака, мастака, пісьменніка, журналіста і г. д. Далучэнне такіх людзей да нацыянальна-адраджэнскага руху беларускіх татараў істотна ўмацуе яго. Толькі рабіць трэба ўсё так, каб нанова далучаныя да такога руху татары-мігранты інтэграваліся ў нацыянальна-культурнае жыццё, а не прыносілі б у яго чужыя, не ўласцівыя нашаму народу традыцыі, бо гэта закранае інтарэсы не толькі карэннага насельніцтва нашай краіны, але і яе адной з самых

старажытных этнічных супольнасцяў – татарскай. Яе адраджэнне і развіццё не павінна адбывацца за кошт размывання нацыянальнага патэнцыялу тытульнага народа Рэспублікі Беларусь. Трэба спадзявацца, што, як гэта назіралася на працягу ўсёй гісторыі, тут будуць разумна спалучацца інтарэсы гэтай этнічнай меншасці з інтарэсамі народа, на зямлі якога яна знайшла сабе надзейны прытулак.

Марна было б спадзявацца, што нашыя дзяржаўныя мужы, адкрыта праводзячы палітыку дэнацыяналізацыі маладых пакаленняў, а таксама іншыя асобы, надзеленыя ўладай, не будуць старацца выкарыстаць дзеля гэтага некаторых прадстаўнікоў этнічных меншасцяў Беларусі. Вось адзін з прыкладаў, што ўжо трапіў у перыядычны друк.

Як вядома, у Менску доўгі час узорнай беларускай школай з'яўлялася школа № 82. З 1992/93 навучальнага года тут ужо ўсе першыя класы па мове навучання былі беларускімі. Адразу пасля сумнавядомага моўнага рэферэндуму 1995 года сюды, як і ва ўсе іншыя школы краіны, у лічаныя дні прыйшло за подпісам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь распараджэнне з указаннем забяспечыць усім бацькам права вучыць дзяцей на той мове, на якой яны пажадаюць. Пярэчыць такому міністэрскаму дакументу ніхто не збіраўся, але не спынялася і асветніцкая праца з бацькамі аб ролі роднай мовы ў фармаванні маладых пакаленняў беларускага народа. Добра дасведчаныя ў гэтым лёсавызначальным для кожнай нацыі пытанні бацькі трывала стаялі за навучанне іх дзяцей на беларускай мове. Гэтая пазіцыя, аднак, была не даспадобы кіраўнікам сістэмы адукацыі, і яны пайшлі на замену дырэктара школы Н. Гапонавай. У лістападзе 1995 года ёй загадана было саступіць месца педагогу з прозвішчам, што носяць прадстаўнікі мусульманскага свету, – А. Салахітдзінавай. Небеларусам трэба вельмі асцярожна, а лепш і зусім не ўмешвацца ў пытанні, што датычаць самых тонкіх струнаў нацыянальнага жыцця беларусаў на іх гістарычнай тэрыторыі. Можна дапамагчы ўмацаванню нацыянальнага патэнцыялу беларускага народу ў розных сферах яго жыцця, а вось расхіставаць, разбураць яго – гэта ўжо злачынства. Такімі антыбеларускімі дзеяннямі можна не толькі наклікаць справядлівы гнеў на самога сябе, але і выклікаць недавер да той нацыянальнай меншасці, да якой належыць асоба. Вельмі лёгка падпаўшы пад русіфікатарскі настрой, які запанаваў у адукацыі пасля рэферэндуму 1995 года, А. Салахітдзінава стала настойліва і заўзята рыхтаваць пасля адпаведнай працы з бацькамі і настаўнікамі наступ на беларускую мову, упэўненая, што ў гэтым абавязкова будзе мець

неабходную падтрымку ва ўпраўленні адукацыі Менгарвыканкама. Каб дэбеларусізацыя школы ішла шпарчэй, туды ў жніўні 1997 года накіравалі і такіх самых поглядаў завуча Л. Іеўлеву. У выніку ўжо з 1997/98 навучальнага года ў школе адмовіліся ствараць беларускамоўныя класы, хоць заявы ад бацькоў на арганізацыю такіх класаў і паступалі. Акрыленае такімі «поспехамі» кіраўніцтва школы пачало вынішчэнне беларускамоўных 2-х, 3-х, 4-х і ўсіх наступных класаў. У 1998/99 навучальным годзе ў колішняй беларускамоўнай школе засталося толькі тры класы, у якіх дзяцей навучалі на нацыянальнай мове карэннага насельніцтва краіны.

У працілегласць сказанаму вышэй прыгадваецца такі выпадак з майго ўласнага жыцця. На працягу 1954/55–1956/57 навучальных гадоў я выкладаў гісторыю СССР, фізкультуру і вайсковую справу ў Юматаўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме Башкірыі, пра педагагічны калектыў якога захаваў самыя цёплыя ўспаміны. Час маёй працы ў ёй супаў з хрушчоўскай адлігай, якая дала магутны штуршок нацыянальным рухам у СССР, у тым ліку і ў Башкірыі. Выразна адчувалася гэта і сярод выкладчыкаў тэхнікума башкірскай і татарскай нацыянальнасцяў. Кінулася ў вочы, што раптам усе яны загаварылі паміж сабою на сваіх мовах – на перапынках, проста ў вольны ад асноўнай працы час. Пераважна гэтыя мовы гучалі, калі выкладчык аказваўся ў асяроддзі башкірска-татарскай моладзі, на долю якой прыпадаў даволі высокі працэнт навучэнцаў. На пасяджэннях жа педагагічных радаў пры звароце да ўсіх прысутных выкладчыкі карысталіся толькі расейскай мовай. Далёка не ўсім падабалася такая моўная метамарфоза. І, як гэта часта практыкавалася ў савецкі час, нейкія асобы падрыхтавалі ліст у Башкірскі абкам камуністычнай партыі, дзе звярталіся з просьбай паўплываць на сітуацыю ў педагагічным калектыве, каб башкіры і татары ў тэхнікуме не размаўлялі на сваіх родных мовах. Прапанавалі і мне, адносна яшчэ маладому (пераваліла ўсяго толькі за 25 гадоў) педагогу падпісаць той ліст, на што я адказаў: «Для Башкірыі я прышлы чалавек (пражыў прыблізна тры гады) і не ўпэўнены, што застануся тут надоўга ці назаўсёды. Мову ж зносін ва ўсіх сферах грамадскага жыцця павінны выбіраць карэнныя жыхары той ці іншай саюзнай або аўтаномнай рэспублікі». Пачуць такое ад чалавека тыповага славянскага выгляду было для іх вельмі дзіўна, але ўгаворваць не сталі. Дзесьці праз паўмесяца з абкама партыі прыехала ў тэхнікум высокая асоба мясцовай (башкірскай ці татарскай) нацыянальнасці. Тут партыйны орган Башкірыі зыходзіў з правільнай пазіцыі, што моўнае баш-

кірска-татарскае пытанне трэба развязваць толькі з дапамогай людзей з карэннага насельніцтва. Спачатку камандзіраваная асоба сустракалася з выкладчыкамі башкірскай і татарскай нацыянальнасцяў, а затым і з усім педагагічным калектывам. Ад яе пачулі прапанову, што ў прысутнасці расейскамоўных башкіры і татары ў памяшканні тэхнікума павінны размаўляць паміж сабою толькі па-расейску. Пярэчанняў не было, бо разумелі, што хрушчоўская адліга не мела мэтай асабліва моцна абуджаць нацыянальныя пачуцці нярускіх народаў. Адчувалася, што ніхто з башкіраў і татараў не радаваўся ад такога развязання моўнага пытання. Канфлікт быў загнаны ўнутр. Вонкава стасункі паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў у калектыве выглядалі прыстойна, а што было на сподзе душы ў башкіраў і татараў – цяжка сказаць. Сам жа я адчуваў з іхняга боку нейкую павагу. Калі ў 1991 годзе наведаў Юматаўскі тэхнікум і сустрэўся з былымі калегамі, яны мне нагадалі пра тую гісторыю і, зычліва паляпаўшы па плячы, сказалі: «Спасибо, Леонид Михайлович, за понимание и сочувствие нашим национальным проблемам».

Думаю, што ніколі не ўдасца пачуць такіх слоў на свой адрас А. Салахітдзінавай і Л. Іеўлевай. Цяпер гэтыя педагогі, бясспрэчна, у фаворы ў прадстаўнікоў дзяржаўнай улады, бо дапамагаюць ім праводзіць палітыку русіфікацыі. Але так не можа доўжыцца бясконца. Недалёкі той час, калі беларускі народ зразумее, што нацыянальная школа – гэта галоўны, незаменны сродак выратавання ад этнічнай смерці. Каб наблізіць гэты час, нам трэба ўсяляк умацоўваць кадравы склад педагагічнай інтэлігенцыі асобамі, для якіх беларуская нацыянальная ідэя – гэта святая справа. Упэўнены, што такой яна стане і для многіх людзей іншых нацыянальнасцяў, перадусім татараў, якія на працягу ўсёй гісторыі знаходзілі ўзаемаразуменне з карэнным народам. Радуюся, што няраз даводзілася сустракацца ў прэсе з фактамі выкладання беларускай мовы і літаратуры ў агульнаадукацыйнай школе настаўнікамі з татарскімі прозвішчамі і імёнамі, прычым паволжскага ці крымскага паходжання.

Актывісты сучаснага татарскага нацыянальна-культурнага адраджэння мелі рацыю, што свае першыя крокі адразу ж скіравалі на хутчэйшае аднаўленне мусульманскіх храмаў, бо менавіта іслам дапамог выжыць, захавацца на беларускай зямлі гэтай этнічнай супольнасці. Дзякуючы рэлігіі яна нязменна культывавала ў родным асяроддзі многія ўласцівыя свайму народу адметнасці з духоўнага жыцця і побыту. Багата іх дайшло і да нашага часу. Але сёння яны не

адгароджаныя ад небяспечнага знікнення пад уплывам характэрнай для ўсіх народаў свету стандартызацыі іх жыцця, найперш духоўнага. Таму гэтыя традыцыі трэба ўсяляк захоўваць і прапагандаваць. У якасці такога сродку многімі народамі паспяхова выкарыстоўваюцца краязнаўчыя, этнаграфічныя музеі. Такога татарскага музея ў Беларусі няма, але ён павінен быць закладзены, і найперш у Менску. Месца для яго трэба выбраць у раёне тых вуліц і кварталаў беларускай сталіцы, дзе некалі кампактна жылі татары. Будынак павінен адпавядаць самым высокім патрабаванням сучаснай архітэктуры мусульманскіх народаў і ўпрыгожыць аблічча беларускай сталіцы.

Спяшацца з стварэннем унікальнага музея культуры і побыту беларускіх татараў нас падштурхоўвае натуральнае знікненне тых матэрыяльных прадметаў і рэчаў, якія маглі б служыць у якасці яго экспанатаў. Трэба лічыцца таксама з няўмольным працэсам скарачэння ліку носьбітаў прыроднай культуры гэтай этнічнай супольнасці Беларусі, якія захоўваюць рэдкія рэчы ці маглі б штосьці адметнае стварыць уласнымі рукамі для музея. Беларускія татары вызначаліся і вызначаюцца высокім умельствам у розных відах матэрыяльнай культуры, ужытковага мастацтва. Усёй краіне вядома, якім выдатным, непаўторным майстэрствам у мадэляванні розных фасонаў адзення валодала ўраджэнка Узды, мастачка Айша Александровіч. Не забытыя ёю і ўзоры татарскага нацыянальнага адзення, якімі можна было б упрыгожыць адпаведныя залы музея. Для яго абсталявання не пашкадавалі б часу, энергіі і іншыя татары, якіх Аллаг шчодра надарыў здольнасцямі ў тым ці іншым жанры мастацтва. З заснаваннем у Менску музея культуры і побыту беларускіх татараў істотна палепшыліся б магчымасці правядзення рознага роду культурна-асветніцкіх імпрэзаў і проста для сяброўскіх сустрэч людзей гэтай этнічнай супольнасці. Сёння ж дазволіць сабе такое ў іх практычна няма аніякіх умоваў.

Вялікі ўклад у асвятленне гістарычнага шляху беларускіх татараў зрабілі гісторыкі Станіслаў Думін (масквіч) і Ібрагім Канапацкі, якія выдалі ў 1993 годзе вельмі цікавую і змястоўную кнігу «Беларускія татары: мінулае і сучаснасць». Шэраг навукова-гістарычных публікацый змешчаны ў матэрыялах розных навукова-практычных канферэнцый, на старонках часопісаў, што выходзяць у Беларусі. Аўтарамі такіх публікацый выступаюць не толькі татары, але і беларусы, а таксама людзі іншых нацыянальнасцяў. Актывізацыя і пашырэнне дзейнасці ў гэтым кірунку, далучэнне новых творчых сілаў будзе годным ушанаваннем памяці вялікага татарына Якуба Якубоўскага.

Таксама варта звярнуць увагу на стварэнне мастацкай літаратуры, сюжэтамі для якой з'яўляліся б адметныя падзеі і факты з гісторыі беларускіх татараў. Тое самае датычыць выяўленчага мастацтва, дойлідства, кінематографа. Да сённяшняга дня мне не даводзілася нічога бачыць пра гісторыю беларускіх татараў, што выйшла б з-пад пэндзля мастака, разца скульптара ці з'явілася на кінаэкранах. Папікаць за гэта нашых татараў несправядліва, зусім беспадстаўна, бо іх саміх вельмі мала, каб ускінуць на свае навярэджаныя плечы такі цяжар. Пра гэта мусяць парупіцца і беларусы.

У полі зроку кожнай этнічнай супольнасці, якая не жадае стаць ахвярай культурна-моўнай асіміляцыі, павінна знаходзіцца яго маладое пакаленне, бо яно больш за ўсе іншыя ўзроставыя катэгорыі падпадае пад уплыў стандартызацыі духоўнага жыцця і побыту. Пераканацца ў праўдзівасці гэтых слоў можна на горкім шматгадовым досведзе беларусаў, дзеці якіх, пачынаючы з садкоў і канчаючы вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, узгадоўваюцца не ў адпаведнасці з сваімі прыроднымі культурна-моўнымі традыцыямі, таму не маюць належнай павагі ні да матчынай мовы, ні да духоўнай спадчыны старэйшых пакаленняў. Вельмі ўсцешна, што нашыя татары, разумеючы гэта, стварылі ў лістападзе 1997 года Беларускае рэгіянальнае аб'яднанне татарскай моладзі, мэта якога – адраджэнне старажытных традыцый і культуры татараў Беларусі, стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця татарскай моладзі Беларусі.

Мы ўступілі ў новае, XXI стагоддзе. Яно будзе намнога больш складаным у параўнанні з папярэднімі ста гадамі ў сэнсе магчымага захавання на планеце Зямля не толькі нятытульных, але і шмат якіх тытульных народаў, асабліва калі іх дзяржавы не праводзяць разумнай нацыянальнай палітыкі. Да такіх суровых выпрабаванняў трэба ўжо зараз самым сур'ёзным чынам рыхтавацца, прычым не толькі беларускім татарам, але і самой тытульнай нацыі Рэспублікі Беларусь – беларусам, бо няма аніякай радасці аказацца праглынутымі жыўцом большымі суседнімі народамі. Татарская супольнасць у тым адметным, непаўторным абліччы, у якім яна існавала на беларускай зямлі цягам стагоддзяў, зможа захавацца і развівацца толькі пры ўмове, калі беларускі народ дарэшты не даканае расейская культурна-моўная асіміляцыя. Выміранне беларусаў як самабытнай нацыі карэнным чынам зменіць этнакультурныя асновы жыцця татараў. У ім мала чаго застанецца з таго, што яны пранеслі праз стагоддзі жыцця на сваёй другой радзіме – Беларусі.

ДАДАТАК

У ВЯНОК ПАМЯЦІ ЯКУБА ЯКУБОЎСКАГА

Іван Драўніцкі

Успамінаючы дзяцінства, школьныя гады мы з Якубам Адамавічам не раз згадвалі былую настаўніцу Яніну Пашкоўскую. Хаця былых настаўнікаў не бывае: яны ўсё жыццё з сваімі вучнямі, з'яўляюцца яркай паходняй, якая асвятляе жыццёвыя дарогі выхаванцаў.

Брутальны арышт нашай любімай настаўніцы пакінуў у памяці былых яе вучняў моцнае журботнае ўражанне. Неяк Якуб, нястомны генератар ідэяў, прапанаваў мне:

– Ты, Янэчак, бліжэй да Камаяў, часцей бываеш там, паспрабуй сабраць звесткі пра Яніну Аніцэтаўну. Яна вартая таго.

Я згадзіўся. Але задача аказалася не з лёгкіх. Многія местачкоўцы пасля двух пажараў у вайну назаўсёды пакінулі Камаі, шмат хто памёр. Камайская школа вядзе летапіс сваёй навучальнай установы, але толькі з 1950 года. У 2008 годзе ў час наведвання Камаяў даведаўся, што да Ірэны Грыбоўскай з Польшчы прыязджалі людзі, фатаграфавалі хату, дзе жыла Яніна Пашкоўская. Ірэна Грыбоўская пацвердзіла, што ў яе сапраўды гасцявалі настаўнічыны дзеці, пераказала іхныя ўспаміны і дала адрас сыноў. Я распачаў з імі перапіску. На мае пытанні яны давалі вычарпальныя адказы, даслалі фотаздымкі. А яшчэ трапіла ў рукі кніга святара Камайскай парафіі за 1911 год, у якой змешчаны спісы ўсіх людзей парафіі, якіх ён наведаў у час калядавання, з пазнакай ступені сваяцтва і ўзросту. Вось гэтыя крыніцы далі мне магчымасць ажыццявіць задуму Якуба Якубоўскага – напісаць пра настаўніцу артыкул. Аўтара ідэі ўжо не было сярод жывых, пасеенае ж ім зерне дало плён. Я напісаў артыкул «Інтэлігент у першым пакаленні» і лічу сваім абавязкам у памяць пра Якуба змясціць яго ў гэтай кнізе.

Вясковы інтэлігент. Яніна Гайдук (па мужу Пашкоўская) нарадзілася 2 чэрвеня 1902 года ў Камаях. Яна была адзінай дачкой Аніцэта і Марыі Гайдукоў. Ейны дзед Уладзіслаў Гайдук, які жыў у Буцаві-

чах з жонкай, меў 5 сясцёр і жанатага брата. Калі Аніцэт прывёў у хату сваю жонку з дачкой, то разам у доме аказалася дзевяць жанчын і трое мужчын. Стала цесна. Аніцэт вырашыў выехаць з жонкай і дзіцем у Пецярбург. Жылі там няблага, у дастатку, Аніцэт добра зарабляў. Але праз 2 гады ў 1904 годзе Аніцэт раптоўна памёр. Марыя Гайдук з дачушкай Янінай вярнулася ў 1906 годзе на радзіму, але ўжо не ў Буцавічы, а ў Камаі да бабкі Русак. Знайсці працу ў Камаях не ўдалося, і ў 1907 годзе яна зноў паехала з чатырохгадовай Янінай ў Пецярбург. Там Марыя працавала выхавальніцай дзяцей у доктара, які жыў на Неўскім праспекце пры самым касцёле Святой пакутніцы Кацярыны Александрыйскай. Пры касцёле на сродкі польскай дыяспары існавала дабрачынная школа для дзяцей з былой Рэчы Паспалітай.

Яніна была вельмі кемлівым дзіцем, у пяцігадовым узросце разам з дзецьмі лекара навучылася чытаць. Шасцігадовую Яніну маці ўладкавала ў парафіяльную польскую школу пры касцёле Святой Кацярыны. Там дзяўчатак рыхтавалі да педагагічнай працы – быць выхавальніцамі або настаўніцамі. Вывучалі, апрача расейскай, польскую і французскую мовы, навучаліся спяваць і граць на скрыпцы. У 1914 годзе Яніна паспяхова здала экзамены за курс парафіяльнай школы і ўладкавалася на вучобу ў настаўніцкую семінарыю з казённым утрыманнем, якая рыхтавала настаўнікаў пачатковых класаў.

1 жніўня 1914 года пачалася Першая сусветная вайна. Умовы жыцця ў Пецярбурзе пагоршыліся, а вяртацца на радзіму не было магчымасці, бо ў верасні 1915 года Камаі занялі немцы. Маці прыклала ўсе намаганні, каб дачка вучылася, і Яніна паспела ў 1917 годзе скончыць семінарыю. У гэты час у асяроддзі каталіцкага духавенства і вернікаў назіраўся асабліва моцны патрыятычны настрой. У семінарыі Яніна пазнаёмілася з беларускімі газетамі «Дзянніца» і «Светач», якія выходзілі ў Пецярбурзе.

У кастрычніку 1917 года адбылася рэвалюцыя, якая перарасла ў грамадзянскую вайну. Доктара, у якога маці працавала, рэпрэсавалі, знайсці працу стала цяжка. Не мела працы і Яніна. Перакідваліся выпадковымі заробкамі, галадалі і ў 1919 годзе вярнуліся ў Камаі.

У 1920 годзе Камайшчына ўвайшла ў створаную генералам Люцыянам Жэлігоўскім міні-дзяржаву Сярэдняя Літва, улады якой пэўны час спрыялі беларушчыне: адчынілася Барунская настаўніцкая семінарыя, працавала Віленская беларуская гімназія, былі

створаныя 186 беларускіх школ. Актыўна дзейнічала Таварыства беларускай школы. У 1920 годзе адчынілася беларуская школа і ў Камаях. Яніна ўладкавалася працаваць настаўніцай пачатковых класаў. Яна была таленавітым педагогам з грунтоўнай адукацыяй. Ведала пяць моваў. Беларускую засвоіла ад бабулі, у дабрачыннай парафіяльнай школе Святой Кацярыны вывучыла польскую, расейскую і французскую мовы і ігру на скрыпцы, а ў настаўніцкай семінарыі дадалася яшчэ нямецкая мова. Калі ў 1921 годзе ў вёсцы Мягуны адчынілася аднакамплектная пачатковая школа, дзе зусім не было настаўніка, Яніна згадзілася паехаць ў гэтую аддаленую вёску. Адна працавала з усімі класамі. Шмат увагі аддавала не толькі навучанню дзяцей, але і культуры паводзін, асабістай гігіене, вучыла іх быць гаспадарлівымі. Яна ў Мягунах была адзіным адукаваным чалавекам. Даводзілася выконваць функцыі акушэркі, медсятры, навучаць вясковых жанчын ручной працы і агародніцтву. Нават увосень ці ўвесну конна дабіралася па бездаражы. Гэта была цяжкая праца, але настаўніца з ёю спраўлялася, за што людзі яе любілі і паважалі.

Пасля рэферэндуму 1922 года Сярэдняя Літва была далучаная да Польшчы. Некаторы час польскія ўлады прызнавалі асветніцкія ініцыятывы мясцовай нашай інтэлігенцыі, мірыліся з наяўнасцю беларускіх школ, але потым беларушчыну сталі кваліфікаваць як частку падрыўной камуністычнай дзейнасці. Прэм'ер-міністр Польшчы Грабскі заявіў: «Беларускія школы і гімназіі трэба ліквідаваць». Што і было зроблена. У 1924 годзе Яніна вярнулася працаваць ў Камайскую школу, якую ўжо зрабілі польскай паўшэхнай.

Яшчэ ў 1921 годзе, 13 лістапада, яна пабралася з Уладзіславам Пашкоўскім. Стала папаўняцца сям'я. У 1925 годзе нарадзілася дачушка Людвіка, у 1928-м – сын Генрык, у 1932-м – Багдан. Заробкі ў настаўніцы былі добрыя. Нарэшце Пашкоўскія пачалі жыць заможна, старэйшую дачку адправілі вучыцца ў Свянцянскую гімназію. Сам Уладзіслаў працаваў у кааператыве «Каса Стэфчыка», а пад канец 30-х гадоў, ад 1935 да 1939 года, быў дырэктарам кааператыўнага банку ў Варнянах (цяпер Астравецкі раён).

Калі ў верасні 1939 года ў Камаі прыйшлі саветы, спадарыня Яніна працягвала настаўнічаць. У гэты час на сям'ю Пашкоўскіх абрынулася хваля сталінскіх рэпрэсій. Вывезлі ў Сібір дачку Людвіку, потым мужа Уладзіслава, а 25 красавіка 1940 года і самую Яніну з дзецьмі.

Запісы з успамінаў Генрыка Пашкоўскага. Праз шмат гадоў сын настаўніцы успамінаў пра падзеі пасля арышту маці:

«Калі мы прыбеглі з школы ў хату, там ішоў ператрус. Усё з шафы і куфра энкавэдысты параскідалі па падлозе, распаролі нават сяннікі і салому ператрэслі, шукалі каштоўнасці ці забароненую літаратуру, але нічога не знайшлі. Тым не менш начальнік групы даў загад збірацца на вываз. Ні нашы слёзы, ні маміна галашэнне спачування не знайшлі. Больш за тое – раззлавалі начальніка, які, уставіўшы не чуты дагэтуль мат, закрычаў:

– Быстрее собирайтесь, польская сволочь!»

Успамінаючы гэту абразу, Генрык разважаў: «Не магу зразумець, чаму савецкі начальнік назваў нас польскімі сволачамі. Мае бацькі, дзяды, прадзеды і прапрадзеды, якія спрадаўна жылі на Камайшчыне, былі прыстойнымі людзьмі…

Бацька нарадзіўся тут у вёсцы Дубнікі ў працавітай шматдзетнай сям'і, вучыўся ў Камайскай школе, у 16-гадовым узросце паехаў на заробкі ў Пецярбург, працаваў на розных работах. Пасля грамадзянскай вайны вярнуўся на радзіму, стаў працаваць у банкавай сістэме. У палітыку не ўмешваўся…

Развіталіся мы з улюбёным месцам, з домам, з усім набытым. І з рэчамі па 20 кілаграмаў на кожнага пасадзілі нас на калёсы і пад канвоем, як злачынцаў, павезлі на станцыю ў Гадуцішкі. Там пасадзілі ў таварны вагон, які не абагравaўся, і – у Сібір. У вагоне было каля сарака чалавек, у асноўным жанчыны і дзеці. Прыбіральні не было: адна з жанчын высекла ў падлозе дзірку і паставіла туды гаршок. Калі цягнік спыняўся, можна было пад канвоем набраць халоднай вады. Ехалі дзень і ноч. Есці нам нічога не давалі, а ўзятыя з сабой хлеб і сухары канчаліся. Галадалі. Праз два тыдні падарожжа ў сярэдзіне траўня загадалі пакінуць вагон. Апынуліся мы ў Казахстане».

У высылцы мясцовыя людзі ставіліся да рэпрэсаваных прыхільна, але матэрыяльна дапамагчы не маглі, бо самі жылі досыць бедна. Тубыльцамі былі казахі, з якіх кожны трэці памёр у час голаду ў 1933 годзе. Бальшыню насельніцтва складалі ссыльныя ўкраінцы, высланыя ў 1932–1933 гадах пад час Галадамору, расейцы, чачэнцы, грузіны, чаркесы, немцы з аўтаномнай рэспублікі Паволжа і шмат нашчадкаў высланых удзельнікаў антырасейскіх паўстанняў XIX стагоддзя. Сям'ю Пашкоўскіх і яшчэ дзве сям'і пасялілі ў пустым доме. Не было за што харчавацца. Жанчыны змушаныя былі мяняць адзенне на ежу. Спадарыня Яніна выменяла на хустку вядро

бульбы і выдзяляла дзецям па дзве бульбіны на дзень. Энкавэдысты намаўлялі яе зрачыся польскага грамадзянства і супрацоўнічаць з імі, абяцалі даць лягчэйшую працу. Яна не згадзілася. Тады ёй далі цяжкую фізічную работу, да якой яна не мела навыкаў. У выніку ў яе апухлі рукі і ногі. За працу ад усходу да змяркання атрымлівала 300 грам «галет» – гэта штосьці накшталт высушанага хлеба.

Ад цяжкой працы і перспектывы памерці ад голаду Яніну выратавала добрае веданне расейскай мовы і матэматыкі, уменне друкаваць на канцылярскай машынцы. Яе прызначылі працаваць бухгалтарам.

Потым неяк удалося далучыцца да сям'і і Людвіцы. Пасля нападу немцаў на СССР пачалі пакрыху выпускаць вязняў, дазвалялі злучацца з сем'ямі. У кастрычніку 1941 года бацька Уладзіслаў далучыўся да сям'і. Упецярых стала лягчэй. У 1944 годзе праз амерыканскі Чырвоны Крыж высланым стала паступаць дапамога. Маці атрымала два кілаграмы мукі і каву з цукрам у брыкетах, рыс, сукенку, бацька – салдацкія боты і плашч. Там пражылі шэсць гадоў, да 1946 года.

Вяртанне сям'і Пашкоўскіх. У траўні 1946 года Пашкоўскім аддалі дакументы і дазволілі вярнуцца на радзіму. Бацькі не прынялі савецкага грамадзянства, таму ў Камаі вярнуцца нельга было. Паехалі ў Польшчу як найдалей ад мяжы з СССР, даехалі аж да Шчэціна. Тут атрымалі жыллё. Пачалі пошукі працы. Спадарыня Яніна ўладкавалася ў дзяржаўным банку ПКО (Польская ашчадная каса), а муж – рабочым на гарадскім водаправодзе. Польскія ўлады стварылі дзецям перасяленцаў умовы для вучобы: Людвіка скончыла Варшаўскі палітэхнічны інстытут, Генрык – Шчэцінскі, Багдан – Гданьскі.

13 лістапада 1981 года Пашкоўскія мелі святкаваць 60-годдзе шлюбу, але за два дні да гэтага спадарыня Яніна занядужыла, пайшла да лекара, у яго кабінеце знепрытомнела і памерла. Мела 79 гадоў. Уладзіслаў Пашкоўскі пражыў 105 гадоў, памёр у Шчэціне ў 1993 годзе.

Продкі роду Пашкоўскіх-Гайдук. У бацькоў Уладзіслава Пашкоўскага Яна і Антаніны было дзевяць дзяцей: сем дочак і сыны Уладыслаў і Франак. Ян пяць гадоў служыў у царскім войску на Каўказе, даслужыўся да падафіцэра. Каб утрымліваць вялікую сям'ю, заробку было замала, таму ў Дубніках трымалі невялікую гаспадарку: мелі крыху лесу, сад, гадавалі кароў, свіней. Ян займаўся таксама кавальствам, сталярствам, шавецтвам, нават пашыў боты 16-гадоваму сыну, калі той паехаў на заработкі ў Петраград.

Маці Уладзіслава Антаніна паходзіла з дому Мачульскіх. Яе бацька, Антон Мачульскі, быў жанаты з Зофіяй з дому Чыпчынскіх, быў шляхцічам, меў маёнтак. У 1863 годзе далучыўся да антырасейскага паўстання і загінуў у бітве. За ўдзел у паўстанні царскія ўлады канфіскавалі маёнтак Мачульскіх. Зофія была вымушана з трыма дзецьмі Разаліяй, Антонам і Антанінай перайсці жыць у Каралінова да старэйшай дачкі Эміліі, якая была замужам за шляхцічам Янкевічам, што арандаваў маёнтак.

Бацька Яніны Аніцэт Гайдук нарадзіўся ў Буцавічах у шматдзетнай сялянскай сям'і. У яго было пяць сясцёр і брат. У 1901 годзе ажаніўся з Марыяй Русак, якая жыла з сваёй рана заўдавелай маці ў Камаях.

Лёс нашчадкаў Яніны Пашкоўскай. У замежжы лёс Пашкоўскіх склаўся добра. Сын Яніны Багдан скончыў сярэднюю тэхнічную школу, потым суднабудаўнічы факультэт Гданьскага політэхнічнага інстытута і пайшоў працаваць галоўным канструктарам на Гданьскай верфі, дзе будавалі судны для шмат якіх краін свету. Ад 1986 да 1994 года працаваў на Стамбульскіх верфях (Турцыя) начальнікам групы польскіх кансультантаў. Абедзве яго дачкі, Ёанна і Аніта, маюць вышэйшую адукацыю.

Людвіка памерла ў 1973 годзе. Пражыла толькі 48 гадоў. Яе дачка Гражына – спявачка Варшаўскай філармоніі, а Малгажата – скрыпачка, жыве ў Іспаніі.

У Генрыка тры сыны: Збігнеў – архітэктар, прафесар політэхнічнага інстытута ў Шчэціне, Мікалай – інфарматык-эканаміст, Габрыель, чыя дачка скончыла Акадэмію спорту.

ЭПІЛОГ

У жыцці Якуба Якубоўскага, як і кожнага чалавека, было некалькі кругабегаў, адметных сваімі мэтамі і дасягненнямі. Мне бачацца найбольш выразных пяць такіх перыядаў.

Першы кругабег – ад нараджэння да заканчэння вучобы ў школе (1932–1950 гг.) – прыпадае на жыццё з бацькамі ў Камаях і Відзах. Нягледзячы на цяжкія выпрабаванні ваенных і паваенных гадоў, што выпалі на долю сям'і, Якуб паспяхова скончыў Відзаўскую дзесяцігодку і загартаваў свой характар.

Другі кругабег (1950–1958 гг.) – праца ў школах вёсак Далёкія і Тракішкі цяперашняга Браслаўскага раёна, завочная вучоба ў Менскім настаўніцкім інстытуце і на першым курсе геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. За гэты час дзякуючы не толькі вучобе, але і ўпартай самаадукацыі стаў эрудзіраваным чалавекам, набыў прафесію гісторыка.

Трэці кругабег (1958–1967 гг.) – перыяд вучобы на дзённым аддзяленні геаграфічнага факультэта БДУ, завочная аспірантура тамсама і праца інжынерам-глебазнаўцам у Беларускім навукова-даследчым інстытуце глебазнаўства Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР. У выніку стаў кваліфікаваным спецыялістам ў фізічнай геаграфіі, асвоіў і правёў абследаванне глебаў у некалькіх гаспадарках раёнаў Беларусі ў рамках дзяржаўнай глебавай здымкі маштабу 1:10000, паглыбіў свае веды ў лімналогіі і азёразнаўстве, стварыў сям'ю.

Чацвёрты кругабег, самы працяглы і плённы, – гэта праца ў Энцыклапедычным выдавецтве (1967–1992 гг.), з іх 24 гады загадчыкам галіновай рэдакцыі геаграфіі, геалогіі і геафізікі. Больш за 10 найменняў і больш за 35 тамоў энцыклапедычных выданняў створаныя з удзелам Якуба Якубоўскага. За выданне 12-тамовай універсальнай «Беларускай Савецкай энцыклапедыі» ў 1976 годзе ўганараваны званнем лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР. Свае веды географа ўвасобіў у пяцітамовіку «Энцыклапедыя прыроды Беларусі». Гэтым

часам скончыў завочнае навучанне на двух факультэтах Беларускага дзяржаўнага педінстытута (гістарычным і філалагічным), пачаў актыўна ўдзельнічаць у нацыянальным і рэлігійна-культурным адраджэнні татарскай супольнасці ў Беларусі. Адбыліся змены і ў сям'і: пайшлі ў іншы свет бацькі Якуба, выраслі дзеці. Дачка Аўгіння скончыла Беларускі дзяржаўны політэхнічны інстытут і стала архітэктарам, сын Канстанцін паступіў у Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пяты кругабег кароткі, але шчаслівы. Ён перакрываецца з папярэднім, бо пачаўся ў 1991 годзе і доўжыўся да канца жыцця (1991–1998 гг.). Адметны тым, што ўсе намаганні былі скіраваныя на адраджэнне гістарычнай і культурнай спадчыны беларускіх татараў. На гэты час прыпадае росквіт творчых сіл і здзяйсненне многіх мараў Якуба – стварэнне Беларускага згуртавання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб» і яго перыядычнага выдання, квартальніка «Байрам», удзел ў аднаўленні зруйнаваных мячэцяў і арганізацыя міжнародных навукова-практычных канферэнцый, прысвечаных гістарычнай спадчыне татараў Беларусі, Летувы і Польшчы, пытанням нацыянальнага адраджэння беларусаў і татараў ды інш. У гэты перыяд была распачатая праца па стварэнні «Энцыклапедычнага даведніка для татараў Беларусі», вынікам якой стаў слоўнік (рэестр) 10 000 тэрмінаў з дэфініцыямі і 350 узорных артыкулаў для гэтай энцыклапедыі, апублікаваных у «Байраме». Завяршаў вучобу ў Маскоўскім авіяцыйным інстытуце сын.

Кругабег спыніўся неспадзявана, і Якуб не змог ажыццявіць сваю самую запаветную мару – выдаць энцыклапедыю для татараў Беларусі. Гэтую вялікую справу ён пакінуў сваім нашчадкам па духу і крыві, паслядоўнікам у татарскай справе. І надзея не згасае, пра што так аптымістычна і натхнёна напісаў Леанід Лыч у развітальным слове да Якуба Якубоўскага: «Добрыя справы не забываюць нашчадкі, не забудзецца, вельмі шаноўны Якубе, і зробленае табой для тваіх братоў-татараў. Цвёрда ўпэўнены, яны не спыняць самаахвярных намаганняў, каб адрадзіць культуру і мову старэйшых пакаленняў. У гэтым сённяшнія татары могуць разлічваць на дапамогу сваіх беларускіх сяброў...»

Таццяна Якубоўская

ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

Александровіч Ісмаіл Мустафавіч – па адукацыі інжынер. Нарадзіўся ў Клецку ў 1929 годзе. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. У 1994–2000 гадах муфцій, старшыня Праўлення Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Беларусі. Рэлігійную адукацыю атрымаў у сям'і: бацька быў імамам у Клецку да 1953 года, старэйшы брат – імамам супольні польскіх, беларускіх і летувіскіх татараў у Нью-Ёрку (ЗША). Ісмаіл Мустафавіч ад 1991 года актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці Беларускага згуртавання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб», пазней «Зікр уль-Кітаб», быў сябрам рэдактарскай групы часопіса «Байрам». З яго ініцыятывы і актыўным удзелам ствараліся мусульманскія супольні, аднаўляліся мячэці, адраджаліся мусульманскія святы і звычаі сярод татараў Беларусі. Жыве ў Менску.

Александровіч Разалія Адамаўна – метадыст вышэйшай катэгорыі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі. Магістр філалогіі (1984 г.). Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў. Нарадзілася ў Навагрудку ў 1957 годзе. Скончыла аспірантуру НІА (2006 г.). Кола навуковых інтарэсаў – методыка далучэння дзяцей да гісторыі і культуры свайго этнаса на прыкладзе сем'яў беларускіх татараў, гісторыя і культура беларускіх татараў. Мае шэраг публікацый у перыядычным друку, зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, навуковых выданнях, у тым ліку ў часопісе «Байрам», газеце «Жыццё татарскае». Сябар рэдакцыйнай групы часопіса «Байрам». Аўтар кнігі «Зямля з блакітнымі вачыма» (у суаўтарстве з Т. Нескаромнай), эсэ пра свой радавод «Яе любіў Алах» (Дзяслоў, 2014, № 2). Жыве ў Менску.

Афнагель Ігар Яўгенавіч – спецыяліст у фізічнай геаграфіі, выдавец. Нарадзіўся ў Менску ў 1938 годзе. Бацька ў час Другой сусветнай вайны быў у групе падпольшчыкаў, што выдавала газету «Звязда», загінуў у фашысцкай катавальні пры разгроме менскага падполля ў пачатку 1944 года. Гадаваўся ў дзіцячым доме. Скончыў геафак БДУ (1961 г.). На пенсію вышаў у 2002 годзе з пасады вядучага навуковага рэдактара галіновай рэдакцыі геаграфіі ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Рыхтаваў грунтоўныя артыкулы па гідралогіі, метэаралогіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, Беларусі, замежных краінах і іншай тэматыцы для многіх энцыклапедычных выданняў. Жыве ў Менску.

Вайткевіч Вячаслаў Сцяпанавіч – мовазнавец, выдавец. Нарадзіўся ў 1941 годзе. Карэнны менчук шляхоцкага паходжання. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1966 г.). Працаваў старшым навуковым рэдактарам рэдакцыі літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі ў былой БелСЭ (да 1983 г.). Браў удзел у стварэнні 12-тамовай універсальнай «Беларускай савецкай энцыклапедыі» (1969–1975 гг.), 5-тамовай «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (1984–1987 гг.) ды іншых энцыклапедый. Ад 1983 года – загадчык аддзела эстэтыкі, тэорыі і гісторыі мастацтва часопіса «Мастацтва Беларусі» («Мастацтва»), дзе працаваў да 2005 года. Жыве ў Менску.

Гучок Яўген Сяргеевіч – беларускі паэт, публіцыст. Нарадзіўся у Слуцку ў 1940 годзе. Бацька яго паходзіць з чэхаў, маці – з княскага роду Алелькавічаў. У 1960–1963 гадах служыў у Савецкай Арміі. Скончыў філфак БДУ (1968 г.), а крыху пазней аспірантуру пры ім. Вучыўся ў Маскоўскім паліграфічным інстытуце. Ад 1971 года на працягу 30 гадоў працаваў рэдактарам і вядучым рэдактарам у выдавецтве «Народная асвета» (рэдакцыя гісторыі і геаграфіі). Браў удзел у арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны і БНФ «Адраджэнне». Грамадскім Камітэтам Ушанавання ўзнагароджаны медалём Міколы Ермаловіча і адпаведным дыпломам (2006 г.). Занесены у кнігу гонару клуба «Спадчына» «Рупліўцы твае, Беларусь». Сябар рэдактарскай групы часопіса «Байрам». У 2014 годзе вышла яго чатырнаццатая кніга «Альгерд Абуховіч». Шмат друкуецца ў перыядычных выданнях – «Наша слова», «Народная воля» і інш. Жыве ў Менску.

Канапацкі Ібрагім Барысавіч – гісторык, грамадскі і рэлігійны дзяяч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, адзін з лідэраў татарскага адраджэння ў Беларусі. Нарадзіўся ў Смілавічах у 1949 годзе. Паходзіць з шляхоцкага роду. У 1990-х гадах стаяў ля вытокаў стварэння Беларускага згуртавання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб» («Кніга»); ад 2000 – Беларускае грамадзкае згуртаванне татараў «Зікр уль-Кітаб» («Памяць і кніга»). Уваходзіў у склад кіраўніцтва мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Беларусі – муфтэят, стаўшы намеснікам муфція і старшынёй мусульманскай суполкі Менска. Быў галоўным рэдактарам часопісаў «Байрам», «Аль-Ислам», газет «Жизнь» і «Жыццё татарскае», «Календара татараў-мусульманаў Беларусі». Даследаваў гісторыю татараў на Беларусі. Асноўныя вынікі апублікаваны ў кнігах «Беларускія татары: мінулае і сучаснасць» (1993; у суаўтарстве з С. Думіным), «Гісторыя і культура беларускіх татар» (2000; у суаўтарстве з А. Смолікам). Прыкладаў вялікія намаганні для адбудовы мячэцяў у Беларусі, стварэння татарскага культурнага цэнтра ў Іўі, падтрымліваў шчыльныя сувязі з мусульманскім светам, годна прадстаўляў беларускіх татараў на міжнародных форумах. У педуніверсітэце чытаў лекцыі па гісторыі на беларускай мове. Камітэтам Ушанавання адным з першых уга-

нараваны медалём і дыпломам Міколы Шчакаціхіна «За братэрскае спрычыненне ў развіцці навукі і культуры Беларусі» (1998). Занесены у кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь». Памёр у 2005 годзе. Пахаваны ў Смілавічах.

Канапацкі Мустафа Барысавіч – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. Нарадзіўся ў Смілавічах ў 1952 годзе. Скончыў Менскі педагагічны інстытут (1983 г.) па спецыяльнасці гісторыя і замежныя мовы, аспірантуру (1988 г.). Тэматыка навуковых даследаванняў – палітыка, рэлігія, тэорыя палітычнай сістэмы. Замяніў свайго брата Ібрагіма Канапацкага ў справах мусульманскай суполкі горада Менска. Жыве ў Менску.

Качкоў Юры Пятровіч – кандыдат геаграфічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі экалогіі ландшафтаў геаграфічнага факультэта БДУ. Нарадзіўся у г. Ахалцыхе ў Грузіі ў 1937 годзе. Бацька быў там пагранічнікам (а родам ён з Архангельску). Дзесяцігодку скончыў у Карэлічах, вышэйшую адукацыю атрымаў на геаграфічным факультэце БДУ (1959 г.), пасля заканчэння якога працаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце глебазнаўства. Навуковыя даследаванні і публікацыі па картаграфаванню, раянаванню, тыпалогіі і маніторынгу глебавага покрыва і ландшафтаў тэрыторыі Беларусі, у т. л. у Белавежскай пушчы, Браслаўскім нацыянальным парку, у Нацыянальным парку «Нарачанскі» і шмат якіх заказніках. Жыве ў Менску.

Крэнь Ірына Платонаўна – літаратар, выдавец. Нарадзілася на Навагрудчыне ў сяле Ярашоўка ў 1930 годзе. Дачка рэпрэсаванага літаратара Платона Крэня, які вярнуўся дамоў з ГУЛАГу ў 1953 годзе. Скончыла беларускае аддзяленне філфака БДУ (1953 г.). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, навуковым супрацоўнікам у Інстытуце літаратуры, у галоўнай рэдакцыі «БелСЭ» – навуковым рэдактарам у групе транскрыпцыі, у Інстытуце педагогікі, стыльрэдактарам у газеце «Наша слова». У яе шмат артыкулаў пра пісьменнікаў, навукоўцаў, дзеячоў культуры, займалася даследаваннем жыцця і творчасці Максіма Багдановіча і ўсяго, што было з ім звязана. З яе ўдзелам убачыў свет альбом пра Францішка Багушэвіча (1986 г.). Узлётам Ірыны Крэнь быў і яе празаічны дэбют у «Маладосці» апавяданнем пра Чабатара. Ірына сабрала ўсе бацькавы творы – вершы на дзвюх мовах і ўспаміны – і выпусціла асобнаю кніжкай у выдавецтве «Беларускі кнігазбор» пад назваю «Бывай, Ярашоўка!» (1999 г.). Памерла ў 2005 годзе. Пахавана ў Менску.

Лашкевіч Аляксандр Аляксандравіч – гісторык, архівіст, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў Барысаве ў 1953 годзе. Скончыў Гомельскі ўніверсітэт (1975 г.). Кандыдатскую работу абараніў у Маскве ў Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі (1989 г.). Навуковыя даследаванні па гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. На пенсіі, апошнім часам

працаваў вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела старажытных актаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1993–2013 гг.). Аўтар шэрагу навуковых артыкулаў і допісаў у часопісе «Байрам». Жыве ў Менску.

Лыч Леанід Міхайлавіч – доктар гістарычных навук, прафесар. Ганаровы сябар клуба «Спадчына» (1994 г.), намеснік старшыні Камітэта Ушанавання. Нарадзіўся ў в. Магільнае Уздзенскага раёна ў 1929 годзе. Скончыў Башкірскі педагагічны інстытут (1957 г.). Працаваў настаўнікам. Ад 1962 года – у Інстытуце гісторыі АН БССР (цяпер НАН Беларусі). Даследаваў пытанні сацыяльна-класавых дачыненняў у савецкі час, гісторыю беларускай чыгункі, пазней – праблематыку айчыннай культуры, моўнай палітыкі ў XIX–XX стагоддзях, міжнацыянальныя адносіны ў XX стагоддзі ў Беларусі. Аўтар шматлікіх манаграфій і навукова-публіцыстычных артыкулаў на гэтыя тэмы. Найважнейшыя навуковыя творы апошніх гадоў: «Беларуская нацыянальная ідэя: тэарэтычны і практычны аспекты», «Першаму з'езду беларусаў свету – 20 гадоў», «Культурнае супрацоўніцтва беларускага і ўкраінскага народаў – гарант захавання іх нацыянальнай ідэнтычнасці», «Міжваенная беларусізацыя, яе ўрокі», «Беларускае нацыянальнае пытанне ў калейдаскопе думак», «Моладзі – праўдзівую гісторыю Беларусі». Жыве ў Менску.

Маліноўскі Міхась Міхайлавіч – краязнавец, журналіст, перакладнік. Сябар былога Саюза журналістаў СССР (1976 г.), правадзейны сябар Геаграфічнага таварыства пры Акадэміі навук СССР (1979 г.). Нарадзіўся ў вёсцы Угрынь (хутар Равеста) Зэльвенскага раёна ў 1945 годзе ў сялянскай сям'і. Бацька загінуў у год заканчэння Другой сусветнай вайны. Выхоўваўся ў дзіцячым доме і школе-інтэрнаце, быў вайскоўцам (1964–1991 гг.), скончыў Свярдлоўскае вышэйшае вайскова-палітычнае танкава-артылерыйскае вучылішча (1978 г.), завочна з адзнакай – Амурскае абласное культурна-асветнае вучылішча Міністэрства культуры РСФСР (г. Благавешчанск, 1984 г.). Ад 1991 года жыве ў Беларусі. Публікуецца ў перыядычным друку на тэмы гісторыі, культуры, літаратуры, вайсковай справы, патрыятычнага выхавання і інш. Занесены ў кнігу-даведнік «Людзі культуры Гродзеншчыны» і «Памяць» Ашмянскага раёна. Актыўны аўтар часопіса «Байрам», мае плённыя стасункі з грамадскім аб'яднаннем татараў «Зікр уль-Кітаб» і мусульманскім рэлігійным аб'яднаннем Беларусі. Жыве ў Баранавічах.

Меметаў Ісмаіл Ісмаілавіч – вайсковец, папулярызатар гісторыі крымскіх татараў. Нарадзіўся ў сяле Біюк-Каралёз Бахчысарайскага павета ў 1916 годзе. Удзельнік Другой сусветнай вайны, падпалкоўнік. Ганаровы сябар Беларускага згуртавання татараў-мусульманаў «Аль-Кітаб», шмат зрабіў для азнаямлення беларускіх татараў з гісторыяй, мовай і культурай крымскіх татараў, актыўна супрацоўнічаў з рэдактарскай групай часопіса «Байрам», у прыватнасці рыхтаваў крымскататарска-беларускі слоўнік. Памёр ў 1997 годзе. Пахаваны ў Менску.

Цыркуноў Алесь Іванавіч – мастак-жывапісец, педагог. Нарадзіўся ў в. Лясань Жлобінскага раёна ў 1948 годзе. Скончыў Менскі тэатральна-мастацкі інстытут (1976 г.). Сябар Беларускага саюза мастакоў (суполка «Пагоня»). Намеснік старшыні клуба «Спадчына». Творы знаходзяцца ў Старадарожскім мастацкім музеі Анатоля Белага, прыватных зборах за межамі Беларусі, у музеях Менска ды іншых гарадоў Беларусі. Удзельнік выставаў: Рэспубліканская выстаўка «Слава працы» (1976 г.), групавыя выставы за мяжой у складзе суполак: «Няміга – 17» (1990 г., Рыга), «Пагоня» (1991 г., Вільня) ды інш. Пасля Чарнобыльскай аварыі сюжэты твораў набылі нацыянальную тэматыку. Аўтар архітэктурна-мемарыяльных знакаў, у тым ліку ў Нарачанскім краі – «Помнік пані Вандзе Ромер» (1850–1944 гг.) у в. Каралінова Пастаўскага раёна; «Крыж усім святым Беларусі ў 2000-годдзе нараджэння Хрыстова» (усталяваны ў в. Чэхі Мядзельскага раёна). Тэма суіснавання беларусаў і татараў, іх культуры і рэлігіі на нашай зямлі адлюстравана ў трытворы «Адвечнае святло Беларусі», часткова ў кампазіцыі партрэта Якуба Якубоўскага. За актыўную дзейнасць на ніве нацыянальнага Адраджэння Камітэтам Ушанавання ганараваны медалём Герба «Пагоня» (1997 г.), ордэнам «Гонар Айчыны» (2000 г.) і адпаведнымі дыпломамі. Занесены ў кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь». Жыве ў Менску.

Якубоўскі Адам Адамавіч – брат Якуба Якубоўскага, ваенны фельчар, біёлаг. Нарадзіўся ў Камаях у 1937 годзе. Закончыў медвучылішча, у 1958–1968 гадах служыў у арміі як ваенфельчар, завочна скончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржазнага ўніверсітэта (1969 г.). У 1970 пакінуў армію, працаваў інжынерам на прадпрыемствах Калінінграда, у 1973–1989 гадах гідролагам, памочнікам капітана на рыбалоўным судне (1982 г.). Быў сябрам калінінградскай суполкі беларусаў, падтрымліваў сувязі з татарамі Беларусі, супрацоўнічаў з рэдактарскай групай часопіса «Байрам». Памёр у 2008 годзе па дарозе ў Віцебск да меньшага брата Браніслава. Пахаваны на мізары ў Смілавічах.

ВЫКАРЫСТАНЫЯ КРЫНІЦЫ

1. Александровіч Разалія. Не стала нашага завяршаючага // Байрам. – 1998. – Вып. 3.

2. Александровіч Разалія. Як святло і як сусвет // Байрам. – 2002. – № 42.

3. Афнагель І. Я. Мой старэйшы сябар – энцыклапедыст Якуб Адамавіч Якубоўскі // Байрам. – 2002. – № 42.

4. Барадулін Рыгор. Беларускія татары // Байрам. – 2002. – № 42.

5. Вайткевіч Вячаслаў. Філасофія энцыклапедычнай справы. Служыць ісціне дзеля ісціны // Наша слова. – 2013. – № 40 (1139).

6. Велічковіч К. В. Відзы // Памяць: Браслаўскі раён, гісторыка-дакументальная хроніка. – Менск, 1998.

7. Widze // Słównik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 13. – Warszawa, 1893.

8. Грыбоўская Ірэна. Успаміны (Камаі, 2008) // Прыватны архіў І. Драўніцкага.

9. Драўніцкі І. П. Ён не даваў заглохнуць ніве жыцця // Нашы карані. – 2005. – № 3.

10. Драўніцкі І. П. Камаі: легенды і гісторыя // Пастаўскі край. – 2000. – № 46.

11. Драўніцкі І. П. Камаі – радзіма Браніслава Руткоўскага // Куфэрак Віленшчыны. – 2004. – № 1 (9).

12. Драўніцкі І. П. Мастакі з дынастыі Ромераў. – Паставы, 2013.

13. Драўніцкі І. П. Татары на Мядзельшчыне // Нарачанская зара. – 1997. – № 5.

14. Жуковіч Васіль. Быў святлом ён гаючым // Байрам. – 2002. – № 42.

15. Каўка Аляксей. Будам жыць! Пра тое самае. – Менск; Масква, 1998.

16. Komaje // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 4. – Warszawa, 1883.

17. Кісялёў. Г. К. // Памяць: Браслаўскі раён, гісторыка-дакументальная хроніка. – Менск, 1998.

18. Крэнь Ірына. Лічаць нас братамі сваімі // Наша слова. – 1997. – № 4.

19. Лыч Леанід. Дзейнасць Якуба Якубоўскага ў люстэрку нацыянальна-культурнага адраджэння татараў Беларусі // Байрам. 1999. – № 1.

20. Лявіцкі Часлаў. Успаміны (Камарова, 2013) // Прыватны архіў І. Драўніцкага.

21. Маліноўскі М. Гусі выратавалі Рым і... узбагацілі Відзы // Культура. – 2005. – 22–28 кастрычніка.

22. Маліноўскі Міхась. «...Праца – гэта ёсць задавальненне» // Байрам. – 2002. – № 42.

23. Пашкоўскі Генрык. Лісты да І. Драўніцкага (Шчэцін – Камарова, 2008) // Прыватны архіў І. Драўніцкага.

24. Пушкін І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці савецкай Беларусі (1919–1990). – Менск, 2010.

25. Русецкі А. У. «Відзы! Відзы!» // Мастацкая культура Віцебскага Паазер'я: ад

старажытнасці да пачатку XX стагоддзя. – Менск, 2005.

26. Сауліч У. Тры замалёўкі з натуры ў Відзах // Віцебскі рабочы. – 1997. – 18 кастрычніка.

27. Татаринов Ю.А. Видзы. Путешествие в Сарью. – Москва, 1999.

28. Цыркуноў Алесь. Ліст да Якубоўскага // Байрам. – 2002. – № 42.

29. Якубоўскі Адам. Сям'я Якубоўскіх на раздарожжы XX стагоддзя // Байрам. – 1998. – Вып. 3.

30. Якубоўская Таццяна. Да 70-годдзя Якуба Адамавіча Якубоўскага // Байрам. – 2002. – № 42.

31. Якубоўскі Якуб. Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі (гімн) // Байрам. – № 42.

32. Якубоўскі Якуб. Я так думаю // Байрам. – 2002. – № 42.

33. Якубоўскі Якуб. Запавет старога татарына // Байрам. – 2002. – № 42.

34. Якушко О. Ф. Моя судьба – географический факультет БГУ. – Минск, 2009.

Навукова-папулярнае выданне

МЫ З ІМАНАМ ЖЫВЁМ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСІ
Беларускі татарын Якуб Якубоўскі

Укладальнікі
Драўніцкі Іван Пятровіч,
Якубоўская Таццяна Васільеўна

Рэдактар
Дзіяна Селях

Мастацкае афармленне
Віталь Катовіч

Тэхнічны рэдактар
Аляксандр Дрыбін

Кампутарнае шыхтаванне
Уладзя Бурымская

Карэктар
Алесь Зьмітровіч

Падпісана да друку 08.06.15. Фармат 60 × 90 1/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 8,75 + 1,50 укл. на крэйд. паперы. Ул.-выд. арк. 10,5. Наклад 300 паас. Замова № 17.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: НВК "Тэхналогія". Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/379 ад 01.07.14.
Вул. Ляўкова, 19, 220007, Мінск. e-mail: technalohija@gmail.com



Драўніцкі Іван Пятровіч
(н. 1932, в. Гвоздавічы) – філолаг, краязнавец, збіральнік гістарычных звестак і паданняў пра Нарачанскі край і яго знакамітых жыхароў. Скончыў Пастаўскае педвучылішча (1952), Менскі педагагічны інстытут (1960). Настаўнік вышэйшай катэгорыі, працаваў выкладчыкам беларускай і нямецкай моваў, дырэктарам школы. Вёў заняткі ў краязнаўчым гуртку «Валошкі», ладзіць экскурсіі па Нацыянальным парку «Нарачанскі». Актыўна публікуецца ў перыядычным друку. Аўтар кніг «Мая Віленшчына», «Мястэчка пры Полацкім тракце» ды інш.



Якубоўская Таццяна Васільеўна
(н. 1940, г. Ельня) – кандыдат геолага-мінералагічных навук. Скончыла геаграфічны факультэт БДУ (1962). Працавала настаўніцай, метэаролагам, рэдактарам-картографам, навуковым рэдактарам у энцыклапедычным выдавецтве. Ад 1972 да 2006 г. была навуковым супрацоўнікам у Інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі, вывучала развіццё флоры і геалагічныя падзеі на тэрыторыі Беларусі (падрабязна на сайце www.neogene.ru). Аўтар некалькіх манаграфій і шматлікіх артыкулаў.

Кніга прысвечана жыццёваму шляху і творчасці беларускага татарына Якуба Якубоўскага – географа, гісторыка, філолага, энцыклапедыста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, актыўнага ўдзельніка адраджэнскага руху беларускіх татараў у 1990-х гадах. У кнізе змешчаны нарысы і ўспаміны родных, сяброў і паплечнікаў, працы навукоўцаў, а таксама нататкі самога Я. А. Якубоўскага.

ISBN 978-985-458-260-3
9 789854 582603

МЫ З ІМАНАМ ЖЫВЁМ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСІ